

## Сляды ад куль на лабавым шкле

СТАР. 3

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

25 ЛІСТАПАДА 2017 г. СУБОТА №228 (28592)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

### Увага: прамая лінія!

**Газета «Звязда» праводзіць прамую лінію па тэме «Як спажыўцу адстаяць свае правы?» Ці можна вярнуць у краму абутак, набыты падчас распродажу? Што рабіць, калі замарожаная рыба аказалася сапсаванай? Ці можна не плаціць за стрыжку, калі яна вам не падабаецца? Куды звяртацца, калі вам прадалі бракаваны тавар?**

Гэтыя і іншыя пытанні можна будзе задаць у наступны чацвер, **30 лістапада, з 11.00 да 12.00** па тэлефоне **287-18-71.** Адказваць на іх будзе **старшыня Беларускага таварыства абароны спажыўцоў Ганна Уладзіміраўна СУША.**

Папярэдне пытанні можна задаць па тэлефоне 287-17-50 ці даслаць на электронны адрас lubneuskaya@zviazda.by з пазнакай «прамая лінія».

### *ЦЫТАТА ДНЯ*



**Валерыя КЛІЦУНОВА, старшыня праўлення Беларускага грамадскага аб'яднання «Адпачынак у вёсцы»:**

*«Наш сельскі турызм вельмі змястоўны. А спачатку ж мы хацелі зрабіць проста сетку міні-гасцініц з ежай. Пасля сталі ўзнікаць пытанні: а чаму людзі павінны туды ехаць, чым займацца ў беларускай вёсцы? Таму трэба было падумаць пра турыстычны прадукт, пра ўзаемадзеянне, кластары, зялёныя маршруты, каб развіваць разам нейкую пэўную тэрыторыю. І тое, што гэта ўдалося зразумець і пайшоў адпаведны працэс, лічу каласальным плюсам. Да таго ж апошнім часам мы прасоўваем ідэю крэатыўнай эканомікі: калі ты робіш нешта за кошт сваіх ведаў, таленту і ўменняў. Гэта значыць, прыдумваеш тое, што здольна ўразіць турыста. І людзі едуць па ўражанні, што робіць нас канкурэнтаздольнымі на рынку».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 25.11.2017 г.

| | |
|---|---|
| Долар ЗША | 1,9980 ▲ |
| Еўра | 2,3676 ▲ |
| Рас. руб. | 0,0341 ■ |
| Укр. грыўня | 0,0743 ■ |

ISSN 1990 - 763X

# Ключы ад дома

У ваенным гарадку Заслонава Лепельскага раёна ва ўрачыстай абстаноўцы здалі ў эксплуатацыю пасля капітальнага рамонту дом на 70 кватэр. На здымку: ключы ад новай кватэры — у руках камандзіра ўзвода Яўгена ТОЗУРА, яго жонкі Сняжаны і дачкі Аляксандры.



Фота БЕЛТА.

■ Безбілетнікі

## Кантралёр — у дзверы, «заяц» — у вакно

### Лаюцца, уцякаюць, падманваюць. Разумеюць, плацяць, выбачаюцца

**«Няма грошай — толькі картка», «не паспеў купіць талончык», «толькі ўвайшоў». Якіх толькі адгаворак не прыдумваюць пасажыры, калі іх «зловіць» кантралёр. І іншаземцамі прыкідваюцца, і за сэрца хапаюцца, просяць хуткую дапамогу выклікаць. І ўцякаюць з транспарту, забываючыся ў салоне пакеты, парасоны і... аднойчы пакінулі нават дзіця. Чаму пасажыры так баяцца кантралёраў і ці варта так да іх ставіцца, высвятлялі карэспандэнты «Звязды»...**



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Кантралёр Тамара ВІШНЯКОВА: «Зайцы» паводзяць сябе па-рознаму».

### ПА ЗАКОНАХ ЧАЛАВЕЧЫХ І ПІСАНЫХ

З **Тамарай ВІШНЯКОВАЙ і Раісай ЖУЧКО, кантралёрамі пасажырскага транспарту,** мы выехалі па маршруце Кунцаўшчына — Гарадскі Вал. Камеру яны ўключаюць яшчэ пры пад'ездзе транспарту да прыпынку і выключаюць толькі пасля выхаду на прыпынку. Так можна пасля даказаць, хто ўвайшоў разам з кантралёрамі, а хто маніць.

СТАР. 4

■ Галоўнае ў жыцці

## КАХАННЕ — ГЭТА ВАМ НЕ БУЛЬБА!

### Сямейныя пары з Глыбокага ў новым праекце расказваюць свае гісторыі

**У Глыбоцкім раёне ўжо паўгода доўжыцца сямейны праект «Заўтра было каханне». Арганізаваў і праводзіць яго народны сямейны клуб «Востраў разумення» гарадскога цэнтра традыцыйнай культуры і народнай творчасці.**

Нагадаем, гэта менавіта яго ўдзельнікі дзесяць гадоў таму прыдумалі і ўвасобілі ў жыццё адмысловы маладзёжны праект «Уладар вёскі», які неўзабаве выйшаў на рэспубліканскі ўзровень, і з таго часу праводзіцца ў краіне штогод. Гэта мы да таго, што арганізатарам чарговага конкурсу досведу ў такой справе не займаць і, хто ведае, можа быць, з цягам часу ён таксама стане папулярным не толькі ў асобна ўзятым раёне.

СТАР. 8



Фота Алены МЯНЖЫНСКАЙ.

Пераможцы першага этапу — сям'я КАРПОВІЧАЎ.

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

ПАДПІШЫСЯ — І ВЫЙГРАЙ КАШТОЎНЫЯ ПРЫЗЫ!

Пачалася падпіска на «Звязду» на I квартал і I паўгоддзе 2018 года!

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

# Як жывуць малыя гарады?

## Кіраўнік дзяржавы з рабочай паездкай наведаў раённы цэнтр Гомельскай вобласці

**Сёлета гэта ўжо далёка не першы візіт кіраўніцтва краіны на Гомельшчыну. Так, вясной Аляксандр Лукашэнка пабываў у Рэчыцы і Рэчыцкім раёне, потым разам з Пятром Парашэнкам, украінскім калегам, пабываў у Лясkавічах, у пачатку лета была паездка ў Хойніцкі раён... А ўчора Прэзідэнт нашай краіны пабываў у Буда-Кашалёве. Гэта невялікі горад з насельніцтвам каля дзесяці тысяч чалавек, тым не менш і ў такім населеным пункце кіраўніку краіны было што паглядзець.**

### Без адставанняў

Яшчэ з верталёта Аляксандр Лукашэнка звярнуў пільную ўвагу на тое, наколькі чысты, зручны для жыцця гарадок. Навядзенне парадку на зямлі — ключавое патрабаванне Прэзідэнта да мясцовых улад, адказных за любы населены пункт — ад двухмільённага Мінска да самай маленькай вёсачкі. Буда-Кашалёвам кіраўнік краіны застаўся задаволены.

Паездка атрымалася вельмі насычанай і ў асноўным была прысвечана сацыяльнай палітыцы дзяржавы. Беларускі лідар прыехаў паглядзець, як наладжана жыццё малога горада. У першую чаргу ён наведаў Буда-Кашалёўскі цэнтральны раённы Дом культуры.

Безумоўна, не абышлося без даклада аб эканамічнай сітуацыі ў рэгіёне — гэта абавязковы складнік літаральна любой рабочай паездкі Прэзідэнта.

Гомельшчына справілася з заданнем па валавым рэгіянальным прадукце. Назіраецца рост і ў сельскай гаспадарцы (адпаведныя паказчык склаў 106,3%), і ў прамысловасці (105,2%), і ў сферы транспарту і сувязі (104%). Рост паказалі таксама і аптовы гандаль вобласці, будаўніцтва... Што да задання, даведзенага на гэты год — вывесці заработную плату па рэспубліцы на ўзровень 1000 рублёў, — то ў Гомельскай вобласці імкнуцца да выканання гэтай задачы.

### Рамёствы трэба адраджаць

У Доме культуры кіраўніку дзяржавы прадэманстравалі творчы патэнцыял раёна. Тут многае робіцца для таго, каб рамёствы, якімі калісьці валодалі нашы продкі, не забыліся. У гуртках і дзеці, і дарослыя маюць магчымасць не толькі навучыцца, напрыклад, ткаць або плесці з саломы, лазы, але і знайсці практычнае прымяненне атрыманым навыкам. Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў: тое, што робіцца ў падобных гуртках пры дамах культуры, вельмі важна. Таму людзям, якія захавалі гэты вопыт, майстэрства, патрэбна стварыць годныя ўмовы для працы.

— Трэба ўсё гэта адраджаць. І адраджаць трэба адсюль. Ад Мінска мы нічога не адродзім, — заявіў Прэзідэнт.

Кіраўнік дзяржавы пагутарыў з дзецьмі, якія пераймаюць народнае майстэрства. Убачыўшы прыгожую калыску для немаўляці, ён звярнуўся да дэмаграфічнай тэмы:

— Нам трэба падтрымліваць тых, хто нараджае трах і болей дзяцей, — заявіў Прэзідэнт. — Адно дзіця самі павінны выхоўваць. Другое — трошкі недзе дапамагчы. А вось калі трэцяе, чацвёртае і, дай бог, пятае — тут павінна быць усялякая падтрымка.

Цёплая сустрэча з народнымі майстрамі завяршылася ў актавай зале Дома культуры, дзе для кіраўніка дзяржавы зладзілі невялікі канцэрт артысты Буда-Кашалёва.

### Незапланаваная сустрэча

Пакуль ладзіўся канцэрт, да будынка сыходзіліся мясцовыя жыхары — яны ведалі, што ў іх горад прыехаў кіраўнік дзяржавы. Падчас размовы з імі Аляксандр Лукашэнка пацікавіўся, якія праблемы іх хвалююць. Жыхары падзяліліся сваёй прапановай зрабіць святлафор на чыгуначным пераездзе ў Буда-Кашалёве. Чыгункай горад раздзелены на дзве часткі, і ўзнікаюць праблемы з тым, каб праехаць або прайсці з аднаго яго канца ў другі. Пабудаваны пешаходны мост, але не ўсе могуць ім скарыстацца — напрыклад, гэта вельмі цяжка пажылым людзям. А калі б перад чыгуначным пераездам стаяў святлафор і паказваў людзям, калі можна спакойна прайсці, — праблема б вырашылася.

### Аптымізацыя на карысць

Далей Аляксандр Лукашэнка наведаў Буда-Кашалёўскую цэнтральную раённую бальніцу. Ён пацікавіўся сістэмай медыцынскага абслугоўвання.

— Што мне кідаецца ў вочы: ці не занадта ў нас грувасткая сістэма аховы здароўя ў Буда-Кашалёве? — звярнуў увагу Прэзідэнт.

Яму паведамілі, што пытанне аптымізацыі з парадку дня не здымаецца.

— Ці патрэбна столькі ўчастковых бальніц? Даступнасць — так, але майце на ўвазе: з-за даступнасці мы можам згубіць грошы на фінансаванне найважнейшых прадпрыемстваў у самой сістэме аховы здароўя. Мы згубім на лячэнні. Мы будзем фінансаваць бальніцы, без якіх можна абысціся, а зарплаты не зможам павысіць урачам. Бо галоўнае ж — лячыць, — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

У той жа час ён выказаў упэўненасць: разам з развіццём высокатэхналагічнай медыцыны мы не павінны забываць і пра першасны ўзровень медыцынскіх паслуг.

Падчас паездкі ў Буда-Кашалёва Прэзідэнт пабываў і ў гасцях — у адным сямейным доме сямейнага тыпу. У сям'і Вікторыі і Аляксея Новікавых выхоўваецца, акрамя траіх біялагічных дзяцей, сямёра прыёмных. Аляксандр Лукашэнка прыйшоў, што называецца, не з пустымі рукамі, падарыў дзіцячаму дому міні-трактар «Беларус-132Н» вытворчасці Смаргонскага завода МТЗ, аўтамабільны прычэп «Беларус», універсальны плуг і ўніверсальны акучнік.

* * *

Знайшоў час беларускі лідар і для таго, каб адказаць на пытанні журналістаў.

### ...Пра саміт «Усходняга партнёрства»

Кіраўніка дзяржавы запрасілі наведаць мерапрыемства, якое якраз учора праходзіла ў Брусэлі. Як ужо пісала «Звязда», беларускую дэлегацыю ўзначаліў міністр замежных спраў Уладзімір Макей. Адказваючы на пытанне, чаму Прэзідэнт не паехаў у Брусель, Аляксандр Лукашэнка заявіў: ніякай канспіралогіі тут няма. Справа ў тым, што графік замежных візітаў кіраўніка дзяржавы складаецца прыкладна на год наперад:

— Яны ўвязваюцца з унутранымі мерапрыемствамі. Калі мы планавалі, мы ведалі, што гэта мерапрыемства адбудзецца прыкладна напрыканцы лістапада, у гэты дзень тады не было ніякіх запрашэнняў. Таму мы запланавалі туды візіт міністра замежных спраў — за паўгода, а можа, і раней.

— Безумоўна, я мог адхіліцца ад гэтага графіка. Але міністр замежных спраў цалкам справіцца з гэтай работай, чаму я не павінен яму давяраць?

Прэзідэнт пацвердзіў зацікаўленасць дзяржавы і надалей развіваць адносіны з Еўропай. На яго думку, гэта ўвогуле непазбежна, бо Беларусь — сэрца Еўропы.

### ...Пра адмену смяротнага пакарання

— У нас на рэферэндуме вырашана гэта пытанне, і я паважаю свой народ, я не магу самастойна адмяніць рашэнне, якое прыняў народ. Калі мы захочам гэта зрабіць, нам трэба вынесці гэта пытанне на рэферэндум. Калі мы сёння вынесем пытанне аб смяротным пакаранні на рэферэндум, не трэба вам расказваць, — ведаеце, які будзе рэзультат, — пракаментаваў кіраўнік дзяржавы.

Зноў жа, Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на той факт, што Еўрапейскі саюз сябруе са Злучанымі Штатамі, іншымі краінамі, дзе прымяняецца смяротнае пакаранне, і пры гэтым не ставіць для іх ніякіх папярэдніх умоў.

— Я думаю, і ў гэтым пытанні мы дамовімся, — упэўнены кіраўнік дзяржавы. — Сёння Беларусь як ціхая, спакойная і годная краіна, спонсар бяспекі на еўрапейскім кантыненце запатрабавана ў самой Еўропе. Мы гэта чуем, мы гэта бачым, мы гэта цэнім і мы заўсёды будзем ісці насустрач інтарэсам еўрапейскіх дзяржаў.

Галоўнае, дадаў беларускі лідар, каб перад намі не ставілі ўмову: ці вы з Расіяй, ці вы з Еўропай. У Расіі, падкрэсліў ён, жывуць нашы браты.

### ...Пра ўкраінскага шпіёна

Выказаўся Прэзідэнт і наконт нядаўняй рэзанананснай справы Паўла Шаройкі, кадравага супрацоўніка галоўнага ўпраўлення разведкі Міністэрства абароны Украіны. Аляксандр Лукашэнка расказаў, што гэта шпіёнская справа абмяркоўвалася падчас нядаўняй яго сустрэчы ў Аб'яднаных Арабскіх Эміратах з украінскім Прэзідэнтам Пятром Парашэнкам. Тады была дасягнута дамоўленасць не даводзіць справу да агульнага ведама. Але, на жаль, украінскія СМІ атрымалі гэтую інфармацыю, у выніку і наш Камітэт дзяржаўнай бяспекі правёў брыфінг для журналістаў, каб растлумачыць асаблівасці гэтай справы і давесці людзям, што мы не нагнятаем абстаноўку ў адносінах з Украінай.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** *yushkevich@zviazda.by*

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### У Егіпце абвясцілі трохдзённую жалобу ў сувязі з гібеллю людзей у мячэці

Пра гэта паведаміла дзяржаўнае егіпецкае тэлебачанне. Колькасць пацярпелых пры выбуху перавысіла 350 чалавек, перадаюць СМІ. Адзначаецца, што пра жалобу абвясціла прэзідэнцкая адміністрацыя. Раней паведамлялася, што тэрарысты падчас пятнічнай малітвы ўварваліся ў мячэць у раёне Эр-Роўда на захад ад горада Эль-Арыш на поўначы Сінайскага паўвострава, прывялі ў дзеянне выбуховую прыладу, а пасля сталі расстрэльваць людзей, якія выбягалі з мячэці. Ёсць інфармацыя, што тэрарысты абстрэльвалі нават машыны хуткай дапамогі, якія спрабавалі вывозіць параненых з месца выбуху.

### У Фінляндыі пачнуцца буйныя вайсковыя вучэнні



Буйныя вайсковыя вучэнні з удзелам 10 тысяч вайскоўцаў, а таксама знішчальнікаў, марскіх суднаў і іншай тэхнікі стартуюць у сталічным рэгіёне Фінляндыі ў панядзелак, 27 лістапада, гаворыцца ў паведамленні Сіл абароны краіны. «Вучэнні з'яўляюцца неад'емнай часткай трэніроўкі войскаў і дэманстрацыі нашых магчымасцяў абароны», — прыводзяцца словы камандуючага арміяй Фінляндыі Петры Халка. Удакладняецца, што ў вучэннях будуць задзейнічаны танкі Leopard 2A6, колавыя баявыя машыны пяхоты ХА203, гусенічныя баявыя машыны пяхоты CV9030, марскія мінёры, караблі падтрымкі, войскі берагавой абароны, войскі спецыяльнага прызначэння. Таксама адзначаецца, што ў вучэннях будуць задзейнічаныя знішчальнікі Hornet і рэактыўныя вучэбна-трэніровачныя самалёты Hawk. Ведамства ўдакладняе, што вучэнні працягнуцца да 4 снежня.

### ЕС можа адправіць Турцыю ў «чорны спіс» краін-афшораў

Да канца гэтага года Еўрасаюз можа адправіць Турцыю ў «чорны спіс» афшораў, піша Bloomberg. Спецыяльная рабочая група Еўрасаюза можа рэкамендаваць дадзеную меру міністрам фінансаў краін ЕС. Як адзначае агенцтва, у Еўрасаюзе перакананыя, што Анкара не прадпрыме ўсе магчымыя меры для забеспячэння празрыстасці ў сферы падаткаабкладання. Усяго рабочая група ЕС мае намер разглядзець на прадмет адпаведнасці падатковым нормам больш за 90 юрысдыкцый. Таксама ў спіс краін-афшораў могуць быць уключаны 36 краін.

## ■ Парламенцкі дзённік

# ПАДЗЯКА НА РАЗВІТАННЕ

### Пасол Казахстана заканчвае дыпмісію ў нашай краіне

**Шэсць гадоў Ергалі БУЛЕГЕНАЎ быў Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Казахстана ў Беларусі. За гады яго работы нашы краіны сталі бліжэй адна да адной і ў эканамічным, і ў палітычным, і ў культурным планах. З нагоды завяршэння дыпламатычнай місіі сустрэчу з паслом правёў Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА, старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі.**

Спікер звярнуў увагу на шматбаковасць беларуска-казахстанскага супрацоўніцтва, адным з дасягненняў якога з'яўляецца стварэнне Еўразійскага эканамічнага саюза. У яго межах зараз супрацоўнічаюць нашы краіны. Таксама ў гады работы Ергалі Булегенава быў падпісаны дакумент аб супрацоўніцтве паміж парламентамі Беларусі і Казахстана. Нашы дзяржавы неадноўчы падтрымлівалі пазіцыю адно аднаго ў межах міжнародных арганізацый. Так было і на сесіі ПА АБСЕ, якая адбылася сёлета ў Мінску. Уладзімір Андрэйчанка адзначыў і важнасць нарошчвання эканамічных кантактаў Беларусі і Казахстана: за дзевяць месяцаў бягучага года краіны здолелі выйсці на тавараабарот каля $500 млн.

У сваю чаргу Ергалі Булегенаў падзякаваў за высокую ацэнку яго дыпламатычнай работы. Ён выказаў упэўненасць, што ўзаемны тавараабарот Беларусі і Казахстана будзе расці і надалей. «Мы ўжо дасягалі амаль мільярднага тавараабароту ў 2014 годзе, і я, думаю, на наступны год рэальна, што такімі тэмпамі мы падыдзем да мільярда», — сказаў пасол.

**Вераніка ПУСТАВІТ.** *pustavit@zviazda.by* ■

## ■ Прыёмная кампанія — 2018

# ЦТ — экзамен з высокімі стаўкамі!

**Ніжні парог вынікаў цэнтралізаванага тэсціравання па першым профільным прадмеце прапануецца ў наступным годзе павялічыць на пяць балаў, а тэрміны рэгістрацыі для ўдзелу ў цэнтралізаваным тэсціраванні скараціць: пункты рэгістрацыі адкрыюцца для абітурыентаў толькі 10 мая. На калегіі Міністэрства адукацыі прааналізавалі вынікі прыёмнай кампаніі 2017 года і паставілі задачы на наступны год.**

**Першы намеснік міністра адукацыі Вадзім БОГУШ** лічыць, што павышэнне парога па профільным прадмеце павысіць значнасць гэтай дысцыпліны і дазволіць адабраць найбольш падрыхтаваных абітурыентаў. «Паэтапнае павышэнне парогавых значэнняў па выніках ЦТ працягнецца і ў наступныя гады, — паведаміў ён. — Гэты працэс будзе праходзіць паралельна з укараненнем і апрабацыяй новых методык па апрацоўцы і шкаліраванні вынікаў удзельнікаў ЦТ.

Для ўдасканалення правядзення ўступнай кампаніі Міністэрства адукацыі падрыхтавала праект указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь аб змяненнях і дапаўненнях у Правілы прыёму асоб для атрымання сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай адукацыі І ступені. Дакумент рыхтаваўся на падставе даручэнняў кіраўніка дзяржавы і прапаноў дзяржаўнай камісіі, абмяркоўваўся і ўзгадняўся з зацікаўленымі дзяржаўнымі органамі, Рэспубліканскім саветам рэктараў вышэйшых навучальных устаноў.

Сярод плануемых новаўвядзенняў — аптымізацыя льготных катэгорый грамадзян пры паступленні ва ўстановы вышэйшай адукацыі; увядзенне мінімальнага стажу для абітурыентаў, якія плануюць паступаць на завочную форму навучання; ажыццяўленне мэтавай падрыхтоўкі спецыялістаў незалежна ад месца знаходжання арганізацый пры падрыхтоўцы па найбольш запатрабаваных эканомікай спецыяльнасцях. У праект указа ўведзена норма, якая дасць магчымасць выкарыстоўваць гутарку ва ўстановах сярэдняй спецыяльнай адукацыі як дадатковы метад упарадкавання льготных катэгорый грамадзян.

Таксама будуць праходзіць апрабацыю наступныя механізмы — правядзенне прафесійна-псіхалагічнай гутаркі пры прыёме на спецыяльнасці, дзе патрабуюцца кіраўніцкія навыкі. Мяркуецца, што гутарка будзе праходзіць да пачатку ўступнай кампаніі. Першы намеснік міністра адукацыі расказаў, што ў ВНУ можа з'явіцца права праводзіць дадатковы профільны экзамен пры паступленні на спецыяльнасці, дзе патрабуецца наяўнасць практычных навыкаў. Гэтая норма будзе выкарыстоўвацца ў эксперыментальным рэжыме. «Літаральна на адной-двух спецыяльнасцях у некалькіх установах адукацыі, каб можна было дакладна адпрацаваць увесь механізм, усе станоўчыя і адмоўныя бакі новаўвядзення», — растлумачыў Вадзім Богуш.

Ёсць пытанні, звязаныя з правядзеннем практычнай апрабацыі новых методык апрацоўкі вынікаў ЦТ.

— Тая мадэль шкаліравання вынікаў ЦТ, якая ў нас цяпер выкарыстоўваецца, даказала сваю эфектыўнасць, — падкрэсліла **першы намеснік дырэктара Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў Наталля ВАЙЦЯХОВІЧ.** — Трэба звярнуць увагу, што тая ці іншая мадэль шкаліравання выкарыстоўваецца ў залежнасці ад мэт і задач выпрабаванняў. Адна мадэль — для прамежкавай атэстацыі, другая — для выніковай. І зусім іншая мадэль павінна выкарыстоўвацца ў рамках уступных выпрабаванняў. Разам з тым, у сувязі з неабходнасцю разглядзець магчымасць укаранення новай методыкі, Рэспубліканскі інстытут кантролю ведаў прапанаваў свой варыянт, прадставіў матэматычныя алгарытмы разлікаў, а таксама паказаў як на станоўчыя бакі новай сістэмы падліку балаў, так і на магчымыя рызыкі. Мы ўсе павінны разумець, што ЦТ — экзамен з высокімі стаўкамі, і ў выпадку пераходу да новай сістэмы патрабуецца час. Немалаважана таксама, каб шкаліраванне вынікаў рэпетыцыйнага і цэнтралізаванага тэсціравання ажыццяўлялася па адной метадыцы.

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by* ■

**ООО «Правовая компания «Антикризисный консалтинг АСС ВУ» проводит открытые торги в форме аукциона по продаже имущества ООО «ВАЗСЕРВИС-С», находящегося в процедуре ликвидации**

**Продавец:** Общество с ограниченной ответственностью «ВАЗСЕРВИС-С». Минская обл., Минский р-н, Щомыслицкий с/с, аг. Щомыслица, д. 16, ком. 19/6, р/с BY12PJCB30120073611000000933 в ОАО «Приорбанк» ЦБУ №100, код банка PJCBBY2X г. Минск, **УНП** 101094935.
**Организатор торгов:** ООО «Правовая компания «Антикризисный консалтинг АСС ВУ», для получения более подробной информации о торгах ООО «ВАЗСЕРВИС-С» Вы можете обратиться по тел. 8 (017) 204 50 03, а также найти интересующую Вас информацию на сайте **www.acc.by**

| № лота | 1 |
|---|---|
| **Описание объекта** | Автомобиль легковой минивэн – Volkswagen Sharan. Год выпуска – 2008 |
| **Начальная цена, бел. руб., без НДС** | 10 700,00 |
| **Ставка НДС, %** | 20 |
| **Сумма НДС, бел. руб.** | 2 140,00 |
| **Начальная цена с НДС, бел. руб.** | 12 840,00 |
| **Размер задатка, бел. руб.** | 1 284,00 |
| **Шаг торгов, бел. руб.** | 642,00 |

Торги проводятся в соответствии с постановлением Советом Министров от 8 января 2013 г. №16 «О некоторых вопросах продажи имущества ликвидируемого юридического лица».

Место нахождения предмета торгов (Автомобиль легковой минивэн – Volkswagen Sharan. Год выпуска – 2008) – г. Минск, ул. Скрыганова 6/2.

Для участия в аукционе необходимо внести сумму задатка на реквизиты ООО «ВАЗСЕРВИС-С»: Минская обл., Минский р-н, Щомыслицкий с/с, аг. Щомыслица, д.16, ком. 19/6, р/с BY12PJCB30120073611000000933 в ОАО «Приорбанк» ЦБУ №100, код банка PJCBBY2X г. Минск, (**УНП** 101094935) и направить в адрес организатора торгов (220079, г. Минск, а/я 267, roman.korolev@bk.ru) заявление на участие в торгах с приложением документов, подтверждающих уплату суммы задатка.

Результаты торгов оформляются протоколом о результатах торгов.

С участником, победившим по результатам торгов, в течение 3 рабочих дней заключается основной (предварительный) договор купли-продажи.

Срок оплаты приобретенного предмета торгов устанавливается в договоре купли-продажи, заключаемом по результатам торгов в течение 3 рабочих дней.

В случае если заявление на участие в торгах подано только одним участником, или для участия в торгах явился только один участник, или для участия в торгах не было подано ни одного заявления, или ни один из участников не явился, торги признаются несостоявшимися и комиссия оформляет протокол о признании торгов несостоявшимися.

В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, при согласии этого участника приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 процентов, комиссия в день проведения аукциона оформляет протокол о продаже предмета торгов этому участнику аукциона (далее – единственный участник аукциона).

Торги состоятся **27.12.2017 в 12.00** по адресу: г. Минск, ул. Скрыганова, д. 6, к. 3, офис 2304.

Заявления на участие в торгах со всеми необходимыми документами, указанными в п. 12 постановления Совета Министров от 8 января 2013 г. № 16 «О некоторых вопросах продажи имущества ликвидируемого юридического лица» принимаются с момента публикации указанного объявления до **18.00 22.12.2017**.


# ЖЫЦЬ У МІРЫ

## У сталіцы праходзяць трэція Беларускія калядныя чытанні



Фота БЕЛТА.

**Падчас іх былі падпісаны дагаворы аб супрацоўніцтве паміж Беларускай праваслаўнай царквой і Міністэрствам культуры, Міністэрствам працы і сацыяльнай абароны, Дзяржаўным камітэтам па навуцы і тэхналогіях, Нацыянальнай акадэміяй навук.**

**Мітрапаліт Мінскі і Заслаўскі Павел, Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі,** адзначыў:

— Падпісаныя пагадненні — гэта сімвал жадання працаваць разам, ствараць наша жыццё. Зусім невыпадкова Беларусь з'яўляецца прыкладам для пераймання для многіх краін. У нас жывуць людзі самых розных веравызнанняў, кожны мае свой погляд на жыццё, але ўсе мы жывём у міры і згодзе. Наша спакойнае існаванне з'яўляецца яскравым пацвярджэннем нашых унутраных імкненняў — жыць у міры з самім сабой, з Богам, з усімі людзьмі, побач з якімі Гасподзь вызначыў наша жыццё.

Сваё прывітальнае слова да ўдзельнікаў трэціх Беларускіх калядных чытанняў накіраваў і **міністр інфармацыі Беларусі Аляксандр КАРЛЮКЕВІЧ.** У сваю чаргу першы **намеснік міністра культуры Ірына ДРЫГА** расказала:

— Гэта пагадненне з'яўляецца працягам даўніх і доўгіх адносін Міністэрства культуры з беларускай праваслаўнай царквой. Тыя праграмы, якія падпісаны паміж намі, не засталіся толькі на паперы, але прыносілі добрыя плады. Напрыклад, узводзяцца культавыя пабудовы, робяцца роспісы, вырабляюцца мазаікі... Гэта і штодзённая праца бібліятэк, гарадскіх і раённых, тая работа, якую яны здзяйсняюць. У нашых музеях праводзяцца выстаўкі іканапісу, дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва пачынаючы са старажытнасці і да нашага часу.

Цікавым з'яўляецца і падпісанне пагаднення аб супрацоўніцтве Беларускай праваслаўнай царквы з Дзяржаўным камітэтам па навуцы і тэхналогіях. Як растлумачыў **намеснік старшыні гэтай установы Сяргей ШЧАРБАКОЎ,** раней паміж камітэтам і царквой падобныя дагаворы не заключаліся. Больш за тое, доўгі час лічылася, што падстаў для развіцця супрацоўніцтва паміж навукоўцамі і вернікамі няма.

«Мы зараз пакуль на пачатку шляху. Намі плануецца правядзенне сумесных мерапрыемстваў, у тым ліку канферэнцый, семінараў, абмен інфармацыяй, — расказаў Сяргей Шчарбакоў. — Сутнасць у двух сакраментальных пытаннях: першае — аднаўленне дыскусіі аб трыадзінстве ведаў, веры і светапогляду, другое — пытанне маральна-этычных нормаў і крытэрыяў».

Паводле спецыяліста, абедзве гэтыя тэмы важныя і для царквы, і для навукі. «Традыцыйна лічыцца, што рэлігія — гэта пра веру. Нехта нават скажа, пра безумоўную веру. Але калі мы на самай справе звернемся да рэлігійных тэкстаў і дыскусій, то ўбачым, што там ёсць і вялікая прастора для ведаў. Самае простае — веданне святых тэкстаў і іх аналіз».

На трэціх Беларускіх калядных чытаннях прысутнічаў таксама Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Малдовы ў Беларусі Віктар Сарачан і іншыя высокапастаўленыя асобы.

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.** *nina@zviazda.by*


**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА**
**Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» сообщает о проведении торгов в виде открытого аукциона по продаже недвижимого имущества, принадлежащего ОАО «Агросервис»**

Лот №1. **Капитальное строение с инв. №700/С-50203,** расположенное по адресу: г. Могилев, ул. Академика Павлова, 7/4. **Составные части и принадлежности: одноэтажное металлическое здание склада кислородных баллонов площадью 18,8 кв. м с промышленной площадкой для хранения автомобилей площадью 2560,2 кв. м, забором кирпичным длиной 32,4 м)**

Сведения о земельном участке: земельный участок с кадастровым номером 740100000007005825 (право постоянного пользования), площадью – 0,3441 га, назначение: земельный участок для содержания и обслуживания здания склада кислородных баллонов и сооружений, расположен по адресу: г. Могилев, ул. Академика Павлова, 7/4.

***Начальная цена продажи: 41 776,00 белорусских руб. с учетом НДС; сумма задатка – 4 177,60 бел. рублей***

| | |
|---|---|
| Продавец | ОАО «Агросервис», УНП 700010487, г. Могилев, ш. Славгородское, 44а |
| Расчетный счет для перечисления задатка | Получатель платежа РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182, IBAN BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, МФО BIC банка BPSBBY2X |
| Дата, время и место проведения аукциона | **Аукцион проводится 26 декабря 2017 года в 12.00** по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352, офис Могилевского филиала РУП «Институт недвижимости и оценки». Последний день подачи заявок и внесения задатка: 22 декабря 2017 года до 15.00 |
| Срок и условия оплаты приобретенного с аукциона имущества | Победитель аукциона обязан в течение 1 (одного) рабочего дня со дня подписания протокола аукциона подписать договор купли-продажи. Оплата производится на условиях заключенного договора купли-продажи |

Для участия в аукционе приглашаются граждане, юр. лица и индивидуальные предприниматели Республики Беларусь, иностранные инвесторы, подавшие заявление на участие в аукционе (по форме, установленной Организатором аукциона); предоставившие заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка, заявление об ознакомлении с документами, продаваемым Объектом (по форме, установленной Организатором аукциона) и заключившие с Организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (по форме, установленной Организатором аукциона), а также прилагаются следующие документы: юридические лица Республики Беларусь – копию свидетельства о гос. регистрации, копии учредительных документов, копию документа, подтверждающего постановку на учет в налоговом органе; индивидуальные предприниматели Республики Беларусь – копию свидетельства о гос. регистрации и документа, подтверждающего постановку на учет в налоговом органе; физ. лица – паспорт, представители физ. лиц и индивидуальных предпринимателей – паспорт и доверенность, удостоверенную нотариально; иностранные юридические лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; иностранные индивидуальные предприниматели – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; представители иностранного юридического лица, иностранного физического лица или индивидуального предпринимателя – доверенность, легализованную в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык.

Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену. Условие – наличие не менее 2 участников. Единственный участник имеет право приобрести объект по начальной цене, увеличенной на 5%.

Участник, выигравший торги, возмещает затраты на организацию и проведение аукциона, в соответствии со счет-фактурой, которые подлежат уплате в течение 3 рабочих дней после проведения аукциона.

**Дополнительную информацию можно получить по тел.: (8 0222) 72-41-14, 8 029 624-26-25, 8 044 738-18-99**


## ■ Падрабязнасці

# Сляды ад куль на лабавым шкле

## ...службовага аўто супрацоўнікаў Дэпартамента аховы з Ленінскага аддзела Магілёва засталіся пасля перастрэлкі са злачынцам

**«Звязда» працягвае знаёміць чытачоў з дэталямі гучнай справы вакол рабавання банка ў Магілёве з захопам заложнікаў, якое адбылося ў панядзелак. Гэта падзея і зараз абмяркоўваецца ў інтэрнэце. Мужныя паводзіны супрацоўнікаў магілёўскай міліцыі былі высока ацэнены Прэзідэнтам краіны Аляксандрам Лукашэнкам. Ён назваў аперацыю па абясшкоджванні злачынцы адной з лепшых у гісторыі беларускай міліцыі. Першымі, хто за лічаныя секунды прыбыў на месца здарэння і стварыў умовы для бяспекі людзей, былі менавіта байцы Ленінскага аддзела Дэпартамента аховы. Наколькі моцна яны рызыкавалі, можна меркаваць па іх прабітай кулямі машыне.**



Фота БЕЛТА.

Калі паступіла паведамленне ад дзяжурнага, што спрацавала трывожная кнопка аддзялення Беларусбанка на Каліноўскага, 31, **міліцыянеры групы затрымання прапаршчык міліцыі Анатоль МЕЛЬНІКАЎ і сяржант міліцыі Кірыл МАРКАЎ** якраз былі непадалёк — на вуліцы Прафсаюзнай. Абаім па 25 гадоў, працуюць у аддзеле каля чатырох гадоў. Кажуць, што рызыкаваць даводзіцца часта, але ўзброеных злачынцаў да гэтага бачылі толькі ў кіно.

— Тое, што гэта ўзброенае рабаванне, нават не ведалі, думалі ўсё як звычайна: спрацавала трывожная кнопка, і проста трэба праверыць, — расказваюць яны. — На выклік заўсёды выязджаем у поўнай экіпіроўцы: бронекамізэлька, шлем ахоўны, сродкі актыўнай абароны. Пад'ехалі, насустрач выбегла жанчына і паведаміла, што ў будынку ўзброены чалавек, што ў яго пісталет. Мы блакіравалі паркоўку і пабеглі ў будынак. Яшчэ ў тамбуры ўбачылі за шклом наступных дзвярэй хударлявага чалавека ў масцы і людзей, якія ляжалі на падлозе. Злачынца накіраваў на нас нешта падобнае да пісталета і закрычаў, каб мы кінулі зброю, іначай пачне страляць. Было бачна, што ён не чакаў нас так хутка. Калі б ён сапраўды пачаў страляць, нам бы таксама прыйшлося адкрыць агонь. І невядома тады, як бы развіваліся падзеі. Кулі рыкашэтам маглі б трапіць у любога з заложнікаў. На шчасце, гэтага не адбылося. Скарыстаўшыся збянтэжанасцю зламысніка, выскачылі на вуліцу і заблакіравалі выхады з будынка злева і справа. І адразу ж выклікалі дапамогу.

Да таго як прыбылі астатнія, да міліцыянераў некалькі разоў выходзіла **супрацоўніца банка, кіраўнік аддзялення Алена БУРСАВА,** праз якую захопнік перадаваў патрабаванні — даць яму машыну, каб уцячы, скласці ў багажнік усю зброю. Тады, маўляў, ніхто не пацерпіць.

— Жанчына вельмі мужная, — захапляецца паводзінамі супрацоўніцы банка Анатоль. — Ёй прапаноўвалі не вяртацца назад, але яна была катэгарычна супраць: там жа мае дзяўчаты. Злачынца потым выпусціў жанчыну-заложніцу, якой стала дрэнна з сэрцам. Яна была ў паніцы, плакала, здавалася, страціць прытомнасць. Ад дзвярэй банка да медыкаў мы з камандзірам батальёна яе неслі на руках. Да гэтага часу ўжо прыбыла шмат міліцыі — усё наша кіраўніцтва, УУС, карэты хуткай дапамогі...

— З правага боку будынка супрацоўнікі банка адкрылі ралет, і мы дапамаглі выбрацца на вуліцу чатыром жанчынам, — дадае Кірыл Маркаў. — Яны знаходзіліся за касавай прасторай, і злачынца іх не бачыў. А яшчэ сачылі, каб цераз двор дома, дзе знаходзілася аддзяленне, не хадзілі людзі. Пачалі збірацца зявакі, у тым ліку і падлеткі, спрабавалі здымаць на відэа. Мы прасілі ўсіх адысці ад небяспечнай зоны.

Ніхто не ведаў, як будуць развівацца падзеі. Але прафесіяналы дзейнічалі зладжана, быццам удзельнічалі ў такіх аперацыях не першы раз. Памочнік камандзіра ўзвода, камандзір групы затрымання **Ленінскага аддзела Дэпартамента аховы Сяргей ГЕЦАРАЎ** нават не ведаў, што ў якасці заложніка сябе прапанаваў **першы намеснік начальніка УУС Магілёўскага аблвыканкама Аляксандр ВАСІЛЬЕЎ.** Што менавіта ён знаходзіцца за рулём аўто, якое было даручана пераследаваць.

— Мне толькі паведамілі, што злачынца разам з заложнікам будзе ехаць на серабрыстага колеру машыне, — расказвае міліцыянер. — Гэта была машына добра нам вядомая, начальніка РАУС Ленінскага раёна. Я на патрульнай машыне знаходзіўся на некаторай адлегласці ад банка, і мяне не было бачна з дарогі. Калі ўбачыў знаёмую машыну, паехаў за ёй. Праз 200 метраў яна прыпынілася, з яе выйшаў чалавек і пабег у мой бок — толькі тады я пазнаў у ім Васільева. Злачынца тым часам перасеў за руль, і я рвануў на машыне наперад, каб не даць яму на аўто крануцца з месца. Яшчэ адна машына групы затрымання з упраўлення ўнутраных спраў Магілёўскага аблвыканкама заехала наперад і перакрыла дарогу. Мужчына выскачыў з машыны і кінуўся бегчы. Пачалася страляніна. Ён страляў то ў бок мяне, то ў бок супрацоўнікаў УУС. Я таксама страляў. Упершыню за 13 гадоў работы — не ў ціры.

Злачынца быў затрыманы, для гэтага яго прыйшлося параніць у ногі. Зараз 28-гадовы грамадзянін Расійскай Федэрацыі ў бальніцы, да яго прыстаўлена ўзмоцненая ахова. У адносінах да яго Следчым камітэтам распачата крымінальная справа па пунктах 6 і 7 другой часткі артыкула 291 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь (захоп заложнікаў). Следства ўстанаўлівае дэталі нядаўніх падзей, каб рабаўнік атрымаў адпаведнае яго дзеянням пакаранне.

Сем'і ўдзельнікаў аперацыі дагэтуль пад уражаннем. Кірыл Маркаў у бацькоў адзіны сын, у Анатоля ёсць сястра і нявеста. У Сяргея Гецарава — жонка і двое дзяцей. Слёз і перажыванняў было мора. Самі міліцыянеры сціпла прызнаюцца, што эмоцый пры выкананні свайго доўгу не было. Рабілі ўсё, як трэба па службе.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**
*zigulya@zviazda.by*

# Кантралёр — у дзверы, «заяц» — у вакно

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

— Калі чалавек хлусіць, гэта адразу відаць, — дзеліцца Раіса Іванаўна. — Цяпер пасажырскія эмоцыі крыху стрымлівае камера. Раней часта было, што скаргі пісалі, як кантралёр хаміў. Цяпер запіс можна праглядзець, каб даказаць, што адбывалася. У сваю чаргу мы можам пасажыра прыцягнуць да адказнасці за паклёп.

Калі людзі прыкладваюць свае карткі да тэрмінала кантралёра, на прыладзе відаць, прыкладаў ён яе да валідатара ці не. Акрамя таго, можна ўбачыць, калі праязным дакументам увогуле карысталіся апошні раз, нават калі гэта было ў іншым транспарце. А вось праверыць, праязны гэта або картка на некалькі паездак, можна толькі на валідатары.

Так здарылася, напрыклад, з пасажырам, які доўга шукаў праязны па ўсіх кішэнях. Картка паказала, што праезд не аплачаны. Кантралёры сабраліся выйсці з «зайцам» на прыпынку, але па валідатары высветлілі, што гэта праязны. Перад мужчынам выбачыліся і дазволілі ехаць далей, параіўшы не забывацца адзначаць сваю прысутнасць у транспарце.

— Калі ў чалавека праязны (на 10, 15 дзён або месяц) і ён не прыклаў яго да валідатара, мы не штрафуем, хоць па законе маем на гэта права, — кажа Тамара Вішнякова. — Калі ж гэта картка на колькасць паездак, то, незалежна ад таго, па якой прычыне ён яе не прыклаў, штрафуем, каб не забываўся аплачваць.

**Перш чым забыцца на праязны ў кішэні, магчыма, варта ўбачыць, як іншыя пасажыры ставяцца да таго, хто ўвайшоў і не прыклаў картку да валідатара. А прэтэнзіі наконт гэтага, дарэчы, могуць кантралёрам выказаць.**

Кантралёры, як правіла, не правяраюць пасажыраў, якія выходзяць на прыпынку, дзе ўвайшлі супрацоўнікі кантрольнай службы, хоць рабіць гэта таксама могуць. Таму ў «зайца», які згледзеў кантралёра ў вакно, ёсць магчымасць выскачыць. Так адбылося і на адным з прыпынкаў, дзе жанчына кінулася ў дзверы, ледзьве не вынесшы з сабою і кантралёраў.

— Вось бачыце, што робіцца, — ківае галавой Тамара Уладзіміраўна. — Убачаць кантралёра і ўцякаюць.

## ДАВЯРАЙ, АЛЕ ПРАВЯРАЙ

Некаторыя безбілетнікі любяць прыкінуцца іншаземцамі.




**Мініяцюрная відэакамера фіксуе размовы кантралёра з пасажырамі.**

— Я вывучала французскую мову ў школе і памятаю, як яна гучыць. А тут хлопец пачынае мне казаць, што ён француз, невядома на якой мове, — успамінае Тамара Уладзіміраўна. — У гэтага «француза» аказаўся ў выніку беларускі пашпарт. І «паляк» у мяне быў. «Мовіць па-польску» стараўся, пакуль не выдаў сябе словамі «мой калега».

Часта пасажыры тлумачаць, што не дайшлі да кіроўцы купіць талон. Такога быць не можа.

**Праезд аплачваецца да пачатку паездкі пры ўваходзе ў транспарт. Чалавек павінен увайсці ў салон ужо падрыхтаваным. Мяркуецца, што набываючы талон у кіроўцы, ён купляе на наступную паездку. Аплаціць праезд да наступнага прыпынку пасажыр мог толькі пры наяўнасці кандуктараў, якіх ужо некалькі гадоў у транспарце няма, кажуць кантралёры.**

Дакументы на права бясплатнага праезду — асобная катэгорыя людскіх хітрыкаў. Як толькі пасажыры іх не прад'яўляюць. То ледзьве махнуць перад вачыма, то недзе з напаўраскрытага кашалька паказваюць. А кантралёры абавязаны паглядзець на пасведчанне з абодвух бакоў. Калі ж яны сумняваюцца ў яго сапраўднасці, то могуць пазваніць у міліцыю, каб там пацвердзілі інфармацыю.

Бывае, што пасведчанне сапраўднае, але належыць іншаму чалавеку. Здараецца, на дакументы памерлых наклейваюць сваё фота, ксеракопіі робяць. Або едуць з пасведчаннем інваліда 2-й групы, а на справе аказваецца, што там 3-я. А на яе бясплатны праезд не распаўсюджваецца.

— Просіш паказаць нармальна, яшчэ і аблаюць цябе, што ты іх правы парушаеш. А гэта наш непасрэдны абавязак — упэўніцца, што дакумент належны, — расказвае Тамара Вішнякова. —

**За адной пасажыркай з «ліпавым» пасведчаннем інваліда 1-й групы маёй напарніцы неяк прыйшлося нават па метро бегаць.**

— Цяпер моладзь па 18—19 гадоў узяла моду казыраць чарнобыльскімі пасведчаннямі з артыкулам 23 і даказваць, што можа ездзіць бясплатна. Гэтае права маюць толькі ліквідатары, у пасведчаннях якіх артыкул 18 або 19. 23-і дае пэўныя льготы, але не бясплатны праезд. А яны сварацца з намі, кажуць, што ім дазволілі, — далучаецца Раіса Жучко. — А вось неяк ехала жанчына. Пасведчанне ў яе сапраўднае было, але належала яе маці, якая нарадзілася ў 1929-м. А дачка — з 1957-га. Ну відаць жа, што розніца амаль у 30 гадоў.

Праезд не са сваім пасведчаннем — падстава для прыцягнення па 380-м артыкуле Крымінальнага кодэкса. Штраф да 20 базавых велічынь. А калі яшчэ і сваё фота наклеіў на чужое, то тут ужо два артыкулы дзейнічаюць, можна і 50 базавых заплаціць, а то і на папраўчыя работы трапіць.



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

**Дыспетчар Зоя БАРАЗНА: «На гэтым маніторы мы бачым відэазапісы праверкі білетаў».**

## ГРОШЫ І ПАШПАРТ!

Самая вялікая цяжкасць кантралёрскай працы не сваркі з пасажырамі, а працэдура спагнання штрафу. У чалавека павінен быць з сабой пашпарт, інакш яго нельга аштрафаваць, расказалі нам іншыя кантралёры на дыспетчарскай станцыі «Кунцаўшчына». Адгэтуль мы адпраўляліся ў падарожжа.

— Чалавек едзе без білета, ён згодны аплаціць штраф. У нас ёсць пранумараваныя штрафныя квітанцыі. Усё, здавалася б, нармальна. Не! Мы павінны ўнесці пашпартныя даныя пасажыра ў пастанову аб накладанні адміністрацыйнага спагнання. Інакш не маем права штрафаваць. Калі пашпарта няма, выклікаем нарад міліцыі. Ну хіба гэта правільна? — абураецца адзін з кантралёраў. — Па законе ў нас людзі не абавязаны насіць пашпарт пры сабе.

— Некаторыя безбілетныя пасажыры не кажуць інфармацыю пра сябе, выходзяць разам з намі на прыпынку і ўцякаюць, — дадае яго калега. — А тыя, хто гатовы плаціць, як пачынаецца разбор з пашпартам, таксама збягаюць. Мы ходзім, як некія пужалкі, і міліцыяй страшым. Многія кантралёры толькі выгляд робяць, што тэлефануюць, бо нарад можа і праз гадзіну прыехаць.

Аднак не думайце, што ўсё так проста — выйшаў на вуліцу і ўцёк.

**Утрымліваць безбілетніка да прыезду міліцыянераў кантралёры сапраўды маюць права. Яго дае артыкул 5.2 Кодэкса аб адміністрацыйных правапарушэннях «Прычыненне шкоды пры затрыманні фізічнай асобы, якая здзейсніла злачынства або адміністрацыйнае правапарушэнне». Тут гаворыцца, што кантралёр не парушыць закон, калі нанясе «зайцу» нейкую шкоду пры затрыманні ці спыненні яго спробы ўцячы.**

Дарэчы, квітанцыя аб аплаце штрафу не вызваляе ад аплаты праезду. Калі ехаць далей без талона, можна ў той жа дзень ізноў трапіць на штраф, папярэджваюць кантралёры.

Калі пашпарт ёсць, а грошай няма, складаецца пратакол, а штраф плаціцца не адразу.

## ПАСАЖЫРСКІЯ ЗАМАЛЁЎКІ

Першы безбілетнік у той дзень — жанчына, якая штодня ездзіць да 97-гадовай маці. Кажа, хацела аплаціць, але наяўных няма і пашпарта таксама.

— Вельмі спяшаюся. Дзяўчаткі, прабачце, калі ласка. Мне будзе 70 наступным годам. Я не працую, пенсію атрымліваю толькі 300 рублёў.

— А чаму, прабачце, вы не купілі праязны, раз штодня ездзіце? — не вытрымліваю я.

— Дык я не паспела. Я заўжды набываю праязны (на календары — трэцяя дэкада лістапада).

— Гэта лепет немаўляці. Штраф 11,50 рубля, — рэзюмуе Раіса Жучко.

Яшчэ некалькі хвілін перамоў, і грошы жанчына ўрэшце знайшла, хоць спачатку казала, што мае толькі картку.

У чарговым аўтобусе — студэнт без білета з сябрам. Сябар прапануе, калі кантралёры адышліся: «Давай я табе свой дам, скажаш, што не знайшоў адразу». «Заяц» выходзіць з кантралёрамі на прыпынку і ўцякае.

У тралейбусе па вуліцы Цімiразева два безбілетнікі тлумачаць, што толькі на мінулым прыпынку ўвайшлі, загаварыліся, забыліся пракампасціраваць талоны.

— Вось, у руках жа трымаем. Давайце ў вас купім яшчэ талоны.

— Вы пад кампосцерам стаіце. Напэўна ж не проста так.

Штраф для абодвух афармляецца проста ў тралейбусе.

— А ёсць і такія, што ў апошні момант аплачваюць, праўда, малады чалавек? — каментуе Тамара Вішнякова, паказваючы на юнака, які толькі што прабіў талон. Той робіць выгляд, што словы датычацца не яго.

На прыпынку «Тэатр Музкамедыі» з салона выходзіць дзяўчына-астматык, якой стала кепска. Дакументы ў яе кантралёры так і не праверылі — проста ўпэўніліся, што ёй лепш, і пакінулі на прыпынку.

Яшчэ адзін безбілетнік зайшоў перад канцавым прыпынкам «Гарадскі Вал». Юнак з Пінска слухаў музыку па тэлефоне. На пытанне «Чаму без аплаты?» спакойна кажа: «Увайшоў, сеў, думаю, праеду пару прыпынкаў». Дае звесткі пра сябе, але грошай няма. На яго адрас прыйдзе штраф.

За тры гадзіны, што мы правялі разам з кантралёрамі, я, прызнаюся, маральна даволі стамілася. І для сябе вынесла адно: каб не трапіць на грошы і нервы, захаваць чалавечае аблічча, лепш плаціць, калі ўжо едзеш.

**Ірына СІДАРОК.**
*sidarok@zviazda.by*

## ИЗВЕЩЕНИЕ о проведении открытого аукциона на право заключения договора аренды земельных участков

### Организатор аукциона – Любанский районный исполнительный комитет

| № лота | Сведения о виде и предмете аукциона | Адрес объекта и его назначение | Срок аренды | Начальная цена объекта (рублей) | Сумма задатка (рублей) | Расходы по организации и проведению аукциона (рублей) | Ограничения и (обременение) прав в использовании земель |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 |
| 1 | Аукцион на право заключения договора земельного участка | Земельный участок для строительства объекта розничной торговли со встроенным объектом общественного питания (размещение объектов розничной торговли), расположенный по адресу: Минская обл., г. Любань, ул. Первомайская, уч-к №10, площадь – 0,6228 га, кадастровый №623450100001003093 | 50 лет | 52 704,64 | 5 270,46 | 3 836,56 + расходы по размещению извещения в СМИ | Земельный участок имеет ограничения в использовании: охранная зона линий связи и радиофикации, площадью – 0,0008 га; охранная зона сетей и сооружений водоснабжения, площадью – 0,0155 га |
| 2 | Аукцион на право заключения договора земельного участка | Земельный участок для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (для размещения объектов усадебной застройки), расположенный по адресу: Минская обл., г. Любань, ул. Тальская, уч-к №54, площадь – 0,1491 га, кадастровый №623450100001003046 | 50 лет | 1 513,35 | 151,33 | 69,0 + расходы по размещению извещения в СМИ | Земельный участок имеет ограничения в использовании: охранная зона электрических сетей напряжением до 1000 вольт, площадью – 0,0003 га |
| 3 | Аукцион на право заключения договора земельного участка | Земельный участок для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (для размещения объектов усадебной застройки), расположенный по адресу: Минская обл., г. Любань, ул. Тенистая, уч-к №134, площадь – 0,1351 га, кадастровый №623450100001003038 | 50 лет | 1 371,24 | 137,12 | 68,99 + расходы по размещению извещения в СМИ | |
| 4 | Аукцион на право заключения договора земельного участка | Земельный участок для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (для размещения объектов усадебной застройки), расположенный по адресу: Минская обл., г. Любань, ул. Тенистая, уч-к №133, площадь – 0,1352 га, кадастровый №623450100001003048 | 50 лет | 1 372,26 | 137,23 | 69,0 + расходы по размещению извещения в СМИ | Земельный участок имеет ограничения в использовании: охранная зона электрических сетей напряжением до 1000 вольт, площадью – 0,0030 га |

Задаток перечисляется на р/с райфо № BY58 AKBB 36006200013190000000 в ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Минск, код банка AKBBBY2X, код платежа 04002, УНН 600537220.
Победитель аукциона возмещает расходы, связанные с организацией и проведением аукциона, потерей сельскохозяйственного производства, связанные с изъятием земельного участка и публикацией объявления в средствах массовой информации. Оплата в размере цены продажи объекта (за вычетом задатка) в течение 10 рабочих дней со дня получения протокола аукциона.
Аукцион проводится при наличии не менее двух участников.

Наличие возможности подключения к линии электроснабжения, водоснабжения, водоотведения и газоснабжения.
Для участия в аукционе представляются: заверенная банком копия платежного документа, подтверждающая внесение задатка, копия паспорта или иного документа, удостоверяющего личность, для ИП и юридических лиц – копия свидетельства о государственной регистрации, копия устава, копия доверенности. При подаче заявления заключается соглашение с райисполкомом о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Аукцион состоится **28.12.2017 г., в 10.00** г. Любань, ул. Первомайская, 24а, малый зал заседаний райисполкома, 3-й этаж.
Заявления на участие и необходимые документы принимаются с момента опубликования извещения в рабочие дни с 8.00 до 16.00 по адресу: г. Любань, ул. Первомайская, 24а, райисполком, землеустроительная служба, кабинет 3.10, по 26.12.2017 года включительно.
Информацию о расположении земельных участков можно получить в землеустроительной службе, контактный телефон: (8 01794) 67-5-86 (секретарь комиссии).

■ Профі

**Неўзабаве на ўзбраенне ракетных войскаў і артылерыі беларускай арміі паступіць мадэрнізаваная сістэма залпавага агню «Паланэз»**

# ПЕРАДАВАЯ ЗБРОЯ — У РУКАХ ПРАФЕСІЯНАЛАЎ

Дык вось на турзлёце бацька Сяргей Кашміло «набыў» 14-гадовую дачку Насцю для ўдзелу ў конкурсе. А жонку Кацю... арандавала іншая сям'я, Карніловічаў, бо там гаспадыня Наталля не ездзіць на веласіпедзе. Проста дачцэ вельмі хацелася прыняць удзел у спаборніцтвах: разам з бацькам яны ў першы дзень спаборніцтваў былі ў лідарах (мелі па два першыя і два другія месцы), а Каця такім чынам вырашыла зарабіць для сям'і «грошай».

Насамрэч сям'я Кашміло, дзе, акрамя дачушкі, падрастае і 9-гадовы сын Сямён, вельмі спартыўная. Бацька захапляецца ўсім, што адносіцца да хуткай язды, — квадрацыкламі, пазадарожнікамі. А Каця з дзецьмі не адстае — «хвосцікам» падзяляе захапленне мужа актыўным адпачынкам і турызмам: байдаркамі, веласіпедамі. Дачка ў школе нават запісалася ў турыстычны гурток.

Падчас «Грыбнога кахання» адбыліся спаборніцтвы па зборы грыбоў. Гэты этап быў для ўдзельнікаў самы лёгкі. Усяго і патрабавалася, што за дзве гадзіны назбіраць максімальную колькасць дароў лесу, балазе, сёлетняя восень была багатая на іх. Тытулы «Містар і Місіс Грыбнік» атрымала **сям'я ПАШКОВІЧАЎ.**

А вось этап «Каханне не бульба» быў больш складаны: конкурс аратых. Спаборніцтвы праходзілі на трактарах МТЗ-80.

Амаль усе ўдзельнікі — і мужчыны, і жанчыны — за рулём трактара сядзелі першы раз у жыцці. Па ўмовах этапу жанчыне трэба было спыніць яго на кантрольнай паласе, а мужчыне — узараць участак зямлі. Конкурс праходзіў на тэрыторыі прафтэхвучылішча. Пераможцы атрымалі тытул «Містар і Місіс Фермер». Імі сталі сем'і ўжо добра вядомых нам **ПАШКОВІЧАЎ** (ну, куды ж без іх!) і **Ганны і Віталя БУТОРЫНЫХ.** У апошніх літаральна нядаўна стаж сямейнага жыцця стаў роўны двум гадам. Што думаюць самі пераможцы наконт свайго дасягнення? Тут меркаванні раздзяліліся.

Ганна, у якой стаж кіроўцы тры гады і якая за рулём трактара сядзела ўпершыню, як ні дзіўна, заявіла, што кіраваць ім складаней, чым машынай, але абсалютна не страшна. «І паставіць трактар на кантрольную лінію было лёгка. Так што трактарысткай быць магу». У Віталя стаж кіроўцы — 20 гадоў, водзіць машыну і матацыкл, некалі вучыўся кіраваць і трактарам. Дык вось ён адзначыў, што працэс гэты складаны, асабліва ва ўмовах выканання сельскагаспадарчых работ. Араў мужчына ўпершыню, але справіўся без адзінага штрафнога бала!

**На праекце мае хаджэнне ўнутраная валюта — «амурыкі». Іх сем'і зарабляюць за перамогу ў этапах, за дапамогу ў іх правядзенні.**

Буторыны вельмі любяць актыўны адпачынак, турызм, збор грыбоў. Але самае галоўнае захапленне сям'і — гэта байкерства. Прычым на злёты ў Смаргонь, Ліду і іншыя гарады Ганна ездзіць разам з Віталем. Хаця сама яна матацыклам не кіруе, кажа, што цалкам даверае мужу, з ім абсалютна не страшна ездзіць...

Наперадзе ўдзельнікаў праекта чакаюць яшчэ конкурсы танца і сямейнага кіно, гульня з абменам гендарнымі ролямі, подыум. Фінал павінен прайсці на сцэне гарадскога Дома культуры.

— У чым галоўная сутнасць такіх праектаў? — перапытвае Марына Гараповіч. — Сэнс у тым, што кожная сям'я, праходзячы этап за этапам гульні, «шукае» свой галоўны страх і свой галоўны поспех. Нельга ўмець рабіць усё. Нельга быць увесь час лепшым і выйграваць. Праект вучыць з годнасцю і разуменнем прымаць і паражэнні, і перамогі. І, самае галоўнае, ён вучыць каханню...

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*
**Фота Алены МЯНЖЫНСКАЙ.**

## А што думаюць самі ўдзельнікі сямейнага праекта?

**Кацярына і Сяргей КАШМІЛО:** — Удзельнічаем у ім, каб жыццё стала цікавейшым, каб з'явіліся новыя сябры і ўражанні. Мэты перамагчы няма... Экстрым у нашым жыцці — гэта ўсё. Жыць адно з адным — гэта ўжо экстрым. Хацелі б пажадаць усім сем'ям, якія ўдзельнічаюць у праекце, каб экстрэмальны адпачынак прыносіў толькі пазітыўны настрой.

**Таццяна і Сяргей КАРПОВІЧЫ:** — Мы прыйшлі сюды па новыя ўражанні, сяброў, эмоцыі, адрэналін. Каб праз 50 гадоў было што прыгадаць. У першую чаргу мы хочам даказаць сабе, што можам... Можам усё: танцаваць, даіць кароў, плыць на байдарках, сябраваць, гуляць, кахаць. А моцна кахаць — гэта значыць ахвяраваць сабой дзеля другога чалавека.

**Алена і Анатоль ПАШКОВІЧЫ:** — Мы абодва — са шматдзетных сем'яў. І мы не баімся любой работы. Гэта вынік выхавання менавіта ў такой атмасферы. У гэтым праекце, як і некалі ва «Уладары вёскі», удзельнічаем дзеля добрых успамінаў, якія застануцца ў нашых дзяцей. Усім удзельнікам жадаем шчасця і ўзаемапаразумення, каб усе пытанні ў сям'і і ў праекце вырашаліся без спрэчак.

**Ганна і Віталь БУТОРЫНЫ:** — Каханне... Гэта калі цікава з чалавекам, калі хочацца ўвесь час быць з ім побач, калі яму цалкам давяраеш. Гэта не патлумачыш словамі... Мы любім кантактактаваць, а ў праекце набылі новых знаёмых, добрых і верных таварышаў, з якімі з задавальненнем праводзім вольны час. У планах — пашырэнне сям'і, кватэры, пошук новых магчымасцяў — духоўных, эмацыянальных, забаўляльных. І адной з такіх магчымасцяў з'яўляецца праект «Заўтра было каханне». Усім перамогі, поспехаў у далейшых этапах, сямейнага дабрабыту. І, самае галоўнае, усім дайсці да фіналу!


Фота Міколы ШУМА.

■ Захапленні

# ...І ЛЮБІМЫЯ КАЦЯНЯТЫ



**Гэтыя цацкі, каб хацеў, іначай, відаць, не назавеш — толькі пушысцікі. Аўтар іх — рукадзельніца Таццяна КЕНДЫСЬ.**

Па адукацыі Таццяна Іванаўна педагог, працуе ў Вярховіцкай сельскай бібліятэцы Камянецкага раёна Брэсцкай вобласці. Вязаць навучылася змалку: спачатку пераважна для сябе, потым для сына — кофтачкі, штонікі, шкарпэткі...

Першай цацкай, якую звязала, стаў снегавік. За імі «пайшлі» сабакі, яноты, вожыкі, совы, свінкі, мышы, цмокі і нават Змей Гарынавіч. Аднак любімымі па-ранейшаму застаюцца кацяняты з махеравых нітак.

Варта зазначыць, што захапленне майстрыхі ніколькі не перашкаджае асноўнай працы — нават наадварот: пры бібліятэцы створаны гурток «Вясёлка рукадзелля», дзе Таццяна Іванаўна вучыць дзяцей таму, што ўмее сама.

А яна, дарэчы, на дасягнутым не спыняецца. Спрабавала сябе і ў шыцці, і ў вышыўцы, і ў пляценні кошыкаў з паперы ды ўпрыгажэнняў з бісеру. Але ж асноўным было і засталося вязанне: сёння, прынамсі, сабачак — самых розных парод, што і зразумела: год менавіта гэтых пушысцікаў ужо не за гарамі. Значыць, попыт на іх павінен узрасці?

**Ганна СОЎПЕЛЬ**

■ Пасля пісьма

# У ЛЮДЗЕЙ НАДЗЕЯ — НА ЛЮДЗЕЙ

**...Нельга сказаць, што ў тыя, ужо далекаватыя жнівеньскія дні, увагі да стагадовай «Звязды» было вельмі шмат. Але ж яна была: газету віншавалі (у тым ліку першыя асобы краіны), ёй уручалі падарункі, пра яе пісалі іншыя выданні, расказвалі па тэлебачанні і радыё... «Вам што — па-ранейшаму дасылаюць лісты ў канвертах? Шарыкавай ручкай пішуць: «Дзень добры, дарагая рэдакцыя»? — захаплялася, у прыватнасці, адна з маладых каляжанак. — Як гэта класна!»**

**Мы, вядома ж, не спрачаліся, бо гэта і сапраўды «класна», калі газеце, як добраму сябру, чалавек давярае сваё і добрае, і дрэннае, піша пра набалелае. І без розніцы тады: шарыкавай ручкай ці з дапамогай камп'ютара.**

*«Сёлета наш тыдзень міласэрнасці быў скіраваны на людзей адзінокіх,* — паведамляе **спадарыня Тамара Круталевіч з Беразіно.** — *Мы аб'ядналі магчымасці саюзаў «Белая Русь», жанчын і моладзі, ветэранаў вайны ў Афганістане, таварыстваў ДТСААФ, ратавальнікаў, піянераў... Кожны з партнёраў вызначыў свой участак работы. А далей...*

*Аб'ектам асаблівага клопату стала жыццё 36 адзінокіх гараджан пажылога ўзросту, кожны трэці з якіх — з інваліднасцю,* — піша Тамара Мікалаеўна. — *Маладзёжныя атрады валанцёраў дапамаглі ім прыбрацца на падворках і ў жылых памяшканнях, вымылі вокны, выхаванцы Цэнтра дзіцячай творчасці і піянеры падрыхтавалі сувеніры, актывісткі клуба ветэранаў дашкольнай адукацыі наладзілі цёплыя візіты да сваіх былых выхавальнікаў і настаўнікаў. Да таго ж кожнаму з адзінокіх і састарэлых так званая карэта міласэрнасці даставіла адмысловыя прадуктовыя наборы. Лідар арганізацыі бярэзінскіх воінаў-афганцаў, індывідуальны прадпрымальнік Алег Купіч выдзеліў для гэтага досыць салідную грашовую суму, дырэктар рынку «ТрыА» Максім Касоўскі — свежыя хлебабулачныя вырабы, арганізацыя ДТСААФ забяспечыла транспартныя паслугі. Прычым кіроўцы прыязджалі да землякоў не толькі з прысмакамі, але і з песнямі ад баяністкі Тамары Дземяшкевіч, з якой адзін 93-гадовы дзядуля нават кінуўся ў скокі.*

*Рупліўцы акцыі знаходзілі час і на тое, каб пагутарыць з землякамі, запісаць успаміны і персанальныя заяўкі на дапамогу, каб паклоніцца ім за пражытыя гады, бо сярод тых, каго наведвалі, шмат людзей з цікавымі ці нават трагічнымі лёсамі. Ганна Антонаўна Выгоўская, напрыклад, у першыя месяцы вайны засталася ўдавой, пешшу, з двума маленькімі дзецьмі дабіралася з Брэста на сваю Бярэзіншчыну, працавала настаўніцай, заўсёды была і ў свой 101 (!) год застаецца эталонам інтэлігентнасці і душэўнай шчодрасці.*

*Балючая статыстыка,* — працягвае спадарыня Круталевіч, — *пяцёра з наведаных жанчын перажылі смерць свайго дзіцяці, а то і не аднаго... Трох сыноў забраў няўмольны лёс у Веры Уладзіміраўны Самец, двух — у Ганны Антонаўны Выгоўскай і Марыі Пятроўны Пусевай. Лізавета Васілеўна Анісімава пахавала дачку і сына, Вера Уладзіміраўна Цыбулька — дачку. Адзіная радасць цяпер — унучка, якая пасля заканчэння ўніверсітэта і магістратуры працуе псіхолагам.*

*Адзінота згінае і моцныя плечы. «Няма гаспадыні ў хаце — няма і цеплыні»,* — скардзіліся мужчыны, шчыра хвалячы сваіх сацгадлівых сацыяльных работнікаў.

*І сапраўды: цені не гасяць сонца,* — сцвярджае спадарыня Тамара, — *свет не без добрых людзей. Рэйд дабрачыннасці завяршаўся думкамі, што адзіноту не развееш ні рублём, ні куском — толькі добрым словам і прысутнасцю. У людзей надзея — на людзей».*

У жыхароў Бярэзіншчыны — яшчэ і на канкрэтных: у прыватнасці — на старшыню раённага каардынацыйнага савета грамадскіх аб'яднанняў спадарыню... Тамару Круталевіч, нястомную ініцыятарку і арганізатарку абсалютнай большасці мерапрыемстваў! Энергічная, артыстычная, абаяльная, яна заўсёды ў пошуку, заўсёды ў клопаце пра тых, каму гэты клопат патрэбны. А людзей такіх насамрэч шмат.


Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Даўні падпісчык і сябар «Звязды» Васіль Мікітавіч ПЯШЭВІЧ з вёскі Юркевічы Жыткавіцкага раёна паказвае суседу Адаму Мікітавічу БОБРЫКУ прыз, які выйграў у звяздоўскай латарэі.

*«...Я дагэтуль не магу зразумець, як мы ацалелі ў час вайны,* — піша **спадар Анатоль Кашэвіч з Лельчыцкага раёна.** — *Зімой, у лютыя маразы мы жылі ў спехам зробленых з жэрдак і яловага лапніку куранях. Агонь у гэтых «пабудовах» запальваць нельга было, бо задыхнешся ад дыму, раскладваць вогнішча побач — таксама, бо немцы з самалётаў скідвалі бомбы. Мы літаральна замярзалі... А спытайце, што елі? У нас нічога не было, апроч кары, жалудоў ды калі-нікалі журавін, знойдзеных пад снегам. У выніку многія дарослыя, а найбольш дзеці, хварэлі і паміралі. Да таго ж на нас, як на зайцаў, палявалі немцы з паліцаямі, забівалі, тапілі ў калодзежах, вывозілі ў Германію.*

*Так атрымалася, што вось гэта, наша жыццё ў куранях — распаўсюджанае, дарэчы, не толькі на Гомельшчыне, — дагэтуль не даследавана ні гісторыкамі, ні пісьменнікамі,* — сцвярджае спадар Кашэвіч. — *І таму — як бы забытае. А між тым пра дзяцей вайны варта ўспомніць — як у парламенце, так і ва ўрадзе. А то атрымліваецца, што нашы аднагодкі, якія трохі пабылі ў Нямеччыне, маюць нейкія льготы, а мы, куранёўцы, — не. Ці справядліва гэта?»* — пытае аўтар ліста.

Тое ж балючае пытанне хвалюе і **спадарыню Лідзію Лук'янаву з в. Швабы Лагойскага раёна.** *«Неперспектыўны чалавек, неперспектыўная вёска... Якія гэта цяжкія, крыўдныя словы!* — піша яна. — *Як удар, як кляймо, як прысуд... Апошнім часам яго вынеслі многім населеным пунктам, якія раней кармілі гарады. Бо адтуль людзі ехалі ў вёскі не толькі для таго, каб дапамагчы, каб папрацаваць, але і для таго, каб добра «затарыцца» прадуктамі ды прысмакамі. Глядзіш, і ўжо радзей потым трэба хадзіць у крамы, а зэканомленыя грошы можна патраціць на камунальныя паслугі, на абеды для дзяцей у школе ды на нешта іншае.*

*Вёска выручала, у ёй заўжды жылі добрыя працавітыя людзі,* — узгадвае спадарыня Лук'янава. — *А дзетак колькі было! У дзве змены ў школах вучыліся. Прычым дадатковыя заняткі настаўнікі праводзілі з імі не за грошы — за так, бо былі зацікаўленыя найперш у ведах.*

*Што ж цяпер? Зямліца наша дае ўсё лепшыя ўраджаі. І малака ад каровы надойваем больш. Але пры гэтым закрываюцца фермы, школы, дзіцячыя садкі... Усё нерэнтабельнае. А чаму? Чаму людзі, хочучы пракарміць свае сем'і, зарабіць неблагую пенсію, ездзяць па свеце, шукаюць работу недзе? Чаму не ствараць працоўныя месцы ў вёсках?*

*Пашанцавала тым з іх, што сталі аграгарадкамі. А што ж усім іншым?»*

У асобных (чытачам газеты аб гэтым не трэба казаць) распачалі свой бізнес прыватныя прадпрымальнікі, раскрыліся фермеры, адкрыліся аграсядзібы, туды пачалі вяртацца гараджане. Але ж большасць і сапраўды, як піша чытачка, ужо «і вёскі не вёскі, і дачы не дачы — так, парадзелыя паселішчы, дзе дажываюць свой век пенсіянеры».

Можна было б тут нагадаць, што яны не забытыя: туды прыязджаюць аўталаўкі і паштовыя машыны, ходзяць аўтобусы. Гэта, вядома ж, добра, але... Людзям, а тым больш састарэлым, хацелася б і большага, і лепшага. А галоўнае — каб жылі вёскі.

Вось гэтаму, як паведамляе **спадар Анатоль Жогла з Лельчыц,** прысвяціў усё сваё жыццё былы кіраўнік знакамітага сельгаспрадпрыемства «Стадолічы», ардэнаносец, дэпутат Вярхоўнага Савета БССР 12-га склікання Міхаіл Данілавіч Сукач. Нарадзіўшыся ў 41-м пятым дзіцем у сям'і, ён малым застаўся без бацькі, малым трапіў у канцлагер. Але ж, цудам выжыўшы, атрымаў належную адукацыю, узначаліў гаспадарку. *«Гэта пры ім,* — піша спадар Анатоль, — *былі нечуваныя раней прыварогі і ўраджаі, а значыць, прадукцыйнасць працы і заробкі, гэта пры ім для працаўнікоў будавалася камфортнае жыллё і дарогі, купляліся аўтобусы для падвозу на працу і дамоў, аказвалася дапамога падшэфным школам, дзіцячым садкам і, вядома ж, вясковым пенсіянерам...*

*Дык ці не надышоў час зараз, калі Міхаіла Данілавіча, на жаль, не стала, прысвоіць сённяшняму КСУП «Стадолічы» імя яго першага кіраўніка?»*

Лагічнае пытанне і, напэўна ж, вырашальнае. У адрозненне ад...

**Спадар Кавальчук** у сваім лісце (які прыйшоў па электроннай пошце) абрынуўся з крытыкай на адрас тэлеканалаў — пераважна расійскіх. Але пры чым тут «Звязда»?

**Спадарыня Савіцкая** (а мо і не Савіцкая?) выказвала сур'ёзныя прэтэнзіі да публікацый газеты. Азнаёміліся з імі рэдакцыйнае начальства, абмеркавалі, прынялі рашэнні, падрыхтавалі адказ — адправілі на ўказаны адрас. Ліст вярнуўся з пазнакай, што... няма такіх вуліцы і дома.

**Спадарыня Алена М.** у нашу газету даслала вялікую падборку вершаў на... рускай мове.

**Спадар Дзмітронак** пытаўся, ці не зацікавяць газету яго нататкі пра Неапаль?

І добра было б, калі б яны, тыя нататкі, што называецца, да ліста дадаваліся: тады б можна было адразу і прачытаць, і адказаць. Пажадана па тэлефоне, але ж нумар яго таксама не паведамляўся...

Зрэшты, тыя ці іншыя складанасці *на* працы — гэта і сапраўды нішто ў параўнанні з цяжкасцямі *без* працы.

А таму завяршыць гэты агляд хочацца лістом **спадара Васіля Пяшэвіча з в. Юркевічы Жыткавіцкага раёна.** *«Заўтра,* — піша ён, — *чарговы раз пайду ў аддзяленне сувязі, каб аформіць падпіску на любімую «Звязду». Чаму яна любімая? Таму што размаўляе са мной на маёй мове, таму што працуюць тут таленавітыя журналісты. Вось і сёння адкрыў газету, а там «Нефармат» Святланы Яскевіч, пра спорт цікава піша Дар'я Лабажэвіч, а ў рубрыцы «...Народ на провадзе!» друкаваўся і сам. Паказаў гэту публікацыю ды іншыя выразкі са «Звязды» сваёй нявестцы з Гомеля, і яна таксама стала падпісчыцай газеты. Спадзяюся, што гэта, як у мяне, ужо назаўсёды... Яшчэ і таму,* — дадае спадар Пяшэвіч, — *што я калі-нікалі гуляю ў розныя там лато, прымаю ўдзел у рэкламных гульнях. Але на выйгрыш мне шанцуе толькі са «Звяздой».*

У Мінск, у рэдакцыю, па свой другі прыз Васіль Мікітавіч ехаць не адважыўся: не тое, казаў, здароўе — і ў яго, і ў машыны... А таму набор садовай мэблі яму — на зайздрасць суседзям — даставіў фотакарэспандэнт «Звязды» Анатоль Кляшчук. Ён жа зрабіў здымак з надзеяй, што ў гэтай вёсцы падпісчыкаў «Звязды» стане больш.

У людзей і сапраўды надзеі на людзей.

**Аддзел пісьмаў**

■

■ Сезон

# Шкоднае геройства

## Яшчэ ёсць час абараніцца ад грыпу з дапамогай прышчэпкі

**Сёлета больш сумленна падышлі да засцярогі ад грыпу і пачалі актыўна прышчэплівацца людзі ва ўзросце пасля 65. Раней гэта катэгорыя ўпіралася як магла: маўляў, нам нельга, у нас жа хранічныя захворванні! Між тым розныя паталогіі якраз служаць паказаннем для вакцынацыі. Іначай грып можа скончыцца ўскладненнямі або смяротным зыходам.**

Як адзначае **намеснік галоўнага ўрача Рэспубліканскага цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Ірына ГЛІНСКАЯ**, цікавасць да вакцынацыі супраць грыпу ўзрастае ў нас дзесьці ў студзені, а то і ў лютым, калі з'яўляюцца першыя выпадкі трагічных зыходаў у суседніх краінах. Тады нашы людзі пачынаюць патрабаваць вакцыну, аднак на той час яе, па-першае, не застаецца. Па-другое, для выпрацоўкі абароны патрабуецца каля 2-3 тыдняў. Калі ж вірус ужо актыўна цыркулюе, то можна сустрэцца з ім раней, чым дачакаешся аховы.

Толькі некаторыя еўрапейскія краіны паведамляюць аб адзінкавых выпадках грыпу. І гэта тыя штамы, што прадугледжаны вакцынамі. У Беларусі вірусы грыпу пакуль не выяўляюцца. Распаўсюджаны толькі негрыпозныя рэспіраторныя вірусы, прычым колькасць такіх выпадкаў нават меншая, чым на адпаведны перыяд мінулага года. 70 працэнтаў такой інфекцыі сустракаецца на бягучы момант у дзяцей.

— У старэйшай групе мы можам пачуць скаргі на галаўны і мышачны боль, слабасць, а вось дзеці да трох гадоў такімі сімптомамі з намі падзяліцца не могуць, таму трэба быць з імі асабліва ўважлівымі, — тлумачыць **асістэнт кафедры дзіцячых інфекцыйных захворванняў Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта Кацярына СЕРГІЕНКА.** — Заўсёды трэба звяртаць увагу і выклікаць урача, калі ёсць ліхаманка, высокая тэмпература, якая трымаецца звыш пяці сутак, не зніжаецца ні сама па сабе, ні з дапамогай лекаў. Або калі тэмпература, наадварот, ніжэйшая за 36,6. Павінны насцярожыць на фоне захворвання і цяжкасці з абуджэннем дзіцяці, дзённая санлівасць, працягглая кволасць, капрызнасць, задышка, ваніты, млосць ■



### Калі ёсць атлусценне або артрыт

Урачы рэкамендуюць не адмаўляцца ад прышчэпак усім асобам з атлусценнем, цяжарным (гэты стан сам па сабе з'яўляецца фізіялагічным імунадэфіцытам), наогул тым, у каго ёсць любыя захворванні, звязаныя з імунадэфіцытам, — напрыклад, рэўматоідны артрыт (калі хворы прымае імунасупрэсіўныя прэпараты), злаякасныя новаўтварэнні. Групу рызыкі складаюць і людзі з хранічнымі захворваннямі ніжніх дыхальных шляхоў — бранхіяльнай астмай, хранічнай абструктыўнай хваробай лёгкіх (новая назва бранхіту). Такія катэгорыі, у тым ліку малыя дзеці і, вядома, пажылыя, пераносяць грып вельмі цяжка. Бо маюць падставы для развіцця віруснай пнеўманіі, якая лечыцца цяжка і прыводзіць да працяглай шпіталізацыі, гібелі.

Калі нехта з гэтай катэгорыі раптам не прышчэпіцца (а такія, вядома, будуць), то ні ў якім разе ім не рэкамендуецца геройства. Разважаць на ўзроўні «а раптам заўтра пройдзе» — злачынна. Лепш падумаць: «трэба выклікаць урача на дом або падысці ў паліклініку», паколькі без кваліфікаванай меддапамогі не абысціся. Калі мы дрэнна сябе адчуваем, то перад тым, як сабрацца на працу, варта задумацца, што ў закрытых памяшканнях, кабінетах можна падвергнуць навакольных вялікай рызыцы заражэння.

У людзей з нармальным здароўем грып праходзіць за некалькі дзён. Важна толькі застацца ў ложку, забяспечыць сабе поўны спакой і цёплыя напоі, якія трэба піць не залпам, а глыткамі, пакрысе на працягу ўсяго дня.

### Акрамя прышчэпкі

Не абысціся нам без здаровага ладу жыцця. Калі нармальна ставімся да саміх сябе, значыць, будзем і добра харчавацца (каб атрымліваць з ежай або з дапамогай біялагічна актыўных дабавак карысныя рэчывы), добра спаць і атрымліваць станоўчыя эмоцыі. У час пад'ёму сезоннай захваральнасці могуць нам дапамагчы і імунатонікі — эхінацэя, жэньшэнь ды іншыя расліны, выкарыстанне якіх павышае жыццёвы тонус.

### Імунамадулятары? Не варта!

Толькі калі вам іх прызначыў урач. І зрабіць гэта ён павінен пасля таго, як вы зрабілі імунаграму. «Іначай гэта злачынства, што ведае кожны медык, — кажа **дацэнт кафедры інфекцыйных захворванняў БДМУ Юрый ГОРБІЧ.** — Не існуе імунастымулятара, які б уздзейнічаў абсалютна на кожнае звяно імуннай сістэмы. Асобны прэпарат працуе з пункту гледжання асобнага звяна. Аднак калі мы спрабуем іх прымяняць, выбіраючы па тым прынцыпе, што ўбачылі добрую рэкламу, спадабалася прыгожая ўпакоўка або параіла суседка, то рызыкуем трапіць пальцам у неба і пачаць стымуляцыю таго звяна, якое і так працавала нармальна. Арганізм уладкаваны так, што за кошт стымуляцыі таго, што і так працуе нармальна, можна дабіцца прыгнятання іншых звёнаў. Тое, што працавала не надта добра, пачне працаваць яшчэ горш».

■ Асаблівасці захворвання

# ЗАМУЧЫЎ ГЕРПЕС?

## Незадаволены чымсьці арганізм можа паведаміць нам пра гэта непрыемнымі пухірыкамі

**Вядома звыш сотні вірусаў герпесу, аднак найчасцей сустракаюцца вірусы першага і другога тыпаў. Вірусам простага герпесу (першага і другога тыпаў) інфіцыравана каля 90 працэнтаў насельніцтва, і дзесьці кожны чацвёрты-пяты дакладна ведае пра гэта, бо захворванне мае клінічныя праявы: на скуры або слізістых твару і палавых органаў з'яўляецца група пухірыкаў, якія праз некалькі дзён «падсыхаюць». У арганізм інфекцыя трапляе некалькімі шляхамі — палавым, паветрана-крапельным, праз плацэнту ад маці дзіцяці або падчас пералівання крыві. Вірус ужо ніколі не пакідае арганізм, але галоўнае, каб ён нас не турбаваў, не даваў клінічных праяў.**



Трэці тып віруса з'яўляецца ўзбуджальнікам ветраной воспы і апаясвальнага лішаю. Першае, як правіла, сустракаецца ў дзяцей, другое — у людзей сталых. Практычна ўсе, каму за 20, інфіцыраваны гэтым вірусам, які пашкоджвае нервы і выклікае іх запаленні. Праяўляецца трэці тып высыпкамі ў зоне міжрабрынных нерваў, на галаве, твары, канечнасцях.

— Важна атрымаць супрацьвірусную тэрапію ў першыя 48 гадзін, калі яна будзе найбольш эфектыўная, — кажа **загадчыца амбулаторна-дэрматавенералагічнага аддзялення №1 Мінскага гарадскога клінічнага скурна-венералагічнага дыспансера Мая НЯКРАСАВА.** — Калі інфекцыя не паспела знікнуць, як вярнулася зноў, для прафілактыкі новых эпізодаў у некаторых выпадках можа прымяняцца інактываваная герпетычная культуральная вакцына. Прышчэпка робіцца не раней як праз два тыдні пасля поўнага знікнення праяў інфекцыі. Разам з тым прызначаецца і вітамінатэрапія — антыаксідантны комплекс, біягенныя стымулятары для агульнага ўмацавання. Безумоўна, рэкамендуецца здаровы лад жыцця, рэжым сну, працы і адпачынку, а таксама харчаванне, багатае на гародніну і фрукты. Акрамя таго, неабходна заняцца лячэннем і ўсіх іншых хранічных захворванняў. Стрэс, пераахалоджванне, злоўжыванне алкаголем, дыеты — усё гэта будзе правакаваць рэцыдыў ■

- ✓ **Не траўмуйце пухірыкі.**
- ✓ **Адзенне — мяккае, не раздражняльнае.**
- ✓ **Дасканала мыйце рукі пасля таго, як дакрануліся да пашкоджанага ўчастка.**
- ✓ **Карыстайцеся індывідуальнымі прадметамі гігіены.**
- ✓ **Не дапускайце выпадковых палавых кантактаў, карыстайцеся прэзерватывам.**

■ Нагляд за дзецьмі

# ХАТНІЯ «ПАСТКІ»



**Бытавы траўматызм небяспечны тым, што нямала дзяцей застаюцца інвалідамі. Тут і ампутацыя канечнасцяў, і страта зроку, траўмы мозга...**

Пашкоджанне фалангаў пальцаў адбываецца пры іх неасцярожнасці з вокнамі, дзвярыма, у тым ліку аўтамабільнымі. Вочы могуць пашкоджвацца падчас выбухаў, неасцярожным абыходжаннем з вострымі прыладамі, пры ўдарах падчас заняткаў спортам. Асаблівая ўвага — да страсення галаўнога мозга, наступствы якога могуць нагадаць пра сябе праз шмат гадоў.

У першую чаргу ў полі зроку дарослых павінны быць дзеці першых шасці гадоў жыцця. Менш за ўсё траўмаў у дзяцей першага году жыцця, затое ў групе ад 3 да 6 траўматызм пачашчаецца ў тры разы. А максімальны ўзровень адзначаецца ў дзяцей... другога году жыцця. Хлопчыкі атрымліваюць пашкоджанні ў 1,5 раза часцей за дзяўчынак.

На адну вулічную траўму прыпадае прыкладна дзве бытавыя. У дзяцей першага году жыцця наогул звыш 95 працэнтаў траўмаў адбываюцца менавіта дома. Гэта сведчыць пра тое, што многія бацькі не надаюць значэння прынцыпам стварэння бяспечнага дома.

— Самымі частымі бытавымі траўмамі застаюцца ўдары, драпіны, раны, вывіхі, пераломы і страсенні мозгу, якія звязаны з падзеннем з вышыні, хоць атрымаць цяжкае пашкоджанне можна і пры падзенні на роўным месцы, — адзначае **урач-педыятр 3-й гарадской дзіцячай клінічнай паліклінікі Мінска Зоя ПОЛЯК.** — Пакутуюць дзеці і ад апёкаў, прычым адзін з дзесяці заканчваецца апераацыяй. Гэта праблема ў першую чаргу тых, каму 4-5 гадоў. Зусім малыя часцей пакутуюць ад перакульвання на сябе гарачых страў, калі застаюцца адны за сталом. У адным з пяці выпадкаў апёкі дзецям «забяспечваюць» самі дарослыя. Бывае, што матулі замяняюць прагулку на свежым паветры «праветрываннем» малога на балконе або лоджыі, куды можа трапіць акурак, кінуты зверху. Небяспечныя і пашкоджанні электратокам, што выклікае не толькі апёкі, але і спыненне сэрца, дыхання, што патрабуе тэрміновага правядзення рэанімацыйных дзеянняў. Вядома, што дзеці нярэдка пашкоджваюцца токам, калі даследуюць электразеткі любімі падручнымі сродкамі. Могуць пацярпець і ад дотыку да металічных батарэй, якія знаходзяцца пад напружаннем, калі некаторыя бацькі праводзяць небяспечныя эксперыменты з мэтай «эканоміі» электраэнергіі ■

### ЯК НЕ ДАПУСЦІЦЬ БЫТАВОЙ ТРАЎМЫ?

**1.** У жылым памяшканні неабходна ўдзяліць увагу тэхніцы бяспекі.

Закрыйце разеткі, захоўвайце бытавую хімію ў недаступных месцах, прыбярыце з вачэй дробныя і буйныя рэчы, якія могуць траўмаваць, якія можна з'есці, разбіць, перакуліць на сябе.

**2.** Пастаянна наглядайце за малымі, у тым ліку падчас правядзення розных работ па гаспадарцы. Акрамя таго, неабходна забяспечыць ім цікавыя заняткі — гуляць з імі паболей, а «вісець» на тэлефоне паменей.

**3.** Ніхто лепш за бацькоў не растлумачыць, як трэба сябе паводзіць, дзе і навошта прайўляць разумную асцярожнасць. Ні ў якім разе нельга запалохваць: нічога добрага ў тым, калі дзіця будзе ўсяго баяцца. Аднак засцерагаць, папярэджваць, прывучаць думаць і клапаціцца пра сябе і іншых — вельмі важна.

Матэрыялы падрыхтавала
**Святлана БАРЫСЕНКА.** protas@zviazda.by

**ООО «Центр Белинвентаризация»**
**г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2-1**

- ✓ **Раздел и установление порядка пользования земельным участком**
- ✓ **Раздел и вычленение изолированных помещений из капитального строения**
- ✓ **Пересчет долей в связи с изменением капитального строения**
- ✓ **Оценка всех видов собственности**

## Извещает о проведении аукциона по продаже имущества ОАО «ДОРОЖНО-СТРОИТЕЛЬНЫЙ ТРЕСТ №2, Г. ГОМЕЛЬ» 8 (0232) 33 84 69

| № лота | Наименование объекта | Начальная цена лота, бел. руб. с НДС | Сумма задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| 1 | – Капитальное строение (котельная АБЗ) с инв. №343/С-78629, площадью 143,5 кв. м (составные части и принадлежности: кирпичная пристройка). – Капитальное строение (весовая АБЗ) с инв. №343/С-78625, площадью 21,9 кв. м (составные части и принадлежности: кирпичный навес). – Капитальное строение (производственно-бытовой корпус) с инв. № 343/С-78628, площадью 634,9 кв. м (составные части и принадлежности: кирпичная пристройка). – Капитальное строение (повышенный тупик) с инв. №343/С-78627, протяженностью 424,9 м (составные части и принадлежности: участок ж/д пути, повышенный путь). – Капитальное строение (железнодорожный тупик) с инв. №343/С-78626, протяженностью 773,2 м. – Капитальное строение (артскважина АБЗ) с инв. №343/С-79504 (составные части и принадлежности: водонапорная башня). – Капитальное строение (автодорожный подъезд к АБЗ) с инв. №343/С-79525, протяженностью 328,8 м. – Капитальное строение (ЛЭП 10 квт) с инв. №343/С-79524, протяженностью 211,5 м. *Объекты расположены по адресу: Гомельская обл., Хойникский р-н, Р-33, 57-й км. Объекты расположены на земельном участке с кадастровым номером 325400000001001321 площадью 6,5470 га* | **60 815,29** | **6 081,53** |

| | |
|---|---|
| Срок подачи заявления | **По 26 декабря 2017 г**. в рабочие дни с 9.00 до 16.00 от даты опубликования настоящего извещения по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2-1 |
| Дата, время, место проведения аукциона | **27 декабря 2017 г. в 11.00** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2-1 |
| Номер р/с для перечисления задатка | Р/с BY71BPSB30121783390109330000 в РД №300 ОАО «БПС-Сбербанк», БИК BPSBBY2X, УНП 491323266. Получатель платежа: ООО «Центр Белинвентаризация». Назначение платежа: задаток на участие в аукционе согласно извещению в газете «Звязда» от 25.11.2017 г. |
| Условия продажи | Объекты продаются в собственность. Шаг аукционных торгов – 5%, заключить договор купли-продажи в течение 20 календарных дней после подписания протокола о результатах аукциона. Оплатить стоимость объекта, сформированную на аукционе, в течение 20 календарных дней с момента подписания договора купли-продажи. Победитель возмещает затраты на организацию и проведение аукциона. |

Дополнительная информация на сайте www.bti-gomel.by, по тел.: (0232) 75 06 62, (029) 341 15 45

Для участия в аукционе необходимо предоставить:
1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме и подписанное соглашение о правах и обязанностях с ООО «Центр Белинвентаризация».
2. Заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка на расчетный счет организатора торгов.
3. Юридическим лицам – резидентам Республики Беларусь – копию документа, подтверждающего регистрацию юридического лица; представителю юридического лица – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица).
4. Юридическим лицам – нерезидентам Республики Беларусь – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе); представителю юридического лица – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица).
5. Индивидуальным предпринимателям – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию; представителю индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица).
6. Физическим лицам – представителю физического лица – доверенность (документ, подтверждающий полномочия лица) и документ, удостоверяющий личность данного представителя.
7. При подаче документов на участие в аукционе физические лица, представители физических и юридических лиц предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.
8. Участник аукциона, выигравший торги, либо лицо, признанное покупателем, оплачивает стоимость затрат на организацию и проведение аукционных торгов – Организатору аукционных торгов.
9. Аукцион проводится в соответствии с действующим законодательством и Положением ООО «Центр Белинвентаризация».

## Коммунальное унитарное предприятие «МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ ЦЕНТР НЕДВИЖИМОСТИ» 28 декабря 2017 г. проводит открытый аукцион с условиями № 13-У-17 на право проектирования и строительства капитальных строений (зданий, сооружений)

**Вид аукциона:** открытый (на повышение начальной цены).
**Предмет аукциона:** право проектирования и строительства капитальных строений (зданий, сооружений) на предоставляемом земельном участке, на котором находятся объекты, подлежащие сносу.
Аукцион проводится в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 №462.
На торги выставляется право проектирования и строительства капитальных строений (зданий, сооружений) на одном земельном участке в г. Минске, предоставляемых в аренду сроком на 5 лет:

| № предмета аукциона | Месторасположение земельного участка | Площадь земельного участка, га | Целевое назначение земельного участка | Начальная цена предмета аукциона, рублей | Сумма задатка, рублей | Расходы на подготовку документации для проведения аукциона, рублей | Наличие обременений | Ориентировочный размер убытков, причиняемых изъятием земельного участка и сносом расположенных на нем объектов недвижимости, рублей |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 |
| 1 | г. Минск, ул. Тимирязева | 15, 12 | для строительства объекта «Жилой комплекс с объектами социально-общественного назначения по ул. Тимирязева» | 5 772 663,20 | 850 000,00 | 14 260,54 | Снос существующих сооружений и конструкций, находящихся в границах участка | В денежном выражении отсутствует |

Основные требования по проектированию и строительству объекта и условия предоставления земельного участка указаны в земельно-кадастровой и иной документации, подготовленной для проведения аукциона.

Сведения о наличии инженерных коммуникаций на указанных земельных участках и их характеристики содержатся на планово-картографических материалах в составе земельно-кадастровой документации.

Инженерное развитие инфраструктуры застраиваемой территории участков осуществляется в соответствии с техническими условиями на инженерно-техническое обеспечение соответствующего объекта, выданными эксплуатирующими и согласующими организациями (согласно перечню, установленному Минским горисполкомом).

Аукцион состоится **28 декабря 2017 года в 11. 00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов.

Участниками аукциона могут быть юридические лица или индивидуальные предприниматели. В аукционе допускается участие на стороне покупателя консолидированных участников – двух и более индивидуальных предпринимателей, юридических лиц.

**Для участия в аукционе необходимо:**

**внести задаток не позднее 26 декабря 2017 г.** в размере, указанном в графе 6 таблицы, перечисляемый на расчетный счет №BY18AKBB36410000000160000000 в ОАО «АСБ Беларусбанк», БИК AKBBBY2X, УНП – 101530339, назначение платежа – 04002, получатель – главное финансовое управление Мингорисполкома;

**представить в коммунальное унитарное предприятие «Минский городской центр недвижимости» (организатору аукциона) следующие документы:**

заявление на участие в аукционе;

документ, подтверждающий внесение суммы задатка, с отметкой банка;

подписанное соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах) установленной формы, включающее обязательство по уплате в соответствии с законодательством штрафных санкций и иные требования;

**дополнительно представляются:**

индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования;

представителем индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность;

представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии устава и свидетельства о государственной регистрации юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;

представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык;

консолидированными участниками для участия в аукционе представляются также оригинал и копия договора о совместном участии в аукционе.

При подаче документов на участие в аукционе представители индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

При подаче документов уполномоченное лицо, которое будет представлять на аукционе стороны договора о совместном участии в аукционе и подписывать протокол о результатах аукциона (его представитель), предъявляет документ, удостоверяющий личность, и доверенности, выданные индивидуальными предпринимателями, юридическими лицами, заключившими договор о совместном участии в аукционе. Представителем уполномоченного лица дополнительно предъявляется доверенность, выданная в установленном законодательством порядке, либо документ, подтверждающий полномочия должностного лица.

**Прием документов, консультации по вопросам участия в аукционе и ознакомление с имеющейся документацией осуществляются по адресу:**

**г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. №6, с 4 декабря 2017 г. по 26 декабря 2017 г. включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 18.00 (по пятницам до 16.45).**

Торги в отношении земельных участков проводятся при условии наличия двух или более участников. Победителем торгов признается участник, предложивший наиболее высокую цену.

Если заявление на участие в аукционе подано только одним участником, аукцион признается несостоявшимся, и земельный участок предоставляется такому лицу при его согласии с внесением платы за право заключения договора аренды земельного участка в размере начальной цены предмета аукциона, увеличенной на 5 процентов.

Победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукциона* в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона обязан:

– внести плату за право заключения договора аренды земельного участка (часть платы – в случае предоставления Минским горисполкомом рассрочки ее внесения);

– возместить Минскому горисполкому расходы по подготовке документации для проведения аукциона;

– возместить организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в т. ч. расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения. **Информация о данных затратах, порядке их возмещения доводится до сведения участников аукциона до его начала при заключительной регистрации под роспись и оплачивается по предоставляемому организатором аукциона счету-фактуре;**

*единственному участнику несостоявшегося аукциона – выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии и предоставлении земельного участка в аренду.

Оплата стоимости за право заключения договора аренды земельного участка осуществляется по безналичному расчету за белорусские рубли. По заявлению победителя аукциона либо единственного участника несостоявшегося аукциона Минский горисполком предоставляет рассрочку внесения платы за право заключения договора аренды земельного участка.

После внесения платы за право заключения договора аренды земельного участка (часть платы – в случае предоставления Минским горисполкомом рассрочки ее внесения) Минский горисполком заключает с победителем аукциона либо единственным участником несостоявшегося аукциона договор на реализацию права проектирования и строительства капитальных строений (зданий, сооружений).

Всем желающим предоставляется возможность ознакомления с землеустроительной и градостроительной документацией по земельным участкам (в том числе с характеристиками расположенных на земельных участках инженерных коммуникаций и сооружений (при их наличии) и условиями инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории). Осмотр земельных участков на местности производится желающими самостоятельно в удобное для них время.

**Контактный телефон + 375 (17) 226-16-72, официальный сайт организатора аукциона: www.mgcn.by.**

## РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего РУП «Белпочта»

**Лот №1.** Почтовый вагон 61-514 (инв. №40983). Г. в. – 1980. Тип и назначение вагона – почта. **Начальная цена, с НДС 20% – 5 185,46 бел. руб. Задаток – 500,00 бел. руб.**

**Лот №2.** Почтовый вагон №740 (инв. №1340587). Г. в. – 1977. Тип и назначение вагона – почта. **Начальная цена, с НДС 20% – 2 447,36 бел. руб. Задаток – 240,00 бел. руб.**

**Лот №3.** Почтовый вагон (инв. №1341254). Г. в. – 1982. Тип и назначение вагона – багаж. **Начальная цена, с НДС 20% – 2 398,55 бел. руб. Задаток – 230,00 бел. руб.**

Местонахождение объектов: г. Минск, ул. Вокзальная, 22

УСЛОВИЯ

1. Победитель аукциона либо в случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в аукционе подано только одним участником и он согласен приобрести Объект (Объекты) по начальной цене, увеличенной на 5% (пять процентов), – Претендент на покупку, должен заключить с Продавцом договор купли-продажи Объекта (Объектов) в течение 10 (десяти) рабочих дней с назначенной даты проведения аукциона.
2. Условия оплаты приобретенного на аукционе Объекта (Объектов) согласовываются Победителем аукциона (Претендентом на покупку) и Продавцом при подписании договора купли-продажи.
3. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона на основании счета-фактуры в течение 3 (трех) банковских дней с момента подписания протокола о результатах аукциона. Информация о размере затрат доводится до сведения участников перед началом аукциона.
4. На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для Победителя аукциона

**Аукцион состоится 26.12.2017 г. в 14.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4. Шаг аукциона – 10%**

Порядок оформления участия в аукционе содержится на сайте Организатора аукциона ino.by.

**Продавец:** РУП «Белпочта», 220050, г. Минск, пр-т Независимости, 10, т. +375 (17) 293 59 10.

**Организатор аукциона:** РУП «Институт недвижимости и оценки» 220030, г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, пом. 9, тел. 8 (017) 306-00-57.

Задаток перечисляется на р/с BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», BIC банка BPSBBY2X, 220004, г. Минск, ул. Кальварийская, д. 4а. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже имущества (Лот №__), принадлежащего РУП «Белпочта», проводимом 26 декабря 2017 г.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 12.00, с 13.30 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 7. **Окончание приема заявлений:** 21.12.2017 в 11.00.

Участник, желающий участвовать в аукционе в отношении нескольких лотов, вносит задатки в размере, установленном для каждого из лотов.

Все желающие могут предварительно ознакомиться с Объектами. Контактное лицо для осмотра Объектов: Лысенко Наталья Павловна +375-17-222-71-76 с 9.00 по 17.00.

Организатор аукциона или Продавец вправе снять Лоты с торгов до объявления их проданными без объяснения причин снятия

**Организатор аукциона: 8 (017) 306-00-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52 • www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**

## Открытое акционерное общество «Строительный трест №4» сообщает о проведении внеочередного собрания акционеров ОАО «Стройтрест №4»

Собрание состоится 5 декабря 2017 года в 16.00 по адресу:
г. Минск, ул. Коммунистическая,17, актовый зал.
Повестка дня:
1. О внесении изменений в Устав ОАО «Стройтрест №4».

Регистрация участников собрания проводится с 15.00 до 15.45 по предъявлении паспорта, а представителей акционеров – по предъявлении паспорта и доверенности.

Списки акционеров ОАО «Стройтрест №4» для регистрации участников собрания будут составлены по данным реестра акционеров на 27.11.2017.

Время и место ознакомления акционеров с материалами по вопросам повестки дня собрания: с 27.11.2017 г. по 04.12.2017 г. в рабочие дни с 9.00 до 17.00, перерыв с 13.00 до 15.00 по адресу: г. Минск, ул. Коммунистическая, 17, 3-й этаж (кабинет 302), в день проведения собрания – с 9.00 до 14.30 по месту его проведения.

Справки по тел. в г. Минске: 334-31-51.

УНП 100055368

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА
## Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» сообщает о проведении повторных торгов в виде открытого аукциона по продаже недвижимого имущества, принадлежащего ОАО «Могилевоблавтотранс»

Лот №1. **Капитальное строение с инв. №700/С-9514 – Производственно-бытовой корпус,** расположенное по адресу: г. Могилев, ул. Челюскинцев, 172Д, площадь – 404 кв. м, с входящим в его состав асфальтобетонным покрытием площадью 772,7 кв. м.
***Начальная цена продажи: 161 040,00 белорусских рублей с учетом НДС***

Лот №3. **Капитальное строение с инв. №700/С-9523 – Производственная мастерская,** расположенное по адресу: г. Могилев, ул. Челюскинцев, 172/2, площадь – 855,1 кв. м, с входящим в его состав асфальтобетонным покрытием площадью 2225,8 кв. м.
***Начальная цена продажи: 184 440,00 белорусских рублей с учетом НДС***

Лот №4. **Капитальное строение с инв. №700/С-9525 – Аккумуляторное отделение,** расположенное по адресу: г. Могилев, ул. Челюскинцев, 172/5, площадь – 143,5 кв. м; с входящим в его состав асфальтобетонным покрытием площадью 794,9 кв. м.
***Начальная цена продажи: 36 960,00 белорусских рублей с учетом НДС***

Лот №5. **Капитальное строение с инв. №700/С-9526 – Шиномонтажное отделение,** расположенное по адресу: г.Могилев, ул. Челюскинцев, 172/4, площадь – 391,6 кв. м; с входящим в его состав асфальтобетонным покрытием площадью 1556,9 кв. м.
***Начальная цена продажи: 101 280,00 белорусских рублей с учетом НДС***

| | |
|---|---|
| **Продавец** | ОАО «Могилевоблавтотранс», УНП 700167884, г. Могилев, ш. Гомельское, 1 |
| **Расчетный счет для перечисления задатка** | Получатель платежа – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182, р/с BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, BIC банка BPSBBY2X |
| **Дата, время и место проведения аукциона** | **Аукцион проводится 14 декабря 2017 года в 12.00** по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352, офис Могилевского филиала РУП «Институт недвижимости и оценки». Последний день подачи заявок и внесения задатка: 13 декабря 2017 года до 15.00 |
| **Срок и условия оплаты приобретенного с аукциона имущества** | В течение 5 рабочих дней со дня подписания протокола о результатах аукциона с победителем заключается договор купли-продажи. Оплата производится на условиях заключенного договора купли-продажи |

Информация о предыдущем аукционе была размещена в номере газеты «Звязда» 16.09.2017

**Дополнительную информацию можно получить по тел.: (8 0222) 72-41-14, 8 029 624-26-25, 8 044 738-18-99**

■ Прэм'ера

# ГУЛЬНЯ Ў ТЭАТР: НЕБЯСПЕЧНА ДЛЯ ЖЫЦЦЯ

## ЯКАЯ ПТУШКА МОЖА ПРАДВЯШЧАЦЬ БЯДУ?

**Аматар тэатра адкажа адразу: гэта чайка. Вытанчаная птушка, за палётам якой так прыемна назіраць. А як пранізліва могуць крычаць чайкі — людзі, здаецца, разумеюць, пра што. А некаторыя — што прэтэндуюць на асабліва высокі палёт — можа, і хацелі б у пэўныя хвіліны вось так жа адчайна ўголас пракрычаць свой боль. Але ж так... не прынята. Трэба навучыцца жыць па правілах, любіць — па правілах, кахаць — таксама. Іграць — па правілах. Нават у тэатры...**

Косця Траплёў гуляе ў тэатр. Сын знакамітай мамы-актрысы таксама хоча самавыяўляцца, ствараць шэдэўры, шукаць «новыя формы». На лецішчы, напрыклад, у яго ёсць вельмі патрабавальная публіка, для якой ён разыгрывае свой спектакль разам з Нінай Зарэчнай. І чаму гэта не можа быць спектакль лялечны, пастаўлены ў «Дачным тэатры Канстанціна Траплёва»? І гэта тэатр: з падмосткамі, з лялькамі, якія жывуць у адмысловым куфры, але выступаюць на свежым паветры, у дэкарацыях з сапраўднага чароту, вывы галінак якога так эфектна ўводзяць у свет вытанчаных істот. Такіх як Аркадзіна і яе блізкія. Потым гэты чарот будзе на карціне, што нібыта вісіць на сцяне (наогул тут шмат удалых знаходак у мастацкім афармленні, над чым папрацавала мастак Ларыса Мікіна-Прабадзяк). Удалося стварыць свет багемы, якой патрэбная гульня вобразаў (у тым ліку гульня ў тэатр), нават у рэальным жыцці...

«Чэхаў. Чайка» Гродзенскага абласнога тэатра лялек можна было б лічыць спектаклем, створаным паводле правіл: не проста ж так рэжысёр-пастаноўшчык Алег Жугжда паставіў у назве свайго спектакля імя аўтара на першае месца. І менавіта ж сам Чэхаў сапраўды задаў у гэтай п'есе адну з чароўных тэатральных загадак, якую спрабуюць разгадаць цягам 120 гадоў розныя рэжысёры. Кожны імкнецца не проста агучыць на сцэне чэхаўскі тэкст, а даць сваё адчуванне таго, што адбылося паміж героямі. Урэшце: што меў на ўвазе Антон Паўлавіч, калі распавядаў гэтую драматычную гісторыю, ды яшчэ называў яе камедыяй? Дзе тут трэба смяяцца?

Свае варыянты дзе (і ці трэба наогул) апошнім часам прадэманстравалі розныя рэжысёры ў самых знакавых тэатрах Беларусі. Адзін з іх — Гродзенскі абласны тэатр лялек: тут ёсць свой погляд на ўсё. Таму калі чарада «Чаек» пранеслася па тэатрах нашай краіны, то варта было чакаць: адна павінна прызямліцца ў Гродне, дзе абавязкова прапануюць сваю версію падзей. Яна тут ёсць, і нават не столькі ў арыгінальным вырашэнні — праз тэатр Траплёва. У Алега Жугжды ёсць сваё тлумачэнне: што забівае Косцю?



Інфантыльны малады чалавек нібыта нічога не варты як творчая асоба. У мамы ёсць ужо пад бокам адзін кумір, гэта месца занятае Трыгорыным. Прэтэндаваць не варта, дае зразумець яна — зорка, асоба, вартая кампліментаў і кахання, якая пільна сочыць за сваім унутраным напаўненнем і знешнім яго выяўленнем (гледзячы на актрысу Ларысу Мікуліч у ролі Аркадзінай, між іншым, разумееш, што для Чэхава магло быць камедыяй у гэтай гісторыі). Ды наогул тут ёсць шмат дэталяў-знаходак, якія прымушаюць усміхнуцца, зробленых з тонкай ironіяй, па-мастацку. Нават тое, як людзі ўзаемадзейнічаюць з лялькамі Траплёва, такімі мініяцюрнымі-мініяцюрнымі, што на іх фоне людзі — проста нейкія гіганты, можа, таму іх і не хочацца шкадаваць нават у складаныя моманты. Ці калі гэтыя людзі паводзяць сябе проста як пачвары: а яны могуць, гаворыць нам рэжысёр на самым пачатку. Калі чарада чаек праносіцца над сцэнай, стрэлы ўводзяць ад пастаральнага кантэксту ў бок паляўнічага. Нехта, хто жыве сярод гэтых людзей, павінен стаць ахвярай. І гэта будуць не лялькі (своеасаблівае альтэр-эга герояў). Асноўныя персанажы — артысты-людзі, у іх герояў верыш, бо такіх багата і ў наш час. Вось чаму «Чайка» не страчвае актуальнасці і прымушае разважаць: хто ў ёй сапраўдная ахвяра. У нейкі момант, падаецца, лялькі цалкам саступаюць сцэну людзям: тэатр жыцця аказваецца больш жорсткі.

Ахвярай у жорсткім свеце можа выглядаць, бясспрэчна, Ніна. Прынамсі, паводле таго, што з ёю здараецца пасля, калі дзяўчына ўжо прымерыла на сябе вобраз актрысы. Няшчасная!.. Трэба было б яе пашкадаваць: не ўгадала, не з тым звязалася, кінуў з дзіцем, малое памерла, вялікай кар'еры не здарылася, гіне ў правінцыйным тэатры. Але Ніну (ролю выконвае актрыса Таццяна Еўтух) з Гродна чамусьці не шкада. Куды глядзела? Чаго хацела? На што спакусілася? Не шчасця шукала — кар'еры. Вось і вынік. Хіба што разумееш, наколькі ёй балюча, калі яна крычыць крыкам, як падбітая чайка... З-за няспраўджанага кахання. З-за таго, што не кахаюць яе. Сярод мноства персанажаў гэтага спектакля «некаханне» перадаецца ад аднаго героя да другога і далей, па ланцугу. Некаханне Аркадзінай і Трыгорына вядзе да трагедыі Ніны: у ёй бачаць маладую Аркадзіну, і ўсяго толькі. А яе некаханне б'е па Канстанціне. Яму больш складана: у яго бок «страляе» яшчэ і яўная нелюбоў маці. Але куды яму збегчы? Вось пытанне, адказ на якое акрэслены ў рэжысёра Алега Жугжды. Ён выбраў для сябе галоўнага героя, закруціў дзею вакол яго.

Гэта не Аркадзіна (якую яўна не кахаюць, але карыстаюцца яе вядомасцю), нават не Ніна, гісторыя хоць і кранальная, але зразумелая да банальнасці, што ў нейкім сэнсе таксама ўспрымаецца камедыйна, асабліва ў наш час. Мяккі Косця (акцёр Аляксандр Рацько) нібыта на другім плане, за сваімі любімымі жанчынамі. Для абодвух недастаткова яркі, недастаткова таленавіты. Адпаведна, недастаткова цікавы. Тое, чаго хоча ён, агучваецца. Але ціха і ненавязліва. Не чуюць. Нават калі ён шукае іншую мову — не словамі, а дзеяннямі, — не вераць. А вось пра тое, што кахання няма, можа сказаць больш рэзка і гучна, ці сказаць пра каханне да іншага. І тады зразумела, што будучыні няма.

У пабытовасці, мітусні, уласным імкненні выжыць не проста разглядзець іншага чалавека, сфакусіравацца на ім. Ці калі заняты высокім мастацтвам, выключнымі мэтамі служэння муз — людзі недзе ўнізе. Нават блізкія, яны сапраўды як лялькі, з якімі можна пагуляць у вольны ад высокіх спраў час. А потым шчыра не разумець: чаму сын не змог разабрацца з жыццём. Такі ён маленькі і несамастойны, як тая лялька. Што там з ёй зноў здарылася?..

І чаму так адчайна крычаць чайкі?

**Ларыса ЦІМОШЫК.** *tsimoshyk@zviazda.by*

■ Выстава

# РЭАЛЬНАСЦЬ СНОЎ

## у работах мастачкі Наталлі Залознай



**Сёлета родны горад сустрэў Наталлю Залозную з серыяй карцін «Уцёкі», якую экспануюць у галерэі «A&V». Падчас адкрыцця выстаўкі мастачка, імя якой добра ведаюць у Еўропе, атрымлівала кветкі і віншаванні і раздавала аўтографы. Беларусы шчыра радаваліся сустрэчы: Наталля Залозная шмат гадоў пражыла ў Бельгіі, але не парывала сувязі з радзімай.**

Выстаўка «Уцёкі» ўпершыню была прэзентаваная ў Маскве. Работы змясцілі ў галерэі *«11.12 GALLERY»*, дзе ў 2014 годзе дэманстравалі папярэднюю серыю карцін Залознай *«Present Continuous»*. У работах серыі мастачка разглядала прыроду часу, непаўторнасць кожнага імгнення, пазбаўленага ілюзорнага ўяўлення пра мінулае і будучыню. У некаторым сэнсе «Уцёкі» працягваюць развіццё канцэпцыі *«Present Continuous»*: калі раней карціны спрабавалі вызваліцца ад часу, які цісне чалавека з усіх бакоў, то цяпер з'явілася спроба адкінуць абставіны, што абмуроўваюць чалавечы лёс.

Што ж ёсць «Уцёкі»? У першую чаргу — даследаванне межаў унутранай свабоды. Асобе цяжка вытрымліваць ціск асяроддзя, асабліва калі развіццё гісторыі адбываецца незалежна ад волі і жадання людзей, якія вымушаны падпарадкоўвацца абставінам. Але ад рэчаіснасці можна ўцячы, схавацца ў сваім унутраным свеце. «Уцёкі» — гэта серыя партрэтаў, героі якіх спяць, бо ў марах чалавек заўсёды свабодны. Цікава, што палотны не даюць адказу на тое, што прыходзіць у снах да герояў серыі. Унутраны свет намаляваных людзей застаецца прыватным, глядач не можа пранікнуць у зону асабістага: героям насамрэч удалося ад усяго «ўцячы».

Нягледзячы на тое, што акрылавыя партрэты серыі досыць фатаграфічныя, вывы людзей на іх пазбаўлены індывідуальнасці. Яны падпарадкоўваюцца галоўнай ідэі выстаўкі, таму страчваюць асабістыя рысы ў кантэксце цэлага, каб данесці задуму да гледача. Напэўна, гэта і ёсць ключ да разумення поспеху Наталлі Залознай: на мове жывапісу ўзнімаць складаныя пытанні, актуальныя для кожнай асобы. Не так істотна, бачыць работы мастачкі беларускі глядач або еўрапейскі: карціны, якія дазваляюць не толькі глядзець, але і разважаць, будуць запатрабаваныя ў любой краіне.

Як запатрабаваныя былі выстаўкі мастачкі ў Расіі, Чарнагорыі, Бельгіі, Нідэрландах, Францыі, Швейцарыі, Германіі, Англіі, Аўстрыі, ЗША... Імя Наталлі Залознай (дачкі вядомага беларускага творцы) — ужо брэнд, вядомы ў свеце. Яе работы захоўваюцца ў Нацыянальным мастацкім музеі Беларусі, Дзяржаўнай Траццякоўскай галерэі ў Маскве, збіраюцца прыватнымі калекцыянерамі з розных краін.

**Дар'я ЧАРНЯЎСКАЯ**

■ Кінакрокі

# ГЭТА НЕ «МЫ»

## Альманах маладых рэжысёраў нацыянальнай кінастудыі: чаго чакаць?

**«Беларусьфільм» загаварыў пра зборнік кароткаметражак маладых рэжысёраў яшчэ тады, калі гэта было толькі ідэяй, хаця ўжо стала звычайным пра новую стужку кінастудыі даведвацца толькі з нагоды яе выхаду ў пракат. Дырэктар кінастудыі Ігар Поршнеў згадваў будучы альманах пры кожнай магчымасці, і гэта сапраўды гучала цікава ў свеце рэпутацыі «Беларусьфільма» як бюракратызаванага паглынальніка бюджэтных сродкаў, які стварае хіба што фільмы пра вайну, серыялы і няўдалыя баевікі. А тут — праца адразу для некалькіх дэбютантаў, магчымасць для рэжысёраў-пачаткоўцаў папрацаваць на вялікай «кінафабрыцы» і сам факт цікавасці да маладога погляду. Нарэшце ідэя эвалюцыянавала да паказу на вялікім экране — гатовы альманах «Мы», які складаецца з пяці навел, быў упершыню прадстаўлены публіцы на кінафестывалі «Лістапад».**


«Падарунак Санта-Клауса».

Праўда, на справе альманах не тое каб складаецца з дэбютаў, хіба што з дэбютаў менавіта ў ігравым кіно. Яўген Сяцько, які зняў навелу «Падарунак Санта-Клауса», — даўно не навічок у беларускім кінематографе і ў прыватнасці на «Беларусьфільме». Аўтарка кароткаметражкі «Спадарожнік» Настасся Мірашнічэнка — ужо знаная дакументалістка, якая ў гэтыя дні паказвае свой новы фільм на найпрэстыжнейшым фестывалі дакументальнага кіно IDFA ў Амстэрдаме. Атрымліваецца, якой-ніякой вартай прыступкай удзел у працы над альманахам стаў толькі для трох рэжысёраў з пяці. Гэта, канешне, сумна, бо паказвае на тое, што на конкурсе праектаў — а для альманаха рэжысёры з іх ідэямі адбіраліся падчас адмысловых сустрэч сяброў камісіі — ад у поўным сэнсе слова дэбютантаў не хапіла вартых сцэнарыяў.

**Я ўсё яшчэ не разумею, што ў гэтым прынцыпова новага і важнага для «Беларусьфільма», апроч таго, што некаторыя навелы маніпулююць флешбэкамі і мастацкімі кінасродкамі.**

Але і з тых сцэнарыяў, якія камісія ў выніку адабрала, таксама не кожны назавеш «вартым». Мне складана патлумачыць, як зборнік дэбютаў у 2017 годзе пачынае няўцямная для сучаснага кантэксту агітка са звышнатуральнай наіўнасцю, знешнім «глянцам» і начытваннем акцёрамі штампаваных фраз. Як сюжэт, у якім рамантызаваны беларус з яго дранікамі параўноўваецца з увасобленым у камічным вобразе немцам, можа ўспрымацца ўсур'ёз, і як гэта трапляе на экран? Чаму сталыя традыцыі савецкага агітмастацтва адраджаюцца ў сучасным свеце, дзе пануюць каштоўнасці талерантнасці і карэктнасці? Альманах пачынаецца з навелы Яўгена Сяцько «Падарунак Санта-Клауса» — на мой погляд, не проста недарэчнай, але нават ганебнай.

Немец на беларускім чыгуначным вакзале, сустрэўшы сваю знаёмую, свядома пакідае чамадан, які ў выніку крадзе малады беларус. Унутры чамадана аказваецца дзяўчына з Масквы, якая спадзявалася з'ехаць з каханым немцам на яго радзіму. Зразумела, што пакуль героі спрабуюць усё разруліць, у дзяўчыны нарадажаецца пачуццё да беларуса, і яна кідае свайго немца, закрыўшы яго ў чамадане. І гэта нават не спойлер, таму што канцоўка становіцца зразумелай ад самага пачатку.

З такім лубачным падыходам дысануе кароткаметражка Настассі Мірашнічэнка «Спадарожнік», дзе прысутнічаюць псіхалагізм, звышнатуральнасць і кінематаграфічная эфектнасць. Малады чалавек едзе ў цягніку на пахаванне бацькі і свайму спадарожніку кажа, быццам едзе перакананца, што бацька (а ён у свой час кінуў іх з маці) «падох». У спадарожніка ёсць свая гісторыя, якая для аповеду галоўнага героя становіцца часткай пазла...


«Лялька».

У параўнанні з папярэдняй навелай, што з'яўляецца пэўным знакам мыслення мінулага стагоддзя, «Спадарожнік» добра карэлюецца з сучаснай талерантнасцю, прырода якой — у адмаўленні катэгарычнасці. Гісторыя якраз сцвярджае, што мараль любога кшталту чалавечых учынкаў не бывае адназначная. Да таго ж свой фільм аўтарка аздобіла лейтматывам, флешбэкамі і візуальнай прыгажосцю, што не менш іграе на карысць шаблоннай гісторыі.

Мне складана казаць пра навелу «Дыялог» Надзеі Абрамчук, якая не атрымалася ні драматургічна, ні кінематаграфічна, як складана сказаць, наколькі рэжысёры альманаха ў агромністай сістэме кінастудыі пачувалі сябе самастойнымі. Кароткаметражка расказвае пра дзяўчынку, якая цярпіць ад неналаджанай камунікацыі з увесь час раздражнёнай маці і абмяркоўвае гэта з сабакам. Вось уласна і ўсё.

Дзіўна для маладога рэжысёра маралізатарскай атрымалася гісторыя «Лялька», знятая Арсеніем Ільіных. Галоўны герой, марнатравец жыцця, сустракае ў трамваі дзяўчыну, што чатыры гады таму была ў яго закаханая і якую ён непрыгожа кінуў. Дзяўчына ўзгадвае пра сваё ўладкаванае жыццё, мужа і трохгадовую дачку. А пасля таго, як эмацыянальна сыходзіць і забываецца на ляльку, малады чалавек разумее, што яго жарт пра тое, што трохгадовая дачка можа быць толькі яго дачкой, — не жарт. І ў яго свядомасці ўсё пераварочваецца.

Навела «Брачо» Кірыла Ярохіна распавядае пра двух адзінокіх — у нейкім сэнсе падобных і ў той жа час вельмі адрозных — хлапцоў, якія сустрэліся на мосце над вакзалам і разам перажылі цэлую драму, што ўвогуле скончылася трагедыяй. Самы складаны для пераказу сюжэт і самы незразумелы матэрыял для высноў. У напісанні сцэнарыя, дарэчы, удзельнічаў небезвядомы драматург Дзмітрый Багаслаўскі, і сапраўды, «Брачо», як і «Спадарожнік», — не проста лінейная гісторыя. Гульня з часам, знакі звышнатуральнага свету, метафары зрабілі карціну крыху цікавейшай глядацкаму погляду і розуму.

**З лубачным падыходам дысануе кароткаметражка Настассі Мірашнічэнка «Спадарожнік», дзе прысутнічаюць псіхалагізм, звышнатуральнасць і кінематаграфічная эфектнасць.**

Зборнік кароткаметражных работ маладых аўтараў падаваўся як пераможная ідэя кінастудыі, пяць фестывальных фільмаў у адным, малады погляд і так далей. Але я ўсё яшчэ не разумею, што ў гэтым прынцыпова новага і важнага для «Беларусьфільма», апроч таго, што некаторыя навелы маніпулююць флешбэкамі і мастацкімі кінасродкамі. Калі на экране масквічка прадказальна аддае перавагу беларусу перад немцам; калі галоўны герой у канцы разумее, што толькі што размаўляў з бацькам, праз знаёмы жэст; калі дзяўчынцы прыемней размаўляць з сабакам, чым з маці; калі два персанажы ў геаграфічна розных кропках замілавальна глядзяць на адно і тое ж неба; калі з'яўленне анёлаў і затухлая ракета-петарда сімвалізуюць смерць — гэта ўсё старое, як свет! Нават нелінейныя «Спадарожнік» і «Брачо», што характарызуюцца большай драматургічнай складанасцю і большай колькасцю затрачаных высілкаў, усё роўна ў свеце кіно бачацца як проба пяра, бо ўсё пра тое ж і тымі ж сродкамі. «Малады погляд», здавалася б, павінен быў прыўнесці ў кантэкст беларусьфільмаўскага кантэнту нешта прынцыпова новае, магчыма, нават, бунтарскае. Калі сэнс толькі ў тым, каб кінастудыя дала магчымасць некалькім пачаткоўцам з так сабе сцэнарыямі папрацаваць пад сваім надзорам, а рэжысёрам увасобіць на экране сваё штампаванае мысленне, напэўна, ад наступнага альманаха, які ўжо значыцца ў планах, нечага вартага чакаць не трэба.

**«Малады погляд» павінен быў прыўнесці ў кантэкст беларусьфільмаўскага кантэнту нешта прынцыпова новае, магчыма, нават, бунтарскае.**

Нарэшце, нельга ўстрымацца ад таго, каб не паглядзець на альманах «Мы» як на зрэз інтарэсаў маладых рэжысёраў, бо творчыя людзі заўсёды апасродкавана транслююць думкі грамадства. А тут у нас адна адарваная ад рэальнасці любоўная гісторыя, дзве гісторыі пра бацькоў і дзяцей, адна, скажам, пра інфантылізм і «Брачо» — адзіная, што паспрабавала паставіць героя ў кантэкст грамадства.

Напэўна, варта было б пазбегнуць глабальных высноў. Ну зняў «Беларусьфільм» альманах і зняў. Але мы бачым, што кінастудыя нават не здолела сабраць пяць перспектыўных праектаў (калі не хапае заявак, трэба шукаць маладых рэжысёраў і запрашаць). У альманаху сабралася састарэлае бачанне сябе ў свеце (на прыкладзе першай навелы), маралізатарства, штампы, засяроджанасць на сабе і амаль поўная адсутнасць аўтарскіх амбіцый. Магчыма, непатрабавальны глядач з цікавасцю пагледзіць пяць кароткаметражак беларускіх рэжысёраў, але з пункту гледжання мадэлі светаўспрымання, прагі да творчасці, тупіка айчыннага кінематографа, з якога трэба неяк выходзіць, наватарства і, нарэшце, кантэксту сусветнага кіно альманах «Мы» — гэта правал.

Ірэна КАЦЯЛОВІЧ.
katsyalovich@zviazda.by

■ Фестываль

# Паслялістападныя рэфлексіі не пра кіно

**Прайшло толькі два тыдні з закрыцця «Лістапада», а ён ужо падаецца справай мінулага, хаця, як вядома, падрыхтоўка да кінафестывалю пачынаецца ўжо на наступны дзень пасля заканчэння папярэдняга. То-бок гэта ўжо і сучаснасць, і будучыня ў тым ліку. Нарэшце, хочацца сказаць не толькі пра кіно, якое мы тонамі глядзім падчас форуму, але і пра значэнне самога «Лістапада». Сёлета рэальны вобраз фестывалю паўстаў у яшчэ большым дысанансе з тым, што ён амаль ніяк не прадстаўляецца за мяжой: маючы такое высакакласнае мерапрыемства, краіна магла б яго праславіць і ўкласці гэтую славу ў свой імідж.**

Адзін з гасцей кінафестывалю, які з адной еўрапейскай краіны ўпершыню прыехаў у Мінск, сказаў, што быў прыемна здзіўлены, бо рэальная Беларусь аказалася дыяметральна адрознай ад яго ўяўленняў. Маўляў, мы тут і адзенне маем, якое хочам, і на аўтамабілях ездзім. Складана ўявіць, які вобраз нашай краіны меў пры сабе запрошаны рэжысёр, але яго прыклад лішні раз нагадвае, што нам трэба паклапаціцца пра свой імідж за мяжой.

Якраз «Лістапад» — элітная падзея, што дае замежным гасцям адпаведныя ўражанні, якія яны вязуць дадому, — быў бы добрым укладам у імідж станоўчы. Інфармацыя пра яго пакуль распаўсюджваецца сарафанным радыё сярод творчых людзей, якія — так — маюць большую за звычайнага чалавека сферу ўплыву. Але гэтага недастаткова: можна сказаць, пра «Лістапад» ведае пэўнае кінематаграфічнае кола і нехта з творчага асяродку ў цэлым, але не больш. І мала, каб проста ведалі, трэба стварыць з гэтага брэнд, праз які і Беларусь будзе больш даступна звычайнаму чалавеку. Мінскі кінафестываль можна без перабольшванняў лічыць промнем святла, які мог бы падсвяціць рэпутацыю Беларусі, але складваецца такое ўражанне, што краіна яго каштоўнасці не разумее і — што больш крыўдна — не імкнецца выкарыстаць.

А пытанне гэта да бюджэту фестывалю, які дазволіў бы«агарнуць» выдатную кінапраграму, якая кожны год з неверагодным у тым ліку энтузіязмам адбіраецца праграмнымі дырэктарамі «Лістапада» і прымушае гасцей агучваць задаволеныя каментарыі, у адпаведную па якасці абгортку з цырымоній і вечарын. І асобна — да бюджэту на раскрутку фестывалю за мяжой.

Пакуль жа сітуацыя падобна да таго, што «Лістапад» дзяржавай успрымаецца як шараговы пасягальнік на рэсурсы. Краіна не разумее, што не толькі «Лістападу» патрэбны дзяржаўныя грошы, але і дзяржаве — проста адчайна — патрэбен «Лістапад». Але адкрываем раздзел «Каманда» на сайце кінафестывалю і бачым у ім сціплую колькасць у пятнаццаць чалавек, якія цягнуць на сабе арганізацыю, складанне праграм, камунікацыю з гасцямі, адказнасць за якасць і «ідэалогію» «Лістапада» (для буйнога мерапрыемства гэта катастрафічна маленькі штат). Тут жа ўспамінаем цякучку кадраў і новыя твары, якія штогод з'яўляюцца на «Лістападзе» замест папярэдніх і ўсё пачынаюць нанова. Тут жа ўспамінаем словы дырэктара «Лістапада» Анжалікі Крашэўскай на выніковым круглым стале пра тое, што бюджэт сёлетняга кінафестывалю быў самы маленькі за апошнія восем гадоў працы.

Якраз на круглым стале, які штогод праводзіцца пасля кінафестывалю з удзелам партнёраў, у тым ліку Міністэрства культуры, сёлета апроч звычайнага абмену меркаваннямі прагучаў эмацыянальны спіч Анжалікі Крашэўскай. Пра тое, што складана працаваць з пастаяннымі думкамі пра бюджэт, надзвычайнай эканоміяй і ў страшэнным цэйтноце з-за таго, што не хапае супрацоўнікаў. Набалела.

Трэба разумець, што энтузіязм, які адыгрывае вялікую ролю ў стварэнні «Лістапада», мае ўласцівасць вычэрпвацца; што такая выбітная падзея, як Мінскі міжнародны фестываль, па вызначэнні не павінна існаваць у няпэўнасці і падпісваць дакументы на фінансаванне за некалькі дзён да фестывалю (пра што мы зноў пачулі на круглым стале); што калі ў жыцці краіны здараецца нешта надзвычайнае — гэта адразу трэба развіваць і выкарыстоўваць на сваю карысць.

Пакуль жа «Лістапад» — не толькі не брэнд для замежнікаў, але і terra incognita для саміх беларусаў. Чаму гэты абсурд стаў часткай нашага жыцця — патлумачыць складана.

Ірэна КАЦЯЛОВІЧ. katsyalovich@zviazda.by

## РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о повторном открытом аукционе по продаже апартаментов и гаражных боксов в г. Сочи, находящихся в собственности Республики Беларусь и принадлежащих ГУ «Санаторий «Беларусь» на праве оперативного управления

| № лота | Описание лотов | Начальная цена с НДС, рос. руб. | Задаток, рос. руб. |
|---|---|---|---|
| Лот №1 | Апартамент №001 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1632. Назначение — нежилое. Этаж – Цокольный этаж №2. Площадь — 101,2 кв. м | 12 710 276,00 | 1 271 027,60 |
| Лот №2 | Апартамент №002 (1-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1629. Назначение — нежилое. Этаж – Цокольный этаж №2. Площадь – 59,7 кв. м | 7 977 119,00 | 797 711,90 |
| Лот №3 | Апартамент №003 (1-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1633. Назначение — нежилое. Этаж – Цокольный этаж №2. Площадь – 61,2 кв. м | 8 177 011,00 | 817 701,10 |
| Лот №4 | Апартамент №004 (2- комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1619 с отделкой. Назначение — нежилое. Этаж – Цокольный этаж №2. Площадь – 99,6 кв. м | 14 429 347,00 | 1 442 934,70 |
| Лот №5 | Апартамент №101 (2- комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1624. Назначение — нежилое. Этаж – Цокольный этаж №1. Площадь – 101,7 кв. м | 13 785 409,00 | 1 378 540,90 |
| Лот №6 | Апартамент №104 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1623. Назначение — нежилое. Этаж – Цокольный этаж №1. Площадь – 100,8 кв. м | 13 664 046,00 | 1 366 404,60 |
| Лот №7 | Апартамент №201 (3- комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1528. Назначение — нежилое. Этаж – 2. Площадь – 172,4 кв. м | 25 242 076,00 | 2 524 207,60 |
| Лот №8 | Апартамент №202 (3-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1529. Назначение — нежилое. Этаж – 2. Площадь – 170,9 кв. м | 22 739 143,00 | 2 273 914,30 |
| Лот №9 | Апартамент №203 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1546. Назначение — нежилое. Этаж – 2. Площадь – 103,1 кв. м | 15 001 895,00 | 1 500 189,50 |
| Лот №10 | Апартамент №204 (1-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1547. Назначение — нежилое. Этаж – 2. Площадь – 69,4 кв. м | 10 752 762,00 | 1 075 276,20 |
| Лот №11 | Апартамент №205 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1530. Назначение — нежилое. Этаж – 2. Площадь – 116,7 кв. м | 16 980 825,00 | 1 698 082,50 |
| Лот №12 | Апартамент №206 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1531. Назначение — нежилое. Этаж – 2. Площадь – 98,7 кв. м | 14 362 240,00 | 1 436 224,00 |
| Лот №13 | Апартамент №208 (3- комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1533. Назначение — нежилое. Этаж – 2. Площадь – 172,9 кв. м | 25 314 894,00 | 2 531 489,40 |
| Лот №14 | Апартамент №209 (1-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1534 с отделкой. Назначение — нежилое. Этаж – 2. Площадь – 60,6 кв. м | 10 135 952,00 | 1 013 595,20 |
| Лот №15 | Апартамент №210 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1535. Назначение — нежилое. Этаж – 2. Площадь – 97,7 кв. м | 14 216 605,00 | 1 421 660,50 |
| Лот №16 | Апартамент №211 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1527. Назначение — нежилое. Этаж – 2. Площадь –123,3 кв. м | 17 941 735,00 | 1 794 173,50 |
| Лот №17 | Апартамент №301 (3-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1630. Назначение — нежилое. Этаж – 3. Площадь – 172,4 кв. м | 25 242 076,00 | 2 524 207,60 |
| Лот №18 | Апартамент №302 (3-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1636. Назначение — нежилое. Этаж – 3. Площадь – 170,9 кв. м | 25 022 195,00 | 2 502 219,50 |
| Лот №19 | Апартамент №303 (2- комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1634. Назначение — нежилое. Этаж – 3. Площадь – 103,1 кв. м | 15 001 895,00 | 1 500 189,50 |
| Лот №20 | Апартамент №305 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1543. Назначение — нежилое. Этаж – 3. Площадь – 116,7 кв. м | 16 980 825,00 | 1 698 082,50 |
| Лот №21 | Апартамент №306 (2- комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1545. Назначение — нежилое. Этаж – 3. Площадь – 98,7 кв. м | 14 362 240,00 | 1 436 224,00 |
| Лот №22 | Апартамент №308 (3-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1542. Назначение — нежилое. Этаж – 3. Площадь – 172,9 кв. м | 25 314 894,00 | 2 531 489,40 |
| Лот №23 | Апартамент №309 (1-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1544. Назначение — нежилое. Этаж – 3. Площадь – 60,6 кв. м | 9 389 213,00 | 938 921,30 |
| Лот №24 | Апартамент №310 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1538. Назначение — нежилое. Этаж – 3. Площадь – 97,7 кв. м | 14 216 605,00 | 1 421 660,50 |
| Лот №25 | Апартамент №311 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1541. Назначение — нежилое. Этаж – 3. Площадь – 123,3 кв. м | 17 941 735,00 | 1 794 173,50 |
| Лот №26 | Апартамент №401 (3- комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1540. Назначение — нежилое. Этаж – 4. Площадь – 172,4 кв. м | 25 242 076,00 | 2 524 207,60 |
| Лот №27 | Апартамент №402 (3-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1536. Назначение — нежилое. Этаж – 4. Площадь – 170,9 кв. м | 25 022 195,00 | 2 502 219,50 |
| Лот №28 | Апартамент №403 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1537. Назначение — нежилое. Этаж – 4. Площадь – 103,1 кв. м | 16 305 476,00 | 1 630 547,60 |
| Лот №29 | Апартамент №404 (1-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1549. Назначение — нежилое. Этаж – 4. Площадь – 69,4 кв. м | 11 108 284,00 | 1 110 828,40 |
| Лот №30 | Апартамент №405 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1550. Назначение — нежилое. Этаж – 4. Площадь – 116,7 кв. м | 18 457 171,00 | 1 845 717, 10 |
| Лот №31 | Апартамент №408 (3-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1568. Назначение — нежилое. Этаж – 4. Площадь – 172,9 кв. м | 25 314 894,00 | 2 531 489,40 |
| Лот №32 | Апартамент №409 (1-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1569. Назначение — нежилое. Этаж – 4. Площадь – 60,6 кв. м | 9 389 213,00 | 938 921,30 |
| Лот №33 | Апартамент №410 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1570. Назначение — нежилое. Этаж – 4. Площадь – 97,7 кв. м | 14 216 605,00 | 1 421 660,50 |
| Лот №34 | Апартамент №411 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1572. Назначение — нежилое. Этаж – 4. Площадь – 123,3 кв. м | 17 941 735,00 | 1 794 173,50 |
| Лот №35 | Апартамент №501 (3-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1564. Назначение — нежилое. Этаж – 5. Площадь – 172,4 кв. м | 25 242 076,00 | 2 524 207,60 |
| Лот №36 | Апартамент №502 (3-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1565. Назначение — нежилое. Этаж – 5. Площадь – 170,9 кв. м | 25 022 195,00 | 2 502 219,50 |
| Лот №37 | Апартамент №503 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1578. Назначение — нежилое. Этаж – 5. Площадь – 103,1 кв. м | 16 305 476,00 | 1 630 547,60 |
| Лот №38 | Апартамент №505 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1593. Назначение — нежилое. Этаж – 5. Площадь – 116,7 кв. м | 18 457 171,00 | 1 845 171,10 |
| Лот №40 | Апартамент №509 (1-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1553. Назначение — нежилое. Этаж – 5. Площадь – 60,6 кв.м | 9 389 213,00 | 938 921,30 |
| Лот №41 | Апартамент №510 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1567. Назначение — нежилое. Этаж – 5. Площадь – 97,7 кв. м | 14 216 605,00 | 1 421 660,50 |
| Лот №42 | Апартамент №511 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1571. Назначение — нежилое. Этаж – 5. Площадь – 123,3 кв. м | 17 941 735,00 | 1 794 173,50 |
| Лот №43 | Апартамент №601 (3-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1573. Назначение — нежилое. Этаж – 6. Площадь – 172,4 кв. м | 25 242 076,00 | 2 524 207,60 |
| Лот №44 | Апартамент №602 (3-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1576. Назначение — нежилое. Этаж – 6. Площадь – 170,9 кв. м | 25 022 195,00 | 2 502 219,50 |
| Лот №46 | Апартамент №609 (1-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1587. Назначение — нежилое. Этаж – 6. Площадь – 60,6 кв. м | 9 389 213,00 | 938 921,30 |
| Лот №47 | Апартамент №610 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1558. Назначение — нежилое. Этаж – 6. Площадь – 97,7 кв. м | 14 216 605,00 | 1 421 660,50 |
| Лот №48 | Апартамент №611 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1594. Назначение — нежилое. Этаж – 6. Площадь – 123,3 кв. м | 17 941 735,00 | 1 794 173,50 |
| Лот №49 | Апартамент №701 (3-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1595. Назначение — нежилое. Этаж – 7. Площадь – 172,4 кв. м | 25 242 076,00 | 2 524 207, 60 |
| Лот №50 | Апартамент №702 (3-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1583. Назначение — нежилое. Этаж – 7. Площадь – 170,9 кв. м | 25 022 195,00 | 2 502 219,50 |
| Лот №51 | Апартамент №703 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1566. Назначение — нежилое. Этаж – 7—ой. Площадь – 103,1 кв. м | 16 305 476,00 | 1 630 547,60 |
| Лот №52 | Апартамент №710 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1580. Назначение — нежилое. Этаж – 7. Площадь – 97,7 кв. м | 14 216 605,00 | 1 421 660,50 |
| Лот №53 | Апартамент №711 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1575. Назначение — нежилое. Этаж – 7. Площадь – 123,3 кв. м | 17 941 735,00 | 1 794 173,50 |
| Лот №54 | Апартамент №801 (3-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1574. Назначение — нежилое. Этаж – 8. Площадь – 172,4 кв. м | 25 242 076,00 | 2 524 207,60 |
| Лот №55 | Апартамент №802 (3- комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1600. Назначение — нежилое. Этаж – 8. Площадь – 170,9 кв. м | 25 022 195,00 | 2 502 219,50 |
| Лот №56 | Апартамент №803 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1591. Назначение — нежилое. Этаж – 8. Площадь – 103,1 кв. м | 16 305 476,00 | 1 630 547,60 |
| Лот №58 | Апартамент №810 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1610. Назначение — нежилое. Этаж – 8. Площадь – 97,7 кв. м | 14 216 605,00 | 1 421 660,50 |
| Лот №59 | Апартамент №811 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1611. Назначение — нежилое. Этаж – 8. Площадь – 123,3 кв. м | 17 941 735,00 | 1 794 173,50 |
| Лот №60 | Апартамент №901 (3- комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1612. Назначение — нежилое. Этаж – 9. Площадь – 172,4 кв. м | 25 242 076,00 | 2 524 207,60 |
| Лот №61 | Апартамент №902 (3-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1638. Назначение — нежилое. Этаж – 9. Площадь – 170,9 кв. м | 25 022 195,00 | 2 502 219,50 |
| Лот №66 | Апартамент №1001 (5-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1659. Назначение — нежилое. Этаж – 10,11. Площадь – 347,7 кв. м | 51 158 074,00 | 5 115 807,40 |
| Лот №67 | Апартамент №1002 (5-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1651. Назначение — нежилое. Этаж – 10,11. Площадь – 344,0 кв. м | 50 614 082,00 | 5 061 408,20 |
| Лот №68 | Апартамент №1003 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1663. Назначение — нежилое. Этаж – 10. Площадь – 103,1 кв. м | 16 305 476,00 | 1 630 547,60 |
| Лот №69 | Апартамент №1004 (2-комнатный 2-уровневый) с кадастровым номером 23:49:0203004:1671. Назначение — нежилое. Этаж – 10,11. Площадь – 139,0 кв. м | 21 983 837,00 | 2 198 383,70 |
| Лот №70 | Апартамент №1009 (1-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1670. Назначение — нежилое. Этаж – 10. Площадь – 60,6 кв. м | 9 389 213,00 | 938 921,30 |
| Лот №71 | Апартамент №1010 (2- комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1672. Назначение — нежилое. Этаж – 10. Площадь – 97,7 кв. м | 14 216 605,00 | 1 421 660,50 |
| Лот №72 | Апартамент №1011 (4- комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1646. Назначение — нежилое. Этаж – 10, 11. Площадь – 247,4 кв. м | 36 400 333,00 | 3 640 033,30 |
| Лот №73 | Апартамент №1101 (2- комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1647. Назначение — нежилое. Этаж – 11. Площадь – 108,3 кв. м | 17 127 889,00 | 1 712 788,90 |
| Лот №74 | Гаражный бокс №1 с кадастровым номером 23:49:0203004:1649. Назначение — нежилое. Этаж – Подвал №3. Площадь – 14,9 кв. м | 1 344 988,00 | 134 498,80 |
| Лот №75 | Гаражный бокс №2 с кадастровым номером 23:49:0203004:1673. Назначение — нежилое. Этаж – Подвал №3. Площадь – 14,5 кв. м | 1 342 132,00 | 134 213,20 |
| Лот №80 | Гаражный бокс №7 с кадастровым номером 23:49:0203004:1596. Назначение — нежилое. Этаж – Подвал №3. Площадь – 13,2 кв. м | 1 332 137,00 | 133 213,70 |
| Лот №81 | Гаражный бокс №8 с кадастровым номером 23:49:0203004:1601. Назначение — нежилое. Этаж – Подвал №3. Площадь – 12,8 кв. м | 1 327 854,00 | 132 785,40 |
| Лот №84 | Гаражный бокс №11 с кадастровым номером 23:49:0203004:1607. Назначение — нежилое. Этаж – Подвал №3. Площадь – 13,4 кв. м | 1 333 565,00 | 133 356,50 |
| Лот №85 | Гаражный бокс №12 с кадастровым номером 23:49:0203004:1598. Назначение — нежилое. Этаж – Подвал №3. Площадь – 11,3 кв. м | 1 316 432,00 | 131 643,20 |
| Лот №86 | Гаражный бокс №13 с кадастровым номером 23:49:0203004:1604. Назначение — нежилое. Этаж – Подвал №3. Площадь – 14,9 кв. м | 1 344 988,00 | 134 498,80 |
| Лот №87 | Гаражный бокс №14 с кадастровым номером 23:49:0203004:1605. Назначение — нежилое. Этаж – Подвал №3. Площадь – 12,5 кв. м | 1 326 426,00 | 132 642,60 |
| Лот №88 | Гаражный бокс №15 с кадастровым номером 23:49:0203004:1608. Назначение — нежилое. Этаж – Подвал №3. Площадь – 12,5 кв. м | 1 326 426,00 | 132 642,60 |
| Лот №89 | Гаражный бокс №16 с кадастровым номером 23:49:0203004:1606. Назначение — нежилое. Этаж – Подвал №3. Площадь – 13,1 кв. м | 1 330 710,00 | 133 071,00 |
| Лот №90 | Гаражный бокс №17 с кадастровым номером 23:49:0203004:1614. Назначение — нежилое. Этаж – Подвал №3. Площадь – 11,7 кв. м | 1 319 287,00 | 131 928,70 |
| Лот №91 | Гаражный бокс №18 с кадастровым номером 23:49:0203004:1609. Назначение — нежилое. Этаж – Подвал №3. Площадь – 13,5 кв. м | 1 333 565,00 | 133 356,50 |
| Лот №92 | Гаражный бокс №19 с кадастровым номером 23:49:0203004:1617. Назначение — нежилое. Этаж – Подвал №3. Площадь – 12,1 кв. м | 1 322 143,00 | 132 214,30 |
| Лот №93 | Гаражный бокс №20 с кадастровым номером 23:49:0203004:1562. Назначение — нежилое. Этаж – Подвал №3. Площадь – 13,0 кв. м | 1 329 282,00 | 132 928,20 |
| Лот №96 | Гаражный бокс №23 с кадастровым номером 23:49:0203004:1653. Назначение — нежилое. Этаж – Подвал №3. Площадь – 14,3 кв. м | 1 340 704,00 | 134 070,40 |
| Лот №97 | Гаражный бокс №24 с кадастровым номером 23:49:0203004:1676. Назначение — нежилое. Этаж – Подвал №3. Площадь – 15,9 кв. м | 1 353 554,00 | 135 355,40 |
| Лот №98 | Гаражный бокс №25 с кадастровым номером 23:49:0203004:1655. Назначение — нежилое Этаж – Подвал №3. Площадь – 12,4 кв. м | 1 324 998,00 | 132 499,80 |
| Лот №99 | Гаражный бокс №26 с кадастровым номером 23:49:0203004:1656. Назначение — нежилое. Этаж – Подвал №3. Площадь – 12,8 кв. м | 1 327 854,00 | 132 785,40 |
| Лот №102 | Гаражный бокс №29 с кадастровым номером 23:49:0203004:1679. Назначение — нежилое. Этаж – Подвал №3. Площадь – 13,7 кв. м | 1 334 993,00 | 133 499,30 |
| Лот №106 | Гаражный бокс №43 с кадастровым номером 23:49:0203004:1667. Назначение — нежилое. Цокольный этаж №2. Площадь – 11,7 кв. м | 1 359 266,00 | 135 926,60 |

### ОПИСАНИЕ АПАРТОТЕЛЯ

Апартаменты и гаражные боксы находятся в здании апартотеля, представляющего собой монолитное 13-этажное здание (введено в эксплуатацию в апреле 2015 г.), расположенного по адресу: г. Сочи, ул. Политехническая, д. 62, в одном из самых экологически чистых районов, на круглосуточно охраняемой территории Государственного учреждения «Санаторий «Беларусь» в непосредственной близости от государственной дачи «Бочаров ручей». Апартотель расположен на земельном участке с кадастровым №23:49:0203004:21 площадью 155 600 кв. м, предоставленном Государственному учреждению «Санаторий «Беларусь» на праве аренды по 22.09.2062. Разрешенное использование земельного участка – для размещения и эксплуатации зданий и сооружений санатория

### УСЛОВИЯ

К участию в аукционных торгах допускаются индивидуальные предприниматели, физические и юридические лица без ограничения, вне зависимости от государственной принадлежности, внесшие задаток по **04.12.2017 г**. В качестве участника аукциона регистрируются лица, задаток которых поступил на расчетный счет Организатора аукциона на момент подачи заявления на участие в аукционе с иными необходимыми документами.

Валюта торгов – российский рубль. Валюта платежа — российский рубль.

Задаток за участие в аукционных торгах устанавливается в российских рублях. Сумма для оплаты задатка на участие в аукционе для резидентов Республики Беларусь производится в белорусских рублях с применением официального курса Национального банка Республики Беларусь на день платежа.

Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан подписать договор купли-продажи Объекта (Объектов) с Продавцом в течение 5 (пяти) дней с назначенной даты аукциона.

Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан оплатить полную стоимость приобретенного на аукционе Объекта (Объектов) в течение 30 (тридцати) дней с назначенной даты аукциона.

Передача Победителю аукциона (Претенденту на покупку) пакета документов для регистрации (оформления) права собственности осуществляется только после оплаты полной стоимости Объекта (Объектов).

Государственная регистрация договора купли-продажи Объекта (Объектов) осуществляется Победителем аукциона (Претендентом на покупку) после полной оплаты стоимости приобретенного на аукционе Объекта (Объектов) и получения перечисленной суммы Продавцом.

Все расходы по удостоверению, составлению и оформлению договора купли-продажи, уплате государственной пошлины оплачиваются Победителем аукциона (Претендентом на покупку).

Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение повторного открытого аукциона на основании счета-фактуры в течение 3 (трех) банковских дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.

Запрет на изменение фасадной части.

Платежи и расчеты с резидентами и нерезидентами Республики Беларусь осуществляются в соответствии с законодательством Республики Беларусь, регулирующим расчеты при проведении валютных операций

Размер штрафа, уплачиваемый участником аукциона и (или) его Победителем (Претендентом на покупку) в случаях, предусмотренных Положением о порядке организации и проведения аукционов (конкурсов) по продаже отдельных объектов, находящихся в государственной собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 №609 и соглашением о правах и обязанностях сторон в процессе организации и проведения аукциона, составляет 5% от стоимости Объекта (Объектов)

**Аукцион состоится 09.12.2017 г. в 10.00 по мск по адресу:**
**Российская Федерация, Краснодарский край, г. Сочи, ул. Политехническая, 62,**
**конгресс-зал главного корпуса. Шаг аукциона – 5%**

Порядок оформления участия в аукционе содержится на сайте Организатора аукциона ino.by.

Задаток для резидентов Республики Беларусь перечисляется на р/с BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», BIC банка BPSBBY2X, 220004, г. Минск, ул. Кальварийская, д. 4а

Задаток для нерезидентов Республики Беларусь перечисляется на текущий счет в российских рублях BY57BLBB30120190055182001006, BIC банка BLBBBY2X, в ОАО «Белорусский банк развития и реконструкции «Белинвестбанк», 220002 г. Минск, пр. Машерова, 29. ОКПО 37492021. ПАО «Сбербанк России» г. Москва, ИНН 7707083893, БИК 044525225, к/с 30101810400000000225 в ГУ Банка России по ЦФО, счет 30111810800000000154. SWIFT код SABRRUMM. Участник, желающий участвовать в аукционе в отношении нескольких лотов, вносит задатки в размере, установленном для каждого из лотов.

Получатель — РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182 / ОКПО 37492021. Назначение платежа: задаток для участия в повторном аукционе по продаже апартаментов и гаражных боксов (Лот №__), проводимом **9 декабря 2017 г.**

Организация и проведение аукциона осуществляются в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь, оформление и регистрация сделки в соответствии с законодательством Российской Федерации.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются:

— в г. Минске, ул. Комсомольская, д.11, каб. 7 в рабочие дни с 8.30 до 12.00, с 13.30 до 16.00. Окончание приема заявлений **04.12.2017 до 12.00** по белорусскому времени.

— в г. Сочи, ул. Политехническая, 62, конгресс-зал в здании главного корпуса **08.12.2017 г. с 09.00 до 11.00** по мск. Для этого потенциальному участнику необходимо не позднее **04.12.2017 г**. по средствам электронной почты и (или) факсимильной связи обратиться к Организатору аукциона с заявлением с просьбой о проведении процедуры регистрации в качестве участника аукциона в г. Сочи и представить копию платежного документа о перечислении задатка.

Все желающие могут предварительно ознакомиться с Объектами аукциона. Контактное лицо для осмотра Объектов: Кришеник Сергей Иванович: 8-10-7-862-259-60-02 , 8-10-7-862-259-60-12, 8-10-7-928-451-31-69.

Организатор аукциона или Продавец вправе снять лот (лоты) с торгов до объявления его проданным без объяснения причин снятия

**Организатор: 8 (017) 306 00 57, 8 (029) 550 09 52, 8 (029) 356 9003 • www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**

**Извещение о проведении 6 декабря 2017 года повторных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Минскремстрой»**

| Предмет торгов №1 |
|---|
| «В 1/к Здание административно-хозяйственное» общей площадью 71,9 кв. м, инв. № в ЕГРНИ 500/С-41417; «Здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ Литер Г1/к» общей площадью 34,8 кв. м, инв. № в ЕГРНИ 500/С-41418; электросети (инв. №26/3); покрытие площадки асфальтобетонное (инв. №27/10); забор ж/б с воротами металлическими (инв. №27/9); кран-балка (инв. №27/8) |
| Площадь земельного участка – 0,1108 га, кадастровый номер 500000000002000714 |
| Местонахождение – г. Минск, ул. Бехтерева, 11, 11/1 |
| Начальная цена – 93 301,54 бел. руб. с учетом НДС |
| Сумма задатка – 9 300,00 бел. руб. |
| **Предмет торгов №2** |
| «Здание административно-хозяйственное, литер А 1/к» общей площадью 472,1 кв. м, инв. № в ЕГРНИ 500/С-11335; «Б 1-2/к Здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ» общей площадью 762,6 кв. м, инв. № в ЕГРНИ 500/С-11333; навес каркасный шиферный (инв. №27/2); навес-пристройка каркасный шиферный (инв. №27/3); электросети (инв. №2604); сеть водопроводная (инв. №2603); покрытие площадки асфальтобетонное (инв. №26/2); забор ж/б с воротами металлическими (инв. №26/1); автоматическая установка пожарной сигнализации и оповещения о пожаре (инв. №42795); котел КЧЖ-7-90 «Полымя» (инв. №620/1); котел КВГТ-100 (ТЭМ-100) (инв. №420898); котел TIS UNI 75 (инв. № 4000125); забор металлический (инв. №203266); резервуар для хранения нефтепродуктов (инв. №469); стеллажи складские (инв. №27/5); кран-балка (инв. №315) |
| Площадь земельного участка – 0,3237 га, кадастровый номер 500000000002000713 |
| Местонахождение – г. Минск, ул. Бехтерева, 12, 12/1 |
| Начальная цена – 572 745,49 бел. руб. с учетом НДС |
| Сумма задатка – 57 200,00 бел. руб. |

**Продавец имущества** – ОАО «Минскремстрой», ул. Интернациональная, 5, 220030, г. Минск.

**Организатор торгов** – государственное предприятие «МГЦН», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск.

**Условие торгов** – победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 2 процентов от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся в соответствии со ст. ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества ОАО «Минскремстрой», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток и заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка (задатков); документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток (задатки) перечисляется на расчетный счет государственного предприятия «МГЦН» №BY34 BPSB 3012 1049 7101 9933 0000 в Региональной дирекции № 700 по г. Минску и Минской области ОАО «БПС-Сбербанк», БИК BPSBBY2X, УНП 190398583, в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи. По согласованию с продавцом возможна рассрочка платежа.

Торги проводятся 6 декабря 2017 года в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются с 27.11.2017 по 04.12.2017 включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

Телефоны для справок:

(017) 327-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»);

(017) 226-41-14, (017) 200-04-11, (029) 688-61-94 (ОАО «Минскремстрой»).



**6 декабря 2017 года в 10.00 состоится внеочередное общее собрание акционеров ОАО «Брестская трикотажная фирма «Элма»**

**Повестка дня:**

1. Об изменении уставного фонда ОАО «Брестская трикотажная фирма «Элма».
2. Об утверждении новой редакции Устава ОАО «Брестская трикотажная фирма «Элма».
3. О проведении ОАО «Брестская трикотажная фирма «Элма» эмиссии акций дополнительного выпуска, размещаемых путем проведения закрытой подписки.

Местонахождение ОАО: г. Брест, ул. Куйбышева, 13

Место проведения собрания: г. Брест, ул. Куйбышева, 13 (кабинет директора).

С материалами, подготовленными к собранию, можно ознакомиться по адресу: г. Брест, ул. Куйбышева, 13 с 1 декабря 2017 года по 5 декабря 2017 года с 9.00 до 16.00 либо 6 декабря 2017 года по месту проведения собрания.

Начало регистрации участников собрания: 9.30.

Список акционеров для участия в собрании будет составлен по состоянию реестра на 30 ноября 2017 года.

При себе необходимо иметь документ, удостоверяющий личность (для представителя акционера – доверенность).

УНП 200295587


# ВЕРХМЕНСКАЯ ГІСТОРЫЯ

**Мінулае кожнай пядзі нашай зямлі мае быць запісанай у агульны летапіс усіх пакаленняў. Кожнай сцежцы на гэтай зямлі ёсць пра каго распавесці, пра што ўспомніць.**





СТО адзін год таму ў дакладной на імя мінскага губернатара паведамлялі, што малады настаўнік Канстанцін Міцкевіч «пераведзены ў знак пакарання з Пінкавіцкага ў Верхменскае народнае вучылішча».

Сёння ўжо немагчыма разглядзець тыя сцежкі, якімі калісьці спяшаўся будучы класік беларускай літаратуры на заняткі да верхменскай дзятвы, хадзіў любавацца ляснымі абшарамі, невялічкімі палеткамі, хутаркамі. Тыя ж палеткі за мінулае стагоддзе непазнавальна змяніліся, былі неаднойчы перааараныя плугамі, парэзаныя франтавымі акопамі...

Але вось дзіва! Па зніклай у даўніне сцяжынцы зноў крочыць да вясковага вучылішча малады настаўнік. Зноў уваходзіць у клас, дзе каля бярвенчатых сцен туляцца невялічкія дашчатыя столікі. Вітаецца з малымі, пачынае заняткі...

Сапраўдная тэатральная сцэна з персанажамі далёкага 1906 года заняла значную частку літаратурнага музея Якуба Коласа Верхменскай сярэдняй школы Смалявіцкага раёна. Вучні ажывілі на ёй некаторыя старонкі знакамітай трылогіі «На ростанях», дзе Якуб Колас распавядаў пра мясцовыя ваколіцы, урочышча, рэчку, вадзяны млын. У кароткіх дыялогах узнікалі знаёмыя героі трылогіі, а іх трапна падабранае тагачаснае адзенне і старыя прадметы вясковага ўжытку дадавалі падабенства.



Такую музейна-тэатральную імпрэзу ладзілі днямі ў названай вясковай школе сённяшнія нашчадкі тых, каго вучыў калісьці малады настаўнік Канстанцін Міцкевіч. Гэта інсцэніроўка — вынік творчых намаганняў педагогаў і вучняў, якія вывучаюць гісторыю сваіх мясцін, спасцігаюць яе месца ў агульнай гісторыі Бацькаўшчыны.

Гасцямі музейна-тэатральнага свята сталі настаўнікі і кіраўнікі школьных музеяў Мінскай вобласці. У літаратурных чытаннях узялі ўдзел прадстаўнікі Мінскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі. Настаўнікі падзяліліся досведам па выхаванні патрыятызму сродкамі музейнай педагогікі. Прысутныя пазнаёміліся з навуковай працай школьнікаў з Клецкага раёна, прысвечанай Якубу Коласу. Даведаліся, як святкуюць дзень нараджэння Песняра яго землякі ў Стаўбцоўскім раёне.

У музейнай зале прагучалі новыя творы паэтаў і пісьменнікаў, што завіталі сюды, а самі аўтары падарылі школе свае кнігі з аўтографамі. Арганізатар імпрэзы — метадыст Мінскага абласнога інстытута развіцця адукацыі Наталля Обухава. Дарэчы, літаратары Мінскай вобласці сёлета неаднойчы ўдзельнічалі ў краязнаўчых школьных мерапрыемствах, прысвечаных пісьменнікам — ураджэнцам Міншчыны.

*На здымках, зробленых у школьным літаратурным музеі Якуба Коласа, вы бачыце адзін з куткоў экспазіцыі, сцэну з інсцэніроўкі паводле трылогіі «На ростанях» у выкананні мясцовых вучняў, паэта Уладзіміра Цануніна, які перадае кнігі кіраўніцы школьнага музея Святлане Лютарэвіч.*

**Яўген ПЯСЕЦКІ.**
**Фота аўтара.**

## ■ Чулі?!

## Экспанат у падарунак ад мытні

**Старадаўні камінны гадзіннік канфіскавалі ў масквіча супрацоўнікі пункта мытнага афармлення «Дамачава». Грамадзянін суседняй краіны вёз культурную каштоўнасць без усялякіх дакументаў, нібы сучасны кітайскі электронны гадзіннік. Менавіта экспертыза назвала каштоўнасцю рэч, выробленую ў Францыі ў XIX стагоддзі. Суд канчаткова вырашыў лёс кантрабанды на карысць нашай краіны.**



Звычайна такія знаходкі пераязджалі ў брэсцкі музей культурных каштоўнасцяў. На гэты раз мытня вырашыла папоўніць экспазіцыю гісторыка-мемарыяльнага музея «Сядзіба Нямцэвічаў», які знаходзіцца ў Скоках пад Брэстам. Начальнік Брэсцкай мытні Аляксандр Піхун ва ўрачыстай абстаноўцы перадаў гадзіннік супрацоўнікам музея. Несумненна, такая рэч магла б упрыгожваць залу, калі ў ёй танцавалі гаспадары палаца, магла быць у ёй і пазней, калі ў Скоках Троцкі вёў перагаворы з германскімі прадстаўнікамі напярэдадні падпісання Брэсцкага міру.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.** *yackevich@zviazda.by*

## ■ Запрашальнік

## НАПАЛЕОН ЗНОЎ «ПЕРАПРАВІЦЦА» ЦЕРАЗ БЯРЭЗІНУ

**Ваенна-гістарычнае свята-рэканструкцыя «Бярэзіна-2017» пройдзе 26 лістапада на мемарыяльным комплексе «Брылёўскае поле» ў Барысаўскім раёне. Падчас яго жыхары Міншчыны і госці атрымаюць магчымасць уявіць сабе адну з самых страшных бітваў Айчыннай вайны 1812 года. Адчайныя схваткі кавалерыі і пяхоты, артылерыйская дуэль у духу антычных герояў і апошніх высакародных войнаў. Дзякуючы ўзнаўленню тагачасных падзей гледачы даведаюцца, ці ўдалося Напалеону выратаваць рэшткі Вялікай арміі або слава імператара назаўсёды згасла на берагах Бярэзіны.**

Штогод ваенна-гістарычная рэканструкцыя ілюструе пераправу Напалеона цераз Бярэзіну каля беларускіх вёсак Студзёнка і Брылі. Тады, 205 гадоў таму, руская армія паспрабавала акружыць абяскроўленыя войскі Банапарта і канчаткова знішчыць іх. Бітва стала настолькі знакавай, што ў французскай мове з'явілася новае слова «berezina», якое азначае крах усіх надзей.

У праграме — рэканструкцыя фрагмента баталіі Рускай імператарскай арміі і Вялікай арміі Напалеона, мемарыяльныя цырымоніі, наведванне памятных мясцін і музея, майстар-класы па тагачасных танцах, выстаўкі-кірмашы работ рамеснікаў, інтэрактыўныя тэматычныя пляцоўкі для дарослых і дзяцей, ускладанне кветак і вянкоў прадстаўнікамі дыпкорпуса, дзяржаўных органаў і арганізацый да помнікаў рускім і французскім салдатам.

Упершыню ў гісторыі фестывалю, у гонар 205 гадавіны разгрому напалеонаўскіх войскаў, пранясуць воінскія рэліквіі 1812 года: арла-наверша і салдацкі складзень.

Пасля абвяшчэння Напалеона імператарам арол стаў геральдычным сімвалам Францыі. У 1804 годзе імператар выдае дэкрэт, у якім загадвае: «з мэтай аб'яднаць нацыю са сваёй дынастыяй» увянчаць фігурай пазалочанага сядзячага арла з распасцёртымі крыламі сцягі ўсіх палкоў. Пасля адступлення войскаў удалося адшукаць толькі два арла-навершы, адзін з якіх захоўваецца ў фондах Барысаўскага музея. Знакам духоўнасці і воінскага гонару для рускіх салдат і афіцэраў стаў складзень — створная нацельная ікона. Распаўсюджаней сярод вайсковаслужачых кампаніі 1812 года была двайная ікона-складзень «Багамаці Смаленская і Мікалай Цудатворац». Назву «салдацкая» яна атрымала таму, што яе найчасцей знаходзілі на палях змаганняў XVIII—XIX стагоддзяў з удзелам рускай арміі. Арол-наверша і складзень — сімвалы фестывалю «Бярэзіна-2017». Цырымонія вынасу рэліквій адбудзецца 26 лістапада а 15 гадзіне. На юбілейную баталію чакаюцца госці і ўдзельнікі з Расіі, Латвіі, Польшчы, Францыі, Бельгіі.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ**
*lazovskaya@zviazda.by*

■ Так ці не?

# Час піць чай. З чайніка?

**«Падчас «Лістапада» мы з сяброўкамі хадзілі ў кіно, абмяркоўвалі асобныя стужкі і нечакана для сябе высветлілі, што не ведаем, як правільна перакласці на беларускую мову слова *«впечатляющий»*, — піша Алена С. з Мінска.**

**У іншым лісце, ад спадара Кахановіча з Маладзечна, чытаем: «Рускае слова *сейчас* перакладаецца як *зараз*, *цяпер* і *адразу*. Растлумачце, калі ласка, розніцу ў выкарыстанні гэтых слоў, бо, на мой погляд, іх часта блытаюць: гавораць і пішуць няправільна».**

**Як заўжды, на моўныя пытанні чытачоў адказваюць стыльрэдактары «Звязды» Алесь САЛАМЕВІЧ і Леў ГЛУШЫЦКІ.**

1. Пры перакладзе на беларускую мову рускага прыметніка *впечатляющий* можна сутыкнуцца з праблемай выбару сярод некалькіх паронімаў (слоў, што маюць падобныя форму і гучанне, але адрозніваюцца сэнсам). У нашым выпадку гэта *ўражальны, уражаны, уражлівы* і *ўразлівы*. **Уражальным** — той, які ўражвае: *уражальнае выступленне*. **Уражаным** можа быць той, каго нечым уразілі: *уражаны цудоўным выступленнем глядач*. **Уражлівым** называюць вельмі чулага, чуллівага чалавека, які лёгка паддаецца ўражанням: *у дзяцінстве ён быў вельмі ўражлівы*. **Уразлівы** — той, каго лёгка закрануць, пакрыўдзіць. Прыметнік *уразлівы* адрозніваецца ад *уражлівага* яшчэ тым, што ён можа адносіцца не толькі да чалавека. Напрыклад, можна сказаць «Ён меў уразлівае сэрца».

Такім чынам, пераходзячы непасрэдна да пытання пра кіно, скажам, што фільм можа быць менавіта *ўражальным*.

2. У многіх, хто гаворыць і піша па-беларуску, і сапраўды ўзнікае праблема з перакладам рускага *сейчас*: для іх адказ адназначны — *зараз*. Аднак не ўсё так проста. Чуйна ставіцца да выбару паміж двума словамі — *цяпер* і *зараз* заклікаў яшчэ пісьменнік Лукаш Калюга ў першай палове мінулага стагоддзя. Сёння пашыраецца меркаванне, што *цяпер* трэба ўжываць менавіта для цяперашняга часу, а *зараз* — для будучага. *Цяпер*, напрыклад, восень, а *зараз* — вось-вось, азірнуцца не паспееш — агорне зіма.

У выразе **тут і цяпер** лепш ужываць менавіта *цяпер*.

Калі ж рускае *сейчас* абазначае «з першага погляду», «у той жа момант», то на беларускую мову яно перакладаецца словам *адразу*. Чытаймо: *я сейчас же понял, что происходит, — я адразу ж зразумеў, што адбываецца*.

У рускамоўнай гаворцы можна часам пачуць фразу накшталт *«Я сейчас поговорила с Димой»*.

У гэтым выпадку *сейчас* паясняе дзеянне, якое адбылося зусім нядаўна, і перакладацца яно павінна словамі **толькі што**: *«Я толькі што пагаварыла з Дзімам»*.

...З Вільні мы атрымалі ліст ад нашага чытача, якога бянтэжыць ужыванне ў газеце назоўніка *намеснік* у дачыненні да жанчын. Не так даўно, у нумары ад 1 верасня, мы закранулі гэтую тэму. Таму сёння адзначым, што супраць формы *намесніца* мы, вядома ж, нічога не маем. Але ў сувязі з тым, што дырэктара-жанчыну ў газетных тэкстах мы называем менавіта *дырэктар* (бо гэта ўсталяваная назва пасады), то гэткі ж падыход лагічны і ў дачыненні да яе *намесніказ* — яшчэ і з ліку жанчын.

### У АБАРОНУ СЛОЎ

У няласку апошнім часам трапіла вельмі патрэбнае слова **чайнік**: маўляў, няма ў нашай мове слова *чай*, таму не павінна быць *чайніка*. Той, хто гэта сцвярджае, вельмі памыляецца: ёсць у нас як вядомая ўсім гарбата, так і чай, а з ім — і чайная, і чайнік, і чайніца. Іх фіксуюць слоўнікі, яны ўжываюцца ў літаратуры.

Прапануецца чайнік называць **імбрыкам, імбрычкам**. Але гэта не адно і тое ж: у імбрыку, або імбрычку, чай ды гарбату заварваюць, а ў чайніку звычайным проста гатуюць ваду

■ Простая мова

# З НІЗКІМ ПАКЛОНАМ...

**Горад, дзень, час перакусу: у невялічкай крамцы на сталічным праспекце мы замаўляем каву. Пакуль яна варыцца, услых выбіраем печыва: пытаем у «гаспадынь», што ў іх свяжэйшае, што смачнейшае, дзе меней цукру? Тыя адказваюць, падаюць, прадаюць.**

**— *А вы везде разговариваете по-белорусски?* — цікавіцца нарэшце адна.**

**Адказваць на гэта пытанне ўсур'ёз неяк не выпадае. Тады жартам:**

**— А што, — крадком азіраемся па баках, — у вас нельга?**

**— Можна, ну чаму ж гэта не?! — «дазваляюць» жанчыны. — Нам так цікава паслухаць!..**

**Як нам... паразмаўляць?**

### ПЕРАД ВЫБАРАМ

«Калі хочаш быць здароў, не хадзі да дактароў», — часта паўтарае Паўлавіч і сапраўды не ходзіць. А вось суседу «хуткую» выклікаў.

Прыгожыя «дзяўчаты» прыехалі, памералі ціск, «ушпілілі» ўкол, параілі лекі.

— А можа, па сто грамаў лепш прымаць? — з усмешкай спытаў сусед.

— Гэта не выйсце, — сказала дакторка, — бо вып'еце — ціск спачатку панізіцца, але хутка павысіцца зноў.

— А калі не даць яму павысіцца — калі зноў выпіць?

— Ну, тады ўжо на выбар — ці жыць, ці піць.

...А хацелася б — кампрамісу.

### ПЕРШЫ ТОСТ

Дзе служба, дзе дружба, каханне, размеркаванне, пошукі лепшай долі... Парассыпала людзей па свеце. А ў выніку — дзед Валя тут, у Беларусі, а сёстры яго (амаль такія ж нямоглыя) — за тысячы вёрст. І не дабрацца ўжо — ні ім, ні яму, не абняць, не падтрымаць у горы: цягнікі ідуць з перасадкай, самалётаў няма. Адзінае...

На святы дачка з сям'ёй прыязджала, унук планшэт свой прывёз, арганізаваў радні размову па скайпе.

Адвялі душу: пагутарылі, пагледзелі адзін на аднаго, пабачылі, хто жыве...

А ўжо потым, пад уражаннем, можна было і кілішкі падняць.

— Ну, за стагоддзе рэвалюцыі? — як заўсёды ў кастрычніцкае свята, прапанаваў быў зяць.

Цесць, былы камуніст, трохі памаўчаў, падумаў:

— Не, — сказаў, — давай за інтэрнэт!

### УРОК ДЛЯ НАСТАЎНІКА

«Дачушка, уставай, табе ў школу пара... Уставай, а то спознішся... Дачушка, ну які ты прыклад падасі? Ты ж дырэктар...»

А, здаецца ж, зусім нядаўна маладым спецыялістам была, дрэнныя адзнакі ставіць баялася, на неслухаў голас павышаць... «Ой, дзеўка, глядзі, — павучалі яе калегі, — распусціш дзяцей — наплачашся: на галаву пасядуць — не ўкіруеш тады. З імі строга трэба».

«І сапраўды, — у думках згаджалася настаўніца. — Два дні прашу, каб новыя сшыткі прынеслі. Не чуюць...»

Таму ўжо на трэці яна сказала:

— Усё, больш паўтараць не буду: заўтра — кроў з носа — усім прынесці новыя сшыткі. Хто забудзецца, пойдзе дамоў. Усе запомнілі? Усе зразумелі?

— Так, — дружна зашумелі вучні. І не падманулі: сапраўды запомнілі (было б там што?) і зразумелі, але кожны па-свойму. Ва ўсякім разе, адзін з малых прыйшоў дамоў у слязах.

— Што здарылася? Чаго ты плачаш? — устрывожана спытала матуля.

— Я сёння «дамашку» не зраблю, — паскардзіўся сын.

— Гэта чаму ж?

— А нам на заўтра настаўніца загадала, каб сшыткі прынеслі і кроў з носа. А я свой нос разбіваць не хачу.

...Напамін для настаўніцы: *«Нам не дано предугадать, как наше слово отзовется...»*

І ён жа — урок.

### РЭХА

Факт (толькі адзін): у ноч на 30 кастрычніка 1937-га ў Мінску ў так званай амерыканцы (у сутарэннях унутранай турмы НКВД) расстралялі 130 дзеячаў культуры, у тым ліку паэтаў Алеся Дудара, Юрку Лявоннага, Валеры Маракова, Сяргея Мурзо, Міхася Чарота, Ізі Харыка...

Жонку яго, Дзіну, арыштавалі таксама — з фармулёўкай «член сям'і здрадніка радзімы».

Сыноў (большаму тры гадкі, меншаму — няпоўныя два) як дзяцей таго самага ворага адправілі ў дзетдом, да ўсяго змяніўшы ім прозвішча... А таму іх маці, цудам выжыўшы ў лагерах і вярнуўшыся дамоў, дзе і як ні шукала, а знайсці хлапчукоў не змагла. Ёй казалі, што яны, малыя, пэўна ж, загінулі.

І яна... верыла (ці рабіла выгляд), бо не ведала, як жыць, калі думаць іначай.

### СУМНАЯ ПЕСНЯ

Дома, за сталом у Тацяны з Іванам можна спяваць пра ўсё. Ну ці амаль... Бо ёсць адна забарона. Прычым песня, здавалася б, зусім бяскрыўдная. Называецца «Трава ля дома». Помніце: «Зямляне» спявалі, што сніцца яна...

Івану таксама — то сніцца, то ўспамінаецца — як падчас «развітога сацыялізму» катастрафічна не хапала гэтай травы, бо ў іх вёсцы на 350 двароў кароў было не меней. Ды яшчэ і калгасныя есці хацелі. Таму кожнай сям'і даводзіўся план: дзве тоны сена дзе хочаш бяры, але на ферму здай (пра сваю карміліцу падумаеш потым).

А хацелася ж раней: каб лепшай травы, ну хоць копку...



Ноччу хадзілі касіць, сушыць, вазіць...

А назаўтра, здаралася, прыходзіў брыгадзір ці нехта з камісіі па нарыхтоўцы кармоў, адчыняў гумно, строга пытаўся: "Што гэта? Мігам вязі на ферму!»

І нічога тады не заставалася: вёз чалавек. Горш за тое — пад суд ішоў, калі правяральшчык ідэйны ці непітушчы быў...

З іншымі — трохі прасцей, бо яны смела ішлі ў хату, садзіліся за стол і ўжо тады, «заліўшы» вочы, не хадзілі ў гумно. А значыць, сям'я карысталася момантам: ездзіла нарыхтоўваць сена і крадком вазіла дамоў.

...Падросшы, Іван з сястрой чакалі яго на тарпе.

Дагэтуль у памяці — як слухалі цішыню, каб злавіць у ёй скрып калёс, як узіраліся ўдалеч, каб убачыць воз, як упохапкі прымалі сена, як стараліся найхутчэй утаптаць...

А галоўнае, як жа ім, піянерам з атрада Паўліка Марозава, было страшна і сорамна. Бо атрымлівалася, што дапамагаюць хапугам-бацькам у той час, як Паўлік...

Цяпер у Іванавай вёсцы кароў з 20, можа, ёсць, а можа, і няма. А вось травы — ля дома, за домам, на поплаве, на лузе — непачаты край: хоць гаць гаці, хоць рэкі прудзі, хоць вазамі вазі... Няма каму.

...Дома, за сталом у Тацяны з Іванам, можна спяваць пра ўсё. Апроч «Травы...»

### ЗЛАЧЫНСТВА І ПАКАРАННЕ

Гэта праўда: разумны — запісвае, дурань — запамінае.

І, здавалася ж, вельмі старанна: ва ўсякім разе спачатку ў памяці былі і месца дзеяння, і абставіны, і дэталі, і безліч думак з нагоды...

Што засталося?

Крыміналісты даследавалі цела аднаго з самазабойцаў і нечакана высветлілі, што некалі менавіта ён згвалтаваў і задушыў сямігадовае дзіця.

...І потым вось з гэтым жыў: хадзіў па волі, па зямлі, бачыўся са сваімі роднымі, еў, спаў, недзе працаваў.

А ўрэшце...

Сам сабе вынес пакаранне. Сам выканаў прысуд. Ён.

### НЯМАЯ СЦЭНА

На постсавецкай прасторы з гэтай вялікай яўрэйскай сям'і не засталося амаль нікога, параз'язджаліся ўсе ў розныя часы і ў розныя краіны: у Ізраіль, Канаду, Амерыку. Адзін апынуўся ў Румыніі, але ж таксама не адарваўся ад сваёй радні, хутчэй наадварот — з усімі падтрымліваў сувязь, а ўрэшце — сабраў. Хоць на тыдзень. Разам.

У першы ж дзень у сінагогу павёў — яшчэ і з экскурсіяй.

— Ці ёсць у групе не яўрэі? — перад уваходам спытаў экскурсавод.

Усе павярнулі галовы ў бок адзінай беларускі.

— Ёсць... Я, — ледзь чутна прамовіла тая, забаяўшыся, што яе ў храм не пусціць.

Аказалася, якраз наадварот: гід яе галантна прапускаў наперад:

— Калі ласка, праходзьце. Для вас — бясплатна.

— ?!

### МЯНЯЮЦЦА ЧАСЫ...

Перад выхаднымі (тымі, тры дні — з пераносамі) да Сашы электрык заходзіў — разетку мяняць.

— Нешта вы пазнавата? — здзівіўся гаспадар, адчыняючы дзверы. — Ужо амаль шэсць вечара... Пад лозунгам працуеце: «Стагоддзю рэвалюцыі — ударная праца!»?

— Якому стагоддзю? — не зразумеў хлапец.

— Ды звычайнаму: з кастрычніка 1917-га.

— А што тады было?

...Калегі-журналісты, каб нагадаць гісторыю ды імёны яе стваральнікаў, у Лёзне адшукалі Уладзіміра Ульянава, у Мінску — Надзею Крупскую.

Тыя і расказалі, што ўвагі на іх прозвішчы ўжо амаль ніхто не звяртае.

Іншыя часы, трэба разумець, іншыя героі.

### З НІЗКІМ ПАКЛОНАМ...

...Нельга сказаць, што стол на рабоце завалены паперамі, але ж для чайніка месца няма — на падлозе стаіць, на адмысловай падстаўачцы. Прынёс яе...

Ні імені, ні прозвішча, ні твару таго чалавека ўжо не помню. А вось лёс...

Дзетдомавец, ён скончыў сямігодку, потым — так званую фабзайню (вучылішча будаўнікоў) і вячэрні інстытут, працаваў прарабам, разам з жонкай выхаваў і вывеў у людзі дваіх дзяцей.

Сын — шкада — там не затрымаўся: з-за гарэлкі страціў сям'ю, потым работу, а ўрэшце і само жыццё, прычым не толькі сваё, бо пахаваўшы яго — маладога, прыгожага, — маці кранулася розумам, і бацьку — літаральна — давялося «пасвіць» яе, глядзець, як малое дзіця, бо тая рвала адзенне, лезла ў вокны (пяты паверх), сунула рукі ў агонь, ела вазоны...

Іншымі словамі, жыў чалавек, калі жонка спала ці яе ж нейкую гадзіну-другую глядзела дачка. І тады ўжо ён «адрываўся», адводзіў душу — нешта майстраваў. Найбольш любіў вось гэтыя падстаўачкі...

Нагінаюся штораз, каб паставіць чайнік і тым самым нізка пакланіцца чалавеку, імя якога, на жаль, не помню.

### СПРОБА ВЕРША

*Жоўтае лісце бяроз —*
*На зямлі,*
*На маленькай ялінцы...*
*Каляды*
*не за гарамі.*

**Валянціна ДОЎНАР.** *dounar@zviazda.by*

# НА ДАЛЁКАЙ ЛІМПАПО

## ЧАМУ «ЗАКІПЕЛА» ЗІМБАБВЭ?

**Сёлетні лістапад у Зімбабвэ насамрэч увайшоў у гісторыю. За падзеямі, якія разгортваліся апошнім часам у афрыканскай краіне, без перабольшвання сачыў увесь свет. У ноч з 14 на 15 лістапада на вуліцах Харарэ з'явіліся танкі, пасля чаго стала вядома, што ваенныя змясцілі пад варту прэзідэнта Роберта Мугабэ, яго жонку Грэйс і міністра фінансаў Ігнаціуса Чомбэ, а таксама захапілі будынак дзяржаўнай тэлекампаніі ZBC. У яе эфіры генерал-маёр Сібусіса Моя, які ўзначальвае тылавое ўпраўленне Генштаба Узброенных Сіл краіны, заявіў, што прэзідэнту і яго жонцы нічога не пагражае, што «іх бяспека гарантаваная» і што арышт Мугабэ не варта расцэньваць як путч. Сапраўдная мэта — «злачынцы вакол Мугабэ». «Гэта не ваенны захоп улады. Тое, што робяць сілы абароны Зімбабвэ, заключаецца ў тым, каб супакоіць дэгенератыўную палітычную, сацыяльную і эканамічную сітуацыю ў нашай краіне, якая, калі яе не вырашыць, можа прывесці да гвалтоўнага канфлікту», — сказаў у афіцыйнай заяве генерал-маёр Сібусіса Моя. Пасля гэтага пусцілі рэкламу кукурузы. Праз дзесяць дзён — 24 лістапада — адбылася інаўгурацыя новага прэзідэнта. Колішні віцэ-прэзідэнт краіны Эмерсан Мнангагва пасля таго як Роберт Мугабэ пайшоў у адстаўку, заняў «вакантную» пасаду. Чаму завіравала Зімбабвэ?**



### РУЖЫ І АЛМАЗЫ

Гэтая краіна, назва якой паходзіць ад тапоніма старажытнага каменнага комплексу народа шона і перакладаецца як «край каменных дамоў», — без перабольшання, абраная Богам зямля (нават знаёмая ўсім з дзяцінства па казках Чукоўскага рэчка Лімпапо, а таксама велічны вадаспад Вікторыя — менавіта тут). Яе нетры захоўваюць вялікія запасы золата, плаціны, урану, таксама маецца некалькі найбуйнейшых у свеце радовішчаў алмазаў. Клімат райскі, на ўрадлівых землях расце практычна ўсё, у мінулым там вырошчвалі і знакаміты тытунь для самых вядомых марак брытанскіх цыгарэт, а цяпер — ружы і іншыя кветкі для ўсяго свету.

Зімбабвэ — радзіма Лобенгулы, аднаго з легендарных правадыроў руxаў супраціву брытанскім каланізатарам. Аднак ён не прадухіліў захоп краіны больш за сто гадоў таму брытанцамі, натхняльнікам якіх быў знакаміты стваральнік брытанскай каланіяльнай імперыі Сэсіл Родс, які даў назву адразу двум валадарствам Лондана: Паўночнай Радэзіі, цяпер Замбія, і Паўднёвай Радэзіі, Зімбабвэ. Брытанцы адабралі ў мясцовага чорнага насельніцтва ўрадлівыя землі, выкапні багацця. У 1965—1980 гадах ішла вызваленчая вайна, адным з лідараў якой быў Роберт Мугабэ. З 1980 года ён нязменна кіруе незалежнай Зімбабвэ — спачатку як прэм'ер-міністр, потым як прэзідэнт. 93-гадовы Мугабэ да апошняга часу быў самым вялікаўзроставым кіраўніком у свеце, чый час знаходжання ва ўладзе таксама ўражвае. За гады яго праўлення, заўважае ТАСС, Зімбабвэ многага дасягнула ў галіне адукацыі, медыцыны, спорту, у яе адна з самых баяздольных у Афрыцы армій.

### 100 ТРЛ ДОЛАРАЎ АДНОЙ КУПЮРАЙ

Але эканамічная палітыка часта вялася нябачліва. У 2002 годзе Мугабэ запатрабаваў ад некалькіх тысяч белых фермераў пакінуць краіну пад пагрозай турэмнага тэрміну. Міжнародны валютны фонд у адказ на гэтыя дзеянні прыпыніў фінансавую падтрымку Зімбабвэ, Еўрапейскі саюз увёў санкцыі супраць урада Мугабэ. Наступствамі «чорнага перадзелу» стала рэзкае падзенне вытворчасці ў прамысловасці, асабліва звязанай з перапрацоўкай сельгаспрадукцыі і мінеральнай сыравіны. Знізіліся замежныя інвестыцыі, крэдыты і донарская дапамога. У ЕС пачалі казаць аб адстаўцы Мугабэ і дэмакратызацыі палітычнага працэсу ў Зімбабвэ.

Разам з «чорным перадзелам» урад Мугабэ ўвёў закон, паводле якога замежныя кампаніі ў краіне павінны кантралявацца чарнаскурымі грамадзянамі, што ўдарыла па прытоку інвестыцый і эканоміцы Зімбабвэ. У 2007 годзе, па звестках даклада Міжнароднай крызіснай групы, 10 мільёнаў з 12-мільённага насельніцтва краіны існавалі за мяжой беднасці, тры мільёны чалавек беглі ў суседнія краіны. Недахоп паліва, прадуктаў харчавання і замежнай валюты прывёў да таго, што ўзровень беспрацоўя дасягнуў 80%. Правалам скончылася спроба Мугабэ перамагчы гіперінфляцыю шляхам замарожвання цэн. Адзін амерыканскі долар стаў каштаваць 25 мільёнаў зімбабвійскіх. У пачатку 2008 года інфляцыя ў Зімбабвэ дасягнула ста тысяч працэнтаў, а да сярэдзіны года — 4 мільёны працэнтаў. ВУП скараціўся, а замежная пазыка ўзрасла. У студзені 2009 года інфляцыя перавысіла 300 мільёнаў працэнтаў, у абарачэнне ўвялі купюру вартасцю 100 трыльёнаў зімбабвійскіх долараў, а неўзабаве нацыянальную валюту фактычна вывелі з абароту, кіраўніцтва краіны дазволіла выкарыстоўваць любыя замежныя валюты. Даларызацыя эканомікі спыніла гіперінфляцыю, у 2010 і 2011 гадах быў зафіксаваны рост ВУП на 9%, у 2012 — на 5,5%.




### ЭПОХА З ДЗВЮХ ЧАСТАК

Як лічыць дырэктар па навуковай рабоце расійскага фонду клуба «Валдай» Фёдар Лук'янаў, 37-гадовая эпоха кіравання Мугабэ падзяляецца на дзве часткі: «У свой ранні перыяд палітычнай дзейнасці ён быў сапраўдным кумірам — і на Захадзе, і ў Савецкім Саюзе, героем справядлівай барацьбы за вызваленне чарнаскурай большасці ад улады белай меншасці. Калі яго барацьба мела поспех, калі Зімбабвэ ператварылася ў дэмакратычную дзяржаву ў 1980 годзе, яго папулярнасць у свеце яшчэ больш узрасла». «Гэта быў яркі элегантны прыгажун, арыстакрат, з добрай адукацыяй. У той час, у 1980—1990-я, Мугабэ вёў досыць разумную палітыку, не зводзіў рахункі з апанентамі. Але далей пачаліся ўсялякія «загагуліны», якія ў рэшце рэшт адціснулі ў бясконца далёкае мінулае таго прыгажуна, які вёў справядлівую вайну супраць рэжыму апартэіду», — падсумаваў Лук'янаў у інтэрв'ю газеце «Взгляд».

З ім згодны навуковы супрацоўнік Інстытута Афрыкі РАН Альберт Хаматшын. «Калі ўзяць першае дзесяцігоддзе пасля прыходу да ўлады і калі вывесці за дужкі разню ў правінцыі Матабелелэнд, то, у прынцыпе, сацыяльна-эканамічная палітыка Мугабэ была паспяховай. Не думайце, што вось, маўляў, чорныя захапілі ўладу, і краіна адразу прыйшла ў заняпад. Спачатку Зімбабвэ атрымала вялікі імпульс да развіцця. Харарэ да пачатку 1990-х называлі ледзь не «афрыканскім Сінгапурам». Узровень адукацыі на фоне астатняй Афрыкі там да гэтага часу застаецца высокі, — пералічыў эксперт. — Але да канца 1990-х краіна стала зведваць эканамічныя цяжкасці, і тады Мугабэ пайшоў на шэраг папулісцкіх крокаў, каб утрымацца ва ўладзе. У прыватнасці, калі пачаўся масавы самазахоп чорнымі зямель белых фермераў, ён у выніку вырашыў падтрымаць і ўзначаліць гэты захоп. Краіна мела патрэбу ў аграрнай рэформе, у Мугабэ былі розныя яе праекты, аднак у выніку рэформа прайшла не так, як планавалася. І сельская гаспадарка прыйшла ў заняпад, у чорных проста не было грошай на развіццё захопленых ферм».

### G40 СУПРАЦЬ «ЛАКОСТАЎ»

У жніўні 1996 года Мугабэ ажаніўся са сваёй сакратаркай Грэйс, якая на сорак гадоў маладзейшая за яго. Яна стала другой жонкай прэзідэнта, першая памерла ў 1992-м. З часам Грэйс Мугабэ ўдалося стаць уплывовай фігурай у палітычным жыцці Зімбабвэ. За ўладу і ўплыў у зімбабвійскім кіраўніцтве змагаліся дзве групоўкі. Першая — так званая G40 (скарачэнне ад «пакаленне саракагадовых»), якую ўзначальвала Грэйс Мугабэ. Яе падтрымлівалі ў асноўным маладыя міністры. Другая — «каманда Лакост» на чале з Эмерсанам Мнангагвам па мянушцы «Кракадзіл», чалавекам складанага лёсу. Па адной з версій, у юнацтве ён уваходзіў у вулічную банду «Кракадзілы», дзе і атрымаў сваю мянушку. На баку Мнангагвы — былыя ветэраны вызваленчай барацьбы, дастаткова сур'ёзная сіла ў цяперашнім Зімбабвэ. Войска — адзін з самых магутных гульцоў у краіне. Нягледзячы на нарастаючы палітычны ўплыў, Грэйс Мугабэ была вельмі непапулярная ў народзе. У папрок ёй, у прыватнасці, ставіліся замежныя паездкі для пакупак дарагіх рэчаў (яна нават заслужыла мянушку «Грэйс Гучы»), у той час як эканоміка краіны пераносіць вялікія цяжкасці. Замяшаная яна і ў скандалах. Гэта выклікала незадаволенасць ветэранаў, якія лічаць, што Мугабэ мае права змяніць толькі той, хто заявіў пра сябе ў вайне з каланізатарамі. Нядзіўна, што кропкай адліку ваеннага канфлікту лічыцца 6 лістапада, калі быў зняты з пасады першы віцэ-прэзідэнт 75-гадовы Эмерсан Мнангагва, які пасля збег з краіны з-за боязі за сваё жыццё.

Сітуацыя ў Зімбабвэ абвастрылася на мінулым тыдні, калі з'явілася інфармацыя, што ваенныя ўзялі пад кантроль тэлецэнтр у сталіцы Зімбабвэ Харарэ і рэзідэнцыю Мугабэ. У нядзелю прэзідэнта, які знаходзіўся пад хатнім арыштам, пазбавілі кіруючых пастоў у партыі «Зімбабвійскі афрыканскі нацыянальны саюз — Патрыятычны фронт» (ZANU-PF). Пасля чаго ЦК партыі заклікаў Мугабэ скласці з сябе паўнамоцтвы кіраўніка дзяржавы да паўдня панядзелка, альбо супраць яго будзе ініцыяваная працэдура імпічменту. Аднак 93-гадовы Мугабэ змог здзівіць зімбабвійцаў: падчас тэлезвароту да нацыі ў мінулую нядзелю ён, насуперак усім прагнозам і чаканням, ні слова не сказаў пра адстаўку. У аўторак парламент Зімбабвэ прыняў рашэнне аб імпічменце Мугабэ, даўшы яму суткі, каб скласці паўнамоцтвы. Пасля чаго спікер парламента Зімбабвэ Джэйкаб Мудэнда зачытаў ліст Мугабэ з заявай аб сыходзе з пасады. «Я добраахвотна прымаю рашэнне сысці ў адстаўку, яно грунтуецца на маёй заклапочанасці дабрабытам народа Зімбабвэ і на маім жаданні плаўнага, негвалтоўнага пераходу ўлады», — прыводзіць The Independent цытату з ліста. Дэпутаты парламента віталі гэтую навіну задаволенымі воклічамі, а таксама гучнымі папрокамі ў адрас Мугабэ, якія заключаюцца ў тым, што ён «дазволіў сваёй жонцы ўзурпаваць канстытуцыйную ўладу» і знаходзіцца «ў старэчым узросце». У сацыяльных сетках з'явіліся відэа, на якіх відаць, як святкуюць жыхары Зімбабвэ, аўтамабілісты на вуліцах Харарэ вітаюць падзею працяглымі гукавымі сігналамі.

Як адзначае Альберт Хаматшын, Мугабэ спрабаваў сысці прыгожа, але яму гэта не ўдалося. «Ён відавочна хацеў дацягнуць прынамсі да з'езду партыі ў снежні, каб абвясціць, што сыходзіць сам — па ўласным жаданні ці па стане здароўя. Мугабэ не хацеў увайсці ў гісторыю як кіраўнік, якога зрынулі. Але калі б яго прыбралі ў выніку імпічменту, гэта стала б яшчэ вялікай ганьбай. Калі імпічмент быў запушчаны, толькі тады ён і сышоў», — растлумачыў Хаматшын. «Ёсць, праўда, і іншае меркаванне: на самай справе Мугабэ адразу ўсё зразумеў, але проста карыстаўся сваім становішчам, каб выгандляваць выгадныя ўмовы адстаўкі. Ваенныя разумеюць, што краіне не патрэбен путч з пункту гледжання міжнароднай прывабнасці. Афрыканскі саюз ці Супольнасць развіцця Паўднёвай Афрыкі прынцыпова не працуюць з урадамі, якія прыйшлі да ўлады шляхам перавароту. Вось чаму генералы спрабавалі ўсё зрабіць па магчымасці мірна, у рамках закона. Карыстаючыся гэтым, Мугабэ, як мяркуецца, узгадніў з імі і захаванне сваёй маёмасці, і імунітэт ад пераследу», — сказаў афрыканіст газеце «Взгляд».

### МУГАБЭ 2.0?

«Мы сталі сведкамі нараджэння новай дэмакратыі, якая развіваецца ў нашай краіне. Мы хочам, каб наша эканоміка расла, мы хочам міру, мы хочам стварэння новых працоўных месцаў», — сказаў Эмерсан Мнангагва ў штаб-кватэры кіруючай партыі ZANU-PF. Ён невыпадкова зрабіў акцэнт на эканоміцы і занятасці: узровень беспрацоўя ў Зімбабвэ дасягнуў 94%, фармальна ў краіне занятыя менш чым паўмільёна людзей пры колькасці насельніцтва ў больш за 11 мільёнаў. Прадстаўнік ZANU-PF заявіў, што Мнангагва прабудзе на пасадзе прэзідэнта да чарговых выбараў, якія павінны адбыцца ў верасні 2018 года.

«Улада застаецца ў тых жа людзей, якія атачалі Мугабэ ў апошнія дзесяцігоддзі. Казаць пра іншы шлях развіцця не даводзіцца. З іншага боку, ліквідацыя гэтай фігуры — сімвалічны знак таго, што краіна гатовая да перамен, адкрываецца Захаду. Рэзкага павароту не будзе, Харарэ захавае добрыя адносіны і з Кітаем, і з Расіяй, — пабяцаў Альберт Хаматшын. — Але цяпер з'яўляецца верагоднасць вяртання старых партнёраў, накшталт ЗША і Вялікабрытаніі». І сапраўды, вечарам у аўторак прэм'ер-міністр Вялікабрытаніі Тэрэза Мэй выступіла з абяцаннем дапамагаць сваёй былой калоніі пры новым урадзе.

Найбольш асцярожныя аналітыкі прадказваюць фарміраванне ў краіне шырокай кааліцыі палітычных сіл, новага варыянта ўрада нацыянальнага адзінства пад эгідай арміі, уплыў якой зараз толькі павялічыцца. Іншыя назіральнікі мяркуюць, што ў асобе Мнангагвы грамадзяне Зімбабвэ атрымаюць «Мугабэ 2.0», пры якім палітычная і эканамічная абстаноўка істотных змен не зведае. «Не было ніякай рэвалюцыі дзеля таго, каб прыўнесці ва ўладу дэмакратычныя прынцыпы. Была проста сутычка за ўладу. Разам з тым ад новага лідара чакаюць не проста касметычных змен, — мяркуе карэспандэнт BBC Фергал Кін. — Карупцыя і тыранія, уласцівыя мінулым часам, не дадуць прыцягнуць фінансавую дапамогу і інвестыцыі, якія неабходныя для выратавання падарванай эканомікі краіны. Мнангагва сутыкнецца з сур'ёзным супраціўленнем, калі ён паспрабуе зноў укінуць Зімбабвэ ў дэспатызм. Але самае важнае ў гэтым — стаўленне людзей».

**Захар БУРАК.** *burak@zviazda.by*

## Извещение об открытом аукционе по продаже земельных участков в собственность в г. Гродно (микрорайоны «Зарица-5», «Барановичи-5,6», ул. Кульбакская, ул. Мичурина, ул. Тетки, ул. П. Милонега) 26 декабря 2017 года

| № лота | Наименование объекта | Местонахождение объекта | Площадь земельного участка (га) | Кадастровый номер | Ориентировочная стоимость затрат на изготовление документации, руб. | Начальная цена продажи, руб. | Сумма задатка, руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Земельный участок У-310 * | микрорайон «Зарица-5» | 0,0897 | 440100000003004853 | – | 12 723,59 | 2 500 |
| 2 | Земельный участок У-165* | микрорайон «Барановичи-5,6» | 0,0994 | 440100000003005316 | – | 11 752,69 | 2 200 |
| 3 | Земельный участок У-4* | ул. Кульбакская в районе жилого дома №35 | 0,1072 | 440100000001010123 | 3 500,0 | 23 139,89 | 4 700 |
| 4 | Земельный участок* | ул. Мичурина, 41а | 0,1296 | 440100000002008775 | 3 411,41 | 49 563,68 | 9 800 |
| 5 | Земельный участок* | ул. П. Милонега, 1а | 0,0771 | 440100000002009270 | 3 105,78 | 40 425,13 | 8 100 |
| 6 | Земельный участок У-3*,** | в районе дома №29 по ул. Тетки | 0,1028 | 440100000002009035 | 2 924,56 | 52 070,60 | 10 000 |

*Инженерные коммуникации на участке отсутствуют.

** Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании земельного участка в охранных зонах сетей и сооружений водоснабжения. На участке находятся хозяйственные постройки, которые подлежат сносу.

Земельные участки предоставляются в частную собственность для строительства одноквартирного жилого дома.

Организатор аукциона: коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости».

Условия, предусмотренные в решении о формировании земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона:

внесение платы за земельные участки; возмещение затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения; обращение за государственной регистрацией прав на земельный участок в РУП «Гродненское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» в двухмесячный срок после утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся; получение победителями аукциона в установленном порядке технической документации и разрешения на строительство жилого дома; занятие земельных участков (осуществление строительно-монтажных работ) осуществить не позднее одного года со дня утверждения в установленном порядке проектной документации на строительство одноквартирного жилого дома, возместить затраты в соответствии с решением Гродненского горисполкома от 08.02.2016 №49 «О некоторых вопросах возмещения затрат на строительство, в том числе проектирование, объектов распределительной инженерной и транспортной инфраструктуры».

**Аукцион состоится 26 декабря 2017 года в 12.00 по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1 ( актовый зал).**

Для участия в аукционе необходимо: внести задаток в размере, указанном в графе 8, перечисляемый на расчетный счет BY24 AKBB 3012 0000 4181 0400 0000 в филиале №400 ГОУ ОАО АСБ «Беларусбанк», г. Гродно, БИК AKBBBY21400, УНП 590727594 получатель – КУП по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости», задаток вносится в белорусских рублях в сумме согласно настоящему извещению.

Представить в КУП по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости» следующие документы:

заявление на участие в аукционе установленной формы;

документ, подтверждающий внесение суммы задатка;

подписанное соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах) установленной формы, включающее обязательство по уплате в соответствии с законодательством штрафных санкций и иные требования;

дополнительно представляются:

гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования; представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность.

При подаче документов на участие в аукционе граждане Республики Беларусь предъявляют паспорт гражданина Республики Беларусь, а представители граждан – документ, удостоверяющий личность.

**Прием документов, консультации по вопросам участия в аукционе и ознакомление с имеющейся документацией осуществляются по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, кабинет 403 с 27 ноября по 20 декабря 2017 года включительно в рабочие дни с 08.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00.**

Торги в отношении каждого земельного участка проводятся при условии наличия двух или более участников. Победителем торгов по каждому предмету аукциона признается участник, предложивший наиболее высокую цену.

Победитель торгов либо единственный участник несостоявшегося аукциона, выразивший согласие на приобретение земельного участка как единственный, подавший заявление на участие в аукционе, в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся обязан:

внести плату за земельный участок; возместить организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения. Информация о данных затратах, порядке их возмещения доводится до сведения участников аукциона до его начала при заключительной регистрации под роспись; выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его в частную собственность победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона.

После совершения названных действий, но не позднее 2 рабочих дней, Гродненский горисполком выдает победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона выписку из решения об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома, а также один экземпляр протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся.

Оплата стоимости предметов аукциона осуществляется по безналичному расчету за белорусские рубли.

При невыполнении требований об обращении за государственной регистрацией прав на земельный участок в двухмесячный срок после утверждения протокола о результатах аукциона либо признании аукциона продажи несостоявшимся решение Гродненского горисполкома о предоставлении земельного участка утрачивает силу.

Осмотр земельного участка на местности производится желающими самостоятельно в удобное для них время.

**Контактные телефоны: + 375 (152) 72 05 46, 72 05 37, официальный сайт организатора торгов www.grodno.gov.by**

## Извещение о повторном открытом аукционе по продаже права заключения договора аренды земельного участка для строительства объектов в городе Гродно 26 декабря 2017 года

| № лота | Наименование объекта | Местонахождение объекта | Площадь земельного участка (га) | Кадастровый номер | Начальная цена, руб. | Сумма задатка, руб. | Ориентировочная сумма расходов по подготовке земельно-кадастровой документации, руб. | Условие продажи и целевое назначение земельного участка |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1* | Право аренды земельного участка сроком на 25 лет | район домов по ул. Академической, 14 и ул. 1 Мая, 18 | 0,1570 | 440100000002008984 | 70 075,84 | 7 000,0 | 3 036,65 | Строительство многоквартирного жилого дома 2-3-этажного с мансардным этажом на 12–15 квартир |
| 2* | Право аренды земельного участка сроком на 50 лет | ул. Бондовского в районе гаражного потребительского кооператива «Фабричный-3» | 0,1024 | 44010000001010183 | 7 733,97 | 774,0 | 3 991,86 | Строительство станции технического обслуживания автомобилей до 10 постов без малярных, сварочных, жестяных работ |
| 3* | Право аренды земельного участка сроком на 50 лет | территория Коложского парка | 0,2034 | 440100000002009268 | 173 281,62 | 17 330,0 | 4 350,0 | Строительство объекта культурно-просветительского и зрелищного назначения (аттракцион «Колесо обозрения») |

*земельный участок имеет ограничения.

Победитель аукциона обязан:

в установленном порядке получить разрешение на проведение проектно-изыскательских работ и разработать строительный проект на строительство объекта в срок, не превышающий 2 года;

приступить к занятию земельного участка в соответствии с целями и условиями его предоставления не позднее 6 месяцев со дня утверждения проектной документации юридическому лицу, индивидуальному предпринимателю, 1 года – гражданину;

осуществить строительство объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией.

В случае нарушения сроков проектирования и строительства в договоре аренды будут предусмотрены штрафные санкции.

Организатор аукциона: коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости».

При оформлении заявления лицо, желающее принять участие в аукционе, представляет:

1. Копии платежных поручений о внесении **задатка** за подачу заявления на расчетный счет BY24 AKBB 3012 0000 4181 0400 0000 в филиале №400 ГОУ ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Гродно, БИК AKBBBY21400, УНП 590727594, получатель – коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости», с отметкой банка-отправителя об их исполнении. **Юридическое лицо:** доверенность, выданную представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), одну копию учредительных документов. **Физическое лицо**: паспорт, а в случае участия в аукционе представителя физического лица – паспорт и нотариально заверенную доверенность.

2. Платеж за право заключения договора аренды земельных участков осуществляется в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона.

3. Победитель аукциона обязан в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона возместить организатору аукциона затраты, связанные с организацией и проведением аукциона, возместить отделу коммунального имущества и приватизации Гродненского горисполкома расходы по подготовке документации для проведения аукциона;

4. Всем желающим предоставляется возможность ознакомиться с объектом.

**Аукцион состоится 26 декабря 2017 года в 12.00 в здании горисполкома по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1**.

Заявления на участие в аукционах принимаются по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, кабинет №403, в рабочие дни **с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 с 27 ноября по 20 декабря 2017 года**. Телефоны для справок в Гродно: **(0152) 72-05-37, 72-05-46**. Адрес сайта: **www.grodno.gov.by**

## ИЗВЕЩЕНИЕ
## о проведении открытого аукциона по продаже земельных участков в частную собственность граждан в Ушачском районе Витебской области. Организатор: Веркудский сельский исполнительный комитет

| Лот | Местоположение земельного участка, площадь, кадастровый номер | Условия и ограничения, инженерно-геологические условия* | Сумма подлежащих возмещению затрат на формирование и регистрацию участка, руб. | Начальная цена лота, рублей |
|---|---|---|---|---|
| 1 | д. Косовщина (уч. 1) Ушачского р-на, Витебской общ. площ. 0,2490 га кадастровый номер №224980904601000021 | -земли в водоохранных зонах водных объектов оз. Отолово | Расходы – 1602,99 плюс затраты на организацию и проведение аукциона | 1500,00<br>Задаток 10% 150,00 |
| 2 | д. Косовщина (уч. 2) Ушачского р-на, Витебской общ. площ. 0,1720 га кадастровый номер №224980904601000022 | -земли в водоохранных зонах водных объектов оз. Отолово | Расходы – 1707,56 плюс затраты на организацию и проведение аукциона | 1800,00<br>Задаток 10% 180,00 |

* инженерно-геологические условия будут определены на стадии производства проектно-изыскательских работ, здания на участках отсутствуют. Условия развития инфраструктуры: возможность подключения к инженерным сетям.

Целевое назначение участка – для строительства и обслуживания жилого дома, назначение в соответствии с единой классификацией назначения объектов недвижимого имущества 1 09 02 – земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома).

**1. АУКЦИОН СОСТОИТСЯ 26 декабря 2017 года в 10.00 в здании Веркудского сельского исполнительного комитета по адресу: 211493 аг. Веркуды, ул. Школьная д. 13, Ушачского р-на. Витебской обл. 2-й этаж.** Заявления и пакет документов на участие принимаются по рабочим дням **с 8.00 до 17.00.** Последний день приема заявлений и документов – **20 декабря 2017 г. до 17.00.**

2. Аукцион проводится в соответствии с Положением, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 г. №462.

3. Сумма задатка перечисляется на р/с BY03 AKBB 3641 3280 2002 7230 0000 ф-л №216 ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Полоцк

БИК AKBBBY21216 УНН 300007073 код платежа 04901, получатель – Веркудский сельисполком.

Контактные номера тел.: 802158 55424, 802158 55427, Факс 802158 55423.

## Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

| Наименование | Характеристика |
|---|---|
| **ЛОТ 1** | |
| Наименование объекта, краткая характеристика, адрес расположения | комбайн свеклоуборочный Holmer Terra Dos T-2, зав. № 192805, двигатель MAN D 2876 LE 103, объемом 12817 см. куб., мощность 338 кВт/460 л. с., 2005 г. в. |
| Начальная цена продажи | 78 804 руб. (семьдесят восемь тысяч восемьсот четыре рубля) с учетом НДС |
| Сумма задатка | 7 880 руб. (семь тысяч восемьсот восемьдесят рублей) |
| Условия аукциона | Без условий |
| Продавец | ЗАО «Гудевичи», 231626, Мостовский р-н, д. Гудевичи, ул. Мира, 4, тел. 8-01515-38716 |
| Организатор торгов | Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 45-05-38, 41-98-32 |
| Условия оплаты | По договоренности сторон |
| Срок заключения договора купли-продажи | Не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов |
| Номер р/с для перечисления задатка | BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225 |

**Аукцион состоится 7 декабря 2017 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209**

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами: заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении; *юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь* – копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица;
